WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

3 жніўня 2011 г.
СЕРАДА
№ 145 (27009)
Кошт 750 рублёў

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ЗАЦВЕРДЗІЎ ДЗЯРЖПРАГРАМУ ЎСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ СЯЛА НА 2011—2015 ГАДЫ

Мэта праграмы — забеспячэнне ўстойлівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця сяла і паляпшэнне яго дэмаграфічнай сітуацыі на аснове павышэння эканамічнай эфектыўнасці аграпрамысловага комплексу, развіцця прадпрымальніцкай ініцыятывы, забеспячэння збалансаванасці ўнутранага харчовага рынку, нарошчвання экспартнага патэнцыялу, павышэння даходаў сельскага насельніцтва, узроўню сацыяльна-бытавога і інжынернага абуладкавання сельскіх населеных пунктаў, захавання і аздараўлення экалогіі ў іх, прыцягнення і рацыянальнага выкарыстання інвестыцый.

Гэта праграма ўключае 19 мэтавых праграм, якія накіраваны на рэалізацыю канкрэтных мерапрыемстваў у розных галінах АПК (меліярацыя земляў, тэхнічнае забеспячэнне, малочная галіна, птушкагадоўля, свінагадоўля, бульбаводства, агародніцтва і пладаводства, вытворчасць і перапрацоўка лёну, племянная справа, селекцыя і насенняводства і іншыя).

У адпаведнасці з праграмай у 2011—2015 гадах плануецца рост вытворчасці прадукцыі ў гаспадарках усіх катэгорый 139—145%, рэнтабельнасць продажу ў 2015 годзе ў сельскай гаспадарцы чакаецца на ўзроўні 10—11%, а тэмп росту прадукцыйнасці працы складзе 167%.

СТАР. 2

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАДПІСАЎ УКАЗ АБ МЕРАХ САЦПАДТРЫМКІ ПАЦЯРПЕЛЫХ ПРЫ ТЭРАКЦЕ 11 КРАСАВІКА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 1 жніўня падпісаў указ № 335 «Аб мерах сацыяльнай падтрымкі асоб, якія пацярпелі ў выніку акта тэрарызму, што адбыўся 11 красавіка 2011 года».

Указам прадугледжана, што права на аднаразовае пазачарговае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне або аздараўленне на працягу 2011-2012 гадоў і бясплатны праезд да месца санаторна-курортнага лячэння або аздараўлення і назад маюць асобы, якія атрымалі ў выніку акта тэрарызму цяжкія і менш цяжкія цялесныя пашкоджанні.

Матэрыяльная дапамога, аказаная Мінскім гарвыканкамам з бюджэту горада Мінска, а таксама расходы Рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва на забеспячэнне пуцёўкамі асоб, якія атрымалі цяжкія і менш цяжкія цялесныя пашкоджанні, кампенсуюцца за кошт рэзервовага фонду Прэзідэнта.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

СВЯТА АГНЮ І ГЛІНЫ, або Ці стане Івянец сталіцай ганчароў?

КАБ ЗРАБІЦЬ з гліны нават самы просценькі гарлачык, трэба, найперш, палюбіць — гліну, агонь і ганчарны круг. Як любілі яе далёкія продкі-ганчары, якія не пакідалі аўтографаў на сваіх вырабах. І майстры-рамеснікі пачатку XX стагоддзя, якіх на Беларусі было проста безліч. Як любіць яе жыхар Івянца — выдатны спецыяліст ганчарнай справы з 35-гадовым стажам Анатоль Высоцкі (на фотаздымку), які быў удзельнікам сёлетняга ганчарнага фэсту «Глініяны звон». Шостае рэгіянальнае свята майстроў агню і гліны трэці раз прайшло ў Івянцы і дае поўнае права гэтаму месцу называецца сталіцай ганчарства Міншчыны. Цяпер усе ганчарныя фэсты будуць праводзіцца ў гэтым куточку Валожыншчыны, дзе ніколі не перарываліся ганчарныя традыцыі. І каб яны ніколі не губляліся, не забываліся.

СТАР. 3

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ІНДЫЯ СТАЛА СТАРШЫНЁЙ САВЕТА БЯСПЕКІ ААН

Пастаянны прадстаўнік Індыі пры ААН Хардзіп Сінгх Пуры заявіў, што ў жніўні асноўная ўвага будзе нададзена пытанням міратворчасці і завяршэнню канфлікту ў Лівіі. Пасол выказаў надзею на спыненне ўзброеных сутыкненняў у гэтай краіне. Ён нагадаў, што жнівень сёлета прыпаў на час Рамадана, месяца посту і малітваў для мусульман.

ЧЭШСКІМ СМІ ДАЗВОЛІЛІ ПУБЛІКАВАЦЬ ПРАСЛУХАНЫЯ ТЭЛЕФОННЫЯ РАЗМОВЫ ПАЛІТЫКАЎ

Сродкі масавай інфармацыі Чэхіі атрымалі права па законе публікаваць інфармацыю, атрыманую ў выніку праслухоўванняў тэлефонаў палітыкаў, паведамляе Чэшскае радыё.

З 1 жніўня ўступіла ў дзеянне папраўка да закона «Пра ахову персанальных звестак», паводле якой чэшскія СМІ атрымалі магчымасць апублікаваць матэрыялы, атрыманыя ў выніку праслухоўванняў, у тым ліку, праслухоўванняў тэлефонных перамоў.

Як адзначаецца ў папраўцы, апублікаванне такіх звестак лічыцца апраўданым у выпадку так званай «грамадскай цікавасці» і датычыцца, напрыклад, злачыннай дзейнасці чэшскіх палітыкаў і іншых дзяржаўных функцыянераў.

ТЭРАКТ У ДЗІЦЯЧЫМ САДКУ Ў КАМСАМОЛЬСКУ-НА-АМУРЫ

Выбух саматужнай выбуховай прылады прагрымеў учора на верандзе аднаго з дзіцячых садкоў у горадзе Камсамольск-на-Амуры (Хабараўскі край, Расія) у 7.30 па мясцовым часе, перадаюць інфармагенцтвы.

Скрынка з прыладай была абвязана ізастужкай сіняга колеру і падарункавай стужкай. У выніку выбуху з тэрмічным апёкам вачэй у гарадскую бальніцу шпіталізаваная пяцігадовая дзяўчынка, якая падняла скрынку з падлогі. Магутнасць прылады, паводле папярэдніх звестак, склала 5-7 грам у трацілавым эквіваленце.

КАНАДСКІЯ ПСІХОЛАГІ: ВЫБАР ІНТЭРНЭТ-БРАЎЗЕРА ЗАЛЕЖЫЦЬ АД УЗРОЎНЮ ІНТЭЛЕКТУ

Канадская кампанія Aptiquant, якая спецыялізуецца на псіхалагічных кансультацыях у сферы бізнэсу, змясціла на сваім сайце тэст на разумовы каэфіцыент IQ і затым размеркавала атрыманыя вынікі па браўзерах, якім карысталіся людзі пры адказах на пытанні. Усяго свой узровень інтэлекту з дапамогай канадскіх псіхолагаў праверыла больш за 100 тыс. чалавек.

Гэтае даследаванне, як лічаць у кампаніі, паказала ўзаемасувязь паміж пазнавальнымі здольнасцямі людзей і іх выбарам вэб-браўзера. Паводле яго вынікаў, людзі, якія апынуліся ў ніжняй частцы шкалы, як правіла, супраціўляюцца змене ці мадэрнізацыі свайго браўзера.

Максімальны IQ прадэманстравалі карыстальнікі браўзера Opera, у якіх гэты паказчык набліжаўся да 130, паведамляе Businessinsider. Злёгку адсталі ад іх карыстальнікі Camino.

Следам з IQ каля 110 ідуць карыстальнікі Safari, Chrome і Firefox, а сярэдні каэфіцыент інтэлекту прыхільнікаў Internet Explorer, як высветлілася, не дацягвае да 100, прычым у карыстальнікаў IE 7 і IE 6 ён ніжэйшы за 90.

Пяць гадоў таму узровень IQ сярод карыстальнікаў розных браўзераў быў прыкладна аднолькавым, адзначаюць даследчыкі.

ISSN 1990 - 763X

Ва ўрадзе

ГОД ІСЦІНЫ

УЧОРА на пашыраным пасяджэнні Савета Міністраў Беларусі абмяркоўвалі вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў першым паўгоддзі 2011 года. Урад закрануў пытанні знешняга гандлю, эфектыўнасці вытворчасці, даходаў насельніцтва, замежных інвестыцый і іншага.

Аб дадатным сальда

Прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч заявіў, што ў першыя шэсць месяцаў года ў краіне стабільна працавалі прамысловасць, будаўнічая галіна і сельская гаспадарка. Гэта забяспечыла высокія тэмпы росту эканомікі. Пры гэтым у маі і чэрвені ўпершыню за апошнія гады рост экспарту тавараў перавысіў рост імпарту. «Як вынік, у гэты перыяд паступленне валюты ў краіну над выплатамі перавышала 400 млн долараў у месяц», — сказаў кіраўнік урада. Намеснік прэм'ер-міністра Сяргей Румас заявіў, што і па выніках ліпеня ўрад прагназуе дадатнае знешнегандлёвае сальда.

Кіраўнікі не павінны быць інэртнымі

Аднак, па словах прэм'ер-міністра, пакуль што не ўсе гаспадарчыя суб'екты і іх кіраўнікі працуюць ініцыятыўна, адказна, не паўсюль высокая эфектыўнасць вытворчасці. Міхаіл Мясніковіч лічыць, што цяжкасці ў функцыянаванні народнай гаспадаркі выкліканы залішнім захапленнем экстэнсіўнымі фактарамі росту. «Тыя кіраўнікі міністэрстваў і прадпрыемстваў, якія, як і ў папярэднія гады, робяць стаўку на пашырэнне ўнутранага попыту, эмісійныя крэдыты і бюджэтныя пазыкі, ільготы і дзяржаўны пратэкцыянізм, глыбока і небяспечна памыляюцца, — сказаў кіраўнік урада. — Гэтых умоў больш не будзе. Занадта вялікая плата за іх празмернае выкарыстанне».

Міхаіл Мясніковіч назваў 2011 год момантам ісціны для кожнага кіраўніка. Прэм'ер растлумачыў: «Міністры, кіраўнікі прадпрыемстваў і спецыялісты павінны разумець, што такія выгадныя, як сёння, умовы экспарту будуць не заўсёды, таму інертнасць некаторых кіруючых работнікаў ва ўрадзе і рэгіёнах у вырашэнні пытанняў рэструктурызацыі, прыцягнення прамых замежных інвестыцый, інавацыйнага развіцця і росту рэсурсаэфектыўнасці недапушчальная».

Жыллё і ўраджай

Па словах Міхаіла Мясніковіча, вырашаны ўсе пытанні матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння ўборкі ўраджаю. «Галоўнае цяпер, — кажа ён, — сабраць і захаваць гэты ўраджай. Гэта гарантыя харчовай бяспекі краіны і эфектыўнасці сельгасвытворчасці».

Пытанні жыллёвай праграмы кіраўнік урада таксама закрануў: «Будаваць будзем, але будаваць эканомна і толькі эфектыўныя праекты. Матэрыяльныя рэсурсы павінны быць сканцэнтраваны на аб'ектах з высокай ступенню гатоўнасці і эканамічнай эфектыўнасцю». Астатнія аб'екты прэм'ер прапанаваў перадаць нацыянальным і замежным інвестарам.

Зарплата павінна быць зароблена

Міністр эканомікі Мікалай Снапкоў выказаўся наконт інфляцыі. «Для забеспячэння ўнутранай збалансаванасці неабходна прыняць усе меры па замаруджванні інфляцыйных працэсаў. Для гэтага трэба выразна разумець, што ўплывае на рост цэн. Цэны растуць, калі ў эканоміцы грошай больш, чым яна зарабіла», — сказаў міністр. Тычыцца гэта і суб'ектаў гаспадарання, і насельніцтва. «Таму з боку рэальнага сектара эканомікі найважнейшым індыкатарам стане суаднясенне тэмпаў росту зарплаты і прадукцыйнасці працы. Заработная плата павінна быць зароблена», — лічыць Мікалай Снапкоў.

СТАР. 2

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ЗАЦВЕРДЗІЎ ДЗЯРЖПРАГРАМУ ЎСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ СЯЛА НА 2011—2015 ГАДЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У 2015 годзе плануецца вытворчасць збожжа ў аб'ёме 12 млн тон, цукровых буракоў — 5,5 млн, ільновалакна — 60 тыс., алеянасення рапсу — 1,06 млн, бульбы — 7,75 млн і іншай агародніны — 2,16 млн, малака — 10,7 млн, мяса жывёлы і птушкі (у жывой вазе) — 2 млн тон.

Экспартныя пастаўкі сельскагаспадарчай прадукцыі і харчавання ў 2015 годзе складуць у суме 7,2 млрд долараў ЗША, сальда — плюс 4 млрд долараў ЗША.

У сацыяльнай сферы сяла прадугледжваюцца далейшае развіццё інфраструктуры аграгарадкоў у мэтах выканання стандартаў сацыяльна-бытавых паслуг на сяле і стварэнне спрыяльнага рэжыму для развіцця малога бізнэсу, індывідуальнага прадпрымальніцтва, асабістых падсобных гаспадарак грамадзян.

Сярэднямесячная заработная плата будзе прыбліжана да сярэдняй зарплаты па краіне.

На рэалізацыю Праграмы плануецца выдзеліць 29,7 трлн рублёў бюджэтных сродкаў, у тым ліку на развіццё вытворчай сферы — 27 трлн рублёў, або 91 працэнт, і сацыяльнай — 2,7 трлн рублёў, або 9 працэнтаў.

Акрамя таго, на выкананне мерапрыемстваў мэтавых праграм будзе дадаткова накіравана 15,3 трлн рублёў бюджэтных сродкаў, у тым ліку на развіццё АПК — 12,4 трлн, сацыяльнай і інжынерна-транспартнай інфраструктуры — 2,9 трлн рублёў, а таксама 67,8 трлн рублёў крэдытных сродкаў. На будаўніцтва жылля на сяле прадугледжваецца 6,2 трлн рублёў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ПРЫЗВАНЫМ НА ТЭРМІНОВУЮ ВАЕННУЮ СЛУЖБУ БУДЗЕ ПРАДАСТАЎЛЯЦЦА АДТЭРМІНОЎКА ВЯРТАННЯ ЖЫЛЛЁВАГА КРЭДЫТУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 1 жніўня падпісаў указ «Аб некаторых гарантыях грамадзянам, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу», паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

У адпаведнасці з дакументам грамадзянам, прызваным на тэрміновую ваенную службу, прадугледжваецца прадастаўленне дадатковай гарантыі ў выглядзе адтэрміноўкі вяртання (пагашэння) крэдыту, атрыманага для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылых памяшканняў, а таксама выплаты працэнтаў, платы (камісійных і іншых плацяжоў) за карыстанне такім крэдытам.

Гэта адтэрміноўка будзе прадастаўляцца грамадзянам на ўвесь перыяд праходжання тэрміновай ваеннай службы (службы па прызыве) як у адносінах да крэдытаў, атрыманых на льготных умовах, так і ў адносінах да крэдытаў, выдадзеных банкамі на камерцыйнай аснове. Дзеянне адтэрміноўкі будзе спыняцца пры звальненні грамадзяніна з тэрміновай ваеннай службы, а таксама пры заключэнні кантракта аб праходжанні ваеннай службы.

Указам прадугледжана кампенсацыя з рэспубліканскага бюджэту страт банкаў, звязаных з прадастаўленнем адтэрміноўкі. Такая кампенсацыя будзе ажыццяўляцца ў памеры стаўкі рэфінансавання, павялічанай на тры працэнты гадавых.

Рэалізацыя палажэнняў указа дасць магчымасць аказаць дзейсную матэрыяльную падтрымку грамадзянам, якія атрымалі крэдыт для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылля, у перыяд выканання імі воінскага абавязку.

Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Уладзімір ПУЦІН:

«ТРЭБА АДДАЦЬ НАЛЕЖНАЕ ПРЭЗІДЭНТУ БЕЛАРУСІ, ЯКІ ПАСЛЯДОЎНА ІДЗЕ ПА ШЛЯХУ ІНТЭГРАЦЫІ З РАСІЯЙ»

Прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін лічыць магчымым стварэнне адзінай дзяржавы Расіі і Беларусі. Такую заяву ён зрабіў 1 жніўня ў ходзе сустрэчы з удзельнікамі моладзевага форуму «Селігер-2011» у Цвярской вобласці, паведамляюць інфармагенцтвы.

«Гэта магчыма, вельмі пажадана і поўнасцю залежыць, на 100 працэнтаў залежыць, ад волевыяўлення беларускага народа», — сказаў Пуцін, адказваючы на пытанне аб перспектывах стварэння адзінай дзяржавы з Беларуссю, як гэта было ў часы Савецкага Саюза.

Уладзімір Пуцін таксама падкрэсліў, што ў Беларусі ёсць розныя падыходы да інтэграцыйных працэсаў і важна, каб голас у абарону інтэграцыі быў пачуты.

Акрамя таго, Уладзімір Пуцін заўважыў, што, нягледзячы на ўсе канфліктныя сітуацыі паміж Масквой і Мінскам у энергасферы, беларускае кіраўніцтва таксама працуе над збліжэннем дзвюх дзяржаў. «Трэба аддаць належнае Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку, ён паслядоўна ідзе па шляху інтэграцыі з Расіяй і стварэння адзінай дзяржавы», — падкрэсліў расійскі прэм'ер.

Аляксандр Лукашэнка незадаволены якасцю работы сістэмы органаў папярэдняга расследавання

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка незадаволены якасцю работы сістэмы органаў папярэдняга расследавання. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў учора на нарадзе па пытанні ўдасканалення сістэмы органаў папярэдняга расследавання, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што трэба чарговы раз абмеркаваць пытанне, якое неаднаразова ўзнімалася, — удасканаленне сістэмы і паляпшэнне работы органаў папярэдняга расследавання. «Я хацеў бы спадзявацца, што гэта пытанне мы будзем абмяркоўваць апошні раз і сёння прымем адназначнае рашэнне», — сказаў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, сітуацыя ў гэтай сферы няпростая. «Практыка паказвае, што амаль дзве трэці апраўдальных прыгавораў вынесены судамі з-за неналежнага выканання супрацоўнікамі органаў папярэдняга расследавання сваіх службовых абавязкаў. Толькі за першае паўгоддзе 2011 года спынены крымінальныя справы за адсутнасцю падзеі або складу злачынства ці вынесены апраўдальныя прыгаворы адносна паўтары сотні асоб», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым ён падкрэсліў, што ёсць нямала фактаў, калі асобы, вінаватыя ва ўчыненні злачынства, пазбягаюць крымінальнай адказнасці і не кампенсуюць прычынены дзяржаве шматмільярдны ўрон. «Чым гэта выклікана: непрафесіяналізмам, халатнасцю або карыслівымі намерамі? Па-мойму, ёсць і першае, і другое, і трэцяе. У кожным канкрэтным выпадку трэба глыбока разбірацца і выносіць прынцыповую ацэнку негатыўным з'явам, каб іх нікому непанадна было паўтараць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што, «на жаль, дапускаемыя аператыўнымі супрацоўнікамі памылкі, і часам і прамыя фальсіфікацыі, не заўсёды выяўляюцца ў ходзе папярэдняга расследавання». У шэрагу выпадкаў рашэнне аб прад'яўленні грамадзянам абвінавачання прымаюцца следчымі пры яўна недастатковым аб'ёме доказаў, лічыць Аляксандр Лукашэнка. «Хто адкажа за тое, што па абвінавачанні ў падпале кіёска «Віцебскаблсаюздрука» летам 2004 года былі асуджаны і адбывалі пакаранне два невінаватыя чалавекі і толькі пры расследаванні выбуху ў Мінскім метрапалітэне было ўстаноўлена, што гэта справа рук гэтых жа тэрарыстаў, Канавалава? Дарэчы, сёння пытанне «хто адкажа?» існаваць не павінна. Нескладана знайсці вінаватых, — адзначыў Прэзідэнт. — Застаючыся, такім чынам, беспакараным, Канавалаў ажыццявіў выбухі ў Віцебску, а затым і ў Мінску. Калі б яго спынілі тады, не было б іншых злачынстваў і бязвінных ахвяр. Вось адзін з вельмі выразных прыкладаў расхлябанасці праваахоўнай сістэмы ў цэлым. І пра якую якасць следства можа ісці гаворка?»

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што такія выпадкі выклікаюць самую негатыўную рэакцыю грамадства, «балюча» б'юць па прэстыжы дзяржаўнай улады ў цэлым.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што існуючыя праблемы ў разглядаемай сферы абумоўлены неэфектыўным і ў значнай ступені фармальным ведамасным кантролем за аператыўна-вышуковай дзейнасцю і папярэднім следствам, недастаткова строгім і прынцыповым наглядам з боку пракуратуры. «У сувязі з гэтым асаблівую значнасць мае пытанне павышэння якасці следства. Адным са шляхоў дасягнення гэтай мэты можа быць аб'яднанне следчых падраздзяленняў у адзіную цэнтралізаваную структуру», — лічыць Прэзідэнт.

«Але кожны раз, абмяркоўваючы пытанні рэфармавання следчага апарату, мы ўпіраліся ў «мёртвую кропку». Выказваліся розныя меркаванні супраць змянення існуючых структур. Адны прадстаўнікі дзяржаўных органаў баяліся страціць ведамасны ўплыў на падначаленыя ім следчыя падраздзяленні. Іншыя баяліся пры рэарганізацыі следства зламаць сталую сістэму папярэдняга расследавання і рухаліся ў фарватары разважання — толькі не было б горш, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Аднак цяпер тыя, хто раней выступаў супраць стварэння адзінай следчай структуры, ужо не настолькі катэгарычныя. Нават праціўнікі такой ідэі разумеюць, што якасць папярэдняга расследавання складана павышаць ва ўмовах дубліравання функцый праваахоўных органаў у следчай рабоце, адміністрацыйнай падначаленасці следчых і аперытыўных супрацоўнікаў аднаму кіраўніку». Паводле слоў Прэзідэнта, кожнае ведамства — МУС, КДБ, пракуратура, Камітэт дзяржкантролю «стараюцца абараніць свайго следчага і адбіцца ад нападак».

«Пры гэтым, аднак, трэба разумець, што рэфармаванне следчага апарату — гэта не мэта, а сродак павышэння якасці яго работы», — заявіў Прэзідэнт.

Як яго дасягнуць з найменшымі выдаткамі, і абмяркоўвалася на нарадзе, на якую былі запрошаны кіраўнікі дзяржорганаў, што ажыццяўляюць папярэдняе расследаванне, а таксама іншыя службовыя асобы, дзейнасць якіх непасрэдна або ўскосна звязана з работай следчага апарату. «Яшчэ раз хачу пачуць довады розных бакоў, усе аргументы «за» і «супраць», каб прыняць канчатковае рашэнне», — сказаў Прэзідэнт. Як лічыць Аляксандр Лукашэнка, неабдуманыя рашэнні ў гэтай сферы могуць прывесці да цяжкіх наступстваў.

Прэзідэнт адзначыў, што таму неабходна ўсебакова аб'ектыўна абмеркаваць усе існуючыя праблемы ў функцыянаванні органаў папярэдняга расследавання, якія негатыўна ўплываюць на эфектыўнасць барацьбы са злачыннасцю. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што чакае ад удзельнікаў нарады ўзважанай пазіцыі па пытанні стварэння адзінага Следчага камітэта. «Ведамасная або асабістая зацікаўленасць выключаюцца — патрэбна толькі дзяржаўная пазіцыя пры абмеркаванні гэтага пытання», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Узнагарода Прэзідэнта

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 1 жніўня падпісаў Указ аб узнагароджанні намесніка старшыні Беларускага культурна-асветнага таварыства «Уздым» Саюза беларусаў Латвіі Станіслава Валадзько медалём Францыска Скарыны, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Гэтай узнагароды ён удастоены за значны асабісты ўклад у прапаганду і развіццё духоўнай спадчыны беларускага народа, умацаванне двухбаковых сувязяў у сферы культуры паміж Рэспублікай Беларусь і Латвійскай Рэспублікай.

За неналежнае расследаванне выбуху ў Віцебску вызвалены ад пасады пракурор вобласці,

паведамілі БЕЛТА ў Генеральнай пракуратуры.

Загадам Генеральнага пракурора Беларусі ад 2 жніўня старшы саветнік юстыцыі Генадзь Дыско вызвалены ад пасады пракурора Віцебскай вобласці ў сувязі з расследаваннем тэрарыстычнага акта ў Мінскім метрапалітэне 11 красавіка 2011 года і выбухаў у Віцебску і Мінску, якія яму папярэднічалі, а таксама прычын і абставін іх здзяйснення.

Як растлумачылі ў Генпракуратуры, ён не арганізаваў належным чынам работу па расследаванні выбухаў у верасні 2005 года ў Віцебску. Дыско не забяспечыў сістэмнага нагляду за правядзеннем папярэдняга расследавання па крымінальнай справе па фактах выбухаў у Віцебску і за выкананнем заканадаўства пры ажыццяўленні органамі ўнутраных спраў аператыўна-вышуковай дзейнасці ў ходзе расследаванняў названых злачынстваў. Гэта дало магчымасць злачынцам пазбегнуць адказнасці і ў канчатковым выніку прывяло да трагедыі ў мінскім метро.

Праезд у грамадскім транспарце Мінска падаражэе з 4 жніўня

Праезд у грамадскім транспарце Мінска падаражэе з 4 жніўня — Міністэрства эканомікі ўзгадніла прапанаваныя Мінгарвыканкамам новыя тарыфы на перавозку пасажыраў гарадскім транспартам агульнага карыстання. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў дырэктар ДУ «Сталічны транспарт і сувязь» Валерый Шкуратаў.

У прыватнасці, Мінэканомікі ўзгоднены кошт адной паездкі ў сталіцы (у аўтобусе, трамваі, тралейбусе, метро) у памеры Br900, сказаў Валерый Шкуратаў.

«Адпаведнае рашэнне Мінгарвыканкама аб павышэнні кошту праезду ў грамадскім транспарце сталіцы на 5 працэнтаў прынята ўжо. Праезд у сталіцы падаражэе з 4 жніўня», — адзначыў дырэктар.

ГОД ІСЦІНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А прэм'ер-міністр падкрэсліў, што галоўны акцэнт у працы ўрада павінен быць на праблемах чалавека. «Якія б задачы мы з вамі ні вырашалі, прашу памятаць, што галоўнае — гэта чалавек, якасць і ўзровень яго жыцця, — сказаў Міхаіл Мясніковіч і дадаў: У 2011 годзе рэальныя даходы насельніцтва павінны быць не ніжэйшыя за 2010 год».

Аб замежных інвестыцыях і дзяржаўнай маёмасці

«Распрацаваныя аблвыканкамамі мерапрыемствы па прыцягненні прамых замежных інвестыцый не прынеслі належнага выніку, — заявіў міністр эканомікі Мікалай Снапкоў. — Самая дрэнная сітуацыя з прыцягненнем ПЗІ склалася ў Віцебскай вобласці (прыцягнена толькі 9 млн долараў). У Гомельскай — 22 млн долараў, Гродзенскай — 23,7 млн».

Таксама міністр эканомікі падзяліўся некаторымі планамі на 2012 год. «Для дасягнення структурнай збалансаванасці неабходная аптымізацыя структуры дзяржаўнай маёмасці і пераўтварэнне сістэмы дзяржаўнага кіравання шляхам скарачэння ўдзелу дзяржавы ў пераразмеркаванні фінансавых плыняў», — сказаў ён. Таму плануецца да канца 2012 года зрабіць так, каб частка прыватнага сектара ў ВУП дасягала не менш за 40 працэнтаў. Мікалай Снапкоў лічыць, што ў дзяржаўнай маёмасці павінны быць толькі тыя юрыдычныя асобы, якія маюць стратэгічнае значэнне і забяспечваюць нацыянальную бяспеку краіны, а пастаянна неплацежаздольныя прадпрыемствы трэба перадаваць нацыянальнаму інвестару.

Уклады і залаты запас

Першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка Юрый Алымаў канстатаваў павелічэнне рублёвых і валютных дэпазітаў насельніцтва ў банках Беларусі. Таксама ён паведаміў, што на першае жніўня золатавалютныя рэзервы Беларусі ў міжнародным вызначэнні склалі 4 млрд 150 млн долараў.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Гучная справа

БАЙКОВАЙ — ДВА ГАДЫ ХАТНЯЙ «ХІМІІ»

Учора ў Вярхоўным судзе вынеслі прысуд былой старшай следчай па асабліва важных справах Генпракуратуры Святлане Байковай. Журналістам не дазволілі прысутнічаць у зале судовага пасяджэння, бо крымінальная справа слухалася ў закрытым рэжыме. Гэта звязана ў тым ліку і з тым, пракаментавала прэс-сакратар Вярхоўнага суда Беларусі Настасся ЦІМАНОВІЧ, што даследаваліся звесткі, якія залічваюцца да дзяржаўных сакрэтаў.

Паводле слоў Настассі Цімановіч, Байкову, якая займалася расследаваннем гучных карупцыйных спраў, прызналі вінаватай у перавышэнні службовых паўнамоцтваў. У астатняй жа частцы абвінавачвання былую супрацоўніцу Генпракуратуры (яна абвінавачвалася па 5 артыкулах Крымінальнага кодэкса, у тым ліку ў заведама незаконным затрыманні і заключэнні пад варту, прымусе да дачы паказанняў і іншых злачынствах. — **Аўт.**) суд апраўдаў.

— Пры прызначэнні пакарання было ўлічана шэраг змякчаючых акалічнасцяў, — адзначыла прэс-сакратар Вярхоўнага суда. — У прыватнасці, адсутнасць карыслівых намераў, працяглая бездакорная служба Святланы Байковай у сістэме органаў пракуратуры, наяўнасць дзяржаўнай узнагароды.

У выніку жанчыну прыгаварылі да двух гадоў абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. У тэрмін абмежавання волі суд залічыў час, які яна правяла пад вартай і пад хатнім арыштам (Святлана Байкова была затрымана супрацоўнікамі КДБ у лютым 2010 года. — **Аўт.**). Байкову таксама пазбавілі права займаць пасады ў органах папярэдняга расследавання на працягу двух гадоў.

Надзея ДРЫЛА.

Бухгалтар самавольна павялічвала зарплату сабе і знаёмым

Вядучы бухгалтар Полацкага вытворчага ўчастка аднаго з прадпрыемстваў Глыбокага ў некалькі разоў павялічвала налічаную зарплату сабе, сваякам і знаёмым, чым нанесла дзяржаве ўрон у суме Br62 млн. Факты злоўжывання службовым становішчам былі выяўлены ў ходзе сумеснай праверкі Полацкага міжраённага камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці і АБЭЗ Полацкага РАУС, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў КДК Віцебскай вобласці.

Супрацоўнікі міжраённага камітэта і АБЭЗ устанавілі, што вядучы бухгалтар участка пералічвала грашовыя сродкі на карт-рахункі пэўнаму колу асоб у памеры, які перавышае налічаную заработную плату ў 3-4 разы. Напрыклад, механік участка, дзякуючы дзеянням бухгалтара, атрымаў адпускныя ў суме Br18 млн, у той час як загад на яго водпуск не выдаваўся, а яго сярэднямесячная заработная плата складала Br850 тыс. Механік звольніўся, а залішне пералічаная сума не была кампенсавана прадпрыемству. Вядучы бухгалтар паклапацілася і аб сваім сыне, павялічыўшы налічаную яму зарплату, пасля чаго той звольніўся з прадпрыемства і не кампенсаваў суму Br1,9 млн. Прадпрымальная дама, выкарыстоўваючы сваё службовае становішча, выкрала грашовыя сродкі ў суме Br2,3 млн, пералічыўшы іх на свайго грамадзянскага мужа і знаёмага пад выглядам належнай ім заработнай платы, хоць ні той, ні другі на прадпрыемстве не працавалі.

Праваахоўныя органы ўстанавілі і іншыя факты неабгрунтаванага пералічэння грашовых сродкаў работнікам прадпрыемства. Вінаватымі асобамі кампенсаваны ўрон прадпрыемству ў суме Br39 млн. Адносна былога вядучага бухгалтара Полацкім РАУС узбуджана 6 крымінальных спраў.

У Беларусі зацверджана палажэнне аб вызначэнні кошту незаконна здабытай прадукцыі жывёльнага свету

У Беларусі зацверджана новае палажэнне аб вызначэнні кошту незаконна здабытай прадукцыі карыстання аб'ектамі жывёльнага свету. Такое рашэнне змешчана ў пастанове Савета Міністраў № 1022 ад 29 ліпеня 2011 года, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе ўрада.

Як растлумачылі ў Міністэрстве прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, дакумент распрацаваны ў мэтах рэалізацыі ч.3 арт. 62 Закона Рэспублікі Беларусь ад 10 ліпеня 2007 года «Аб жывёльным свеце». Згодна з ч.2 гэтага закона, з асобы, якая незаконна здабыла прадукцыю карыстання аб'ектамі жывёльнага свету, пры немагчымасці яе канфіскацыі павінен спаганяцца кошт незаконна здабытай прадукцыі.

У адпаведнасці з новым палажэннем, кошт незаконна здабытай прадукцыі карыстання аб'ектамі жывёльнага свету пры немагчымасці яе канфіскацыі або немагчымасці рэалізацыі канфіскаванай незаконна здабытай прадукцыі карыстання аб'ектамі жывёльнага свету ці эканамічнай немэтазгоднасці рэалізацыі такой прадукцыі вызначаецца разліковым метадам асобна па кожнаму віду дзікай жывёліны, у залежнасці ад яе ўзросту. Напрыклад, за незаконна здабытага аднаго дарослага лася неабходна заплаціць суму ў памеры 60 базавых велічынь — сёння гэта Br2,1 млн, маладняку — 25 базавых велічынь, трафейнай — 96 базавых велічынь. Вызначаны таксама кошт кампенсацыі незаконна здабытых рэптылій, амфібій, міног, малюскаў, насякомых, птушак, рыб. У прыватнасці, за незаконна здабытую ручаёвую фарэль трэба будзе заплаціць 0,5 базавай велічыні (Br17,5 тыс.), за незаконна здабыты кілаграм лічынак хіранамід — 5 базавых велічынь (Br175 тыс.).

Як растлумачылі ў Мінпрыроды, зацвярджэнне новага палажэння дасць магчымасць забяспечыць эфектыўнае функцыянаванне і прававое рэгуляванне адносін у галіне аховы навакольнага асяроддзя, аховы і выкарыстання жывёльнага свету, накіраванага на скарачэнне незаконнай здабычы прадукцыі карыстання аб'ектамі жывёльнага свету фізічнымі і юрыдычнымі асобамі. Гэта дасць магчымасць таксама павысіць эфектыўнасць эканамічных мер аховы навакольнага асяроддзя, аховы і выкарыстання аб'ектаў жывёльнага свету пры ажыццяўленні фізічнымі і юрыдычнымі асобамі дзейнасці рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, паляўнічай гаспадаркі і палявання і іншымі карыстальнікамі аб'ектаў жывёльнага свету. А галоўнае — дасць магчымасць скараціць колькасць выпадкаў незаконнай здабычы прадукцыі карыстання аб'ектамі жывёльнага свету, што ў выніку забяспечыць захаванне біялагічнай разнастайнасці ў рэспубліцы.

Прыняцце пастановы не запатрабуе распрацоўкі і ўнясення новых змяненняў і дапаўненняў у дзейныя нарматыўныя прававыя акты, а таксама дадатковага бюджэтнага фінансавання, адзначылі ў Мінпрыроды.

Мінчане шукаюць у інтэрнэце рэцэпт піцы часцей, чым дранікаў

Кампанія «Яндэкс» апублікавала даследаванне, дзе былі прааналізаваныя запыты карыстальнікаў са словам «рэцэпт» — а такіх запытаў штодзень у Яндэксе налічваецца каля 150 тысяч.

Больш за ўсё кулінарыяй цікавяцца ў Адэсе — 0,32% запытаў з гэтага горада змяшчаюць словы «рэцэпт» або «як прыгатаваць» (гэта больш за 10 тысяч запытаў за тыдзень). Жыхары Мінска, для параўнання, таксама актыўна цікавяцца рэцэптамі — у 0,2% запытаў (каля 12 тысяч за тыдзень). Што цікавіць людзей больш за ўсё? Калі браць статыстыку ўвогуле па гарадах Расіі, Беларусі і Украіны, то самым папулярным аказваецца рэцэпт прыгатавання сырнікаў. Наогул, як адзначаецца ў даследаванні аналітычнай групы дэпартамента маркетынгу кампаніі «Яндэкс», прыгатаванне страў з выкарыстаннем цеста выклікае якраз найбольш цяжкасцяў, бо сярод дваццаці самых папулярных рэцэптаў у палове выпадкаў выкарыстоўваецца цеста — гэта і шарлотка, і бліны, і піца, аўсянае печыва і інш. Далей па папулярнасці ідуць рэцэпты розных супоў і салатаў.

Калі ж казаць пра жыхароў Мінска, то часцей за ўсё яны лезуць у інтэрнэт па рэцэпты піцы. На другім месцы па папулярнасці знаходзяцца дранікі, а толькі потым — сырнікі. Наогул у топ-20 кулінарных запытаў са сталіцы Беларусі ўваходзяць лазання, сачавіца, амлет, маннік, сушы, хрушчы, шарлотка, тарталеткі, рыбныя кансервы, пірожнае «Бульбачка», салянка, салата «Лясная паляна», боршч, торт «Напалеон» і скумбрыя ў цесце. Адметнымі для Мінска з'яўляюцца рэцэпты з сачавіцай, а таксама сушы, тарталетак, салаты «Лясная паляна» і скумбрыі ў цесце — яны не ўвайшлі ў топ-20 іншых гарадоў.

Павел БЕРАСНЕЎ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

СВЯТА АГНЮ І ГЛІНЫ, або Ці стане Івянец сталіцай ганчароў?

Івянецкі рамесніцкі фэст-конкурс сабраў сем дзясяткаў керамістаў з адзінаццаці раёнаў сталічнай вобласці. Але толькі шаснаццаць (не так і шмат для Міншчыны) масцітых майстроў прынародна дэманстравалі «вышэйшы пілатаж» ганчарнай тэхнікі, абараняючы права і надалей насіць ганаровае званне лепшых ганчароў. Здавалася, хіба можна здзівіць івенчукоў такой з'явай, як ганчарства? Аказваецца, яшчэ як! І дзеці, і дарослыя літаральна «ўзялі ў круг» ганчарныя кругі і сачылі за чараўніцтвам мурзатых ад гліны рук. Для гасцей кірмашу тым больш было ў навінку назіраць, як кавалкі цёмнай гліны выцягваліся то ў стромкія вазы, то ў надзьмутыя гладышы ці пузатыя гаршкі. За ганчарны станок садзіліся сапраўдныя прафесіяналы справы: Іван Раманчук і Мікалай Стрэльчанка з Лагойска, Андрэй Шабар з Дзяржынска, цэлая каманда адстойвала гонар івянецкіх рамеснікаў: Анатоль Высоцкі, Яўген Серафімовіч, Алег Капуста, Валерый Лапа, Уладзімір Скрыпка, Максім Каробкін. Адзіная ўдзельніца-жанчына Наталля Сідзерчык з Вілейкі хоць і аматар з невялікім стажам, але зроблены ёю посуд — сведчанне, што ў ганчарнай справе, як у мастацтве наогул, неістотна, якія рукі — жаночыя ці мужчынскія ствараюць прыгажосць і працягваюць традыцыю. Вось і загадчык аддзела традыцыйнага мастацтва Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці, кандыдат гістарычных навук Віталь Каспяровіч, арганізатар гэтага і шматлікіх іншых святаў, таксама пра тое ж:

— Задача гэткіх фэстаў, як «Гліняны звон» у Івянцы, — перадаць моладзі традыцыю, захаваць лепшыя здабыткі народнай творчасці, падзяліцца вопытам. Абудзіць у насельніцтва цікавасць і, калі пашанцуе, выявіць новыя таленты. Безумоўна, важна стварыць для горада і прыгожае свята!

«Гэта будзе справядліва, калі Івянец атрымае права на правядзенне фэстаў агню і гліны і займее ганаровае званне ганчарнай сталіцы Міншчыны», — падзяліўся думкамі краязнаўца-музейшчык, мастак і керамік Алег Раманоўскі, без якога немагчыма ўявіць жыццё маленькага, але надзвычай мілага мястэчка.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

Спорт-тайм

Беларускі экіпаж каноэ-двойкі заваяваў бронзу юніёрскага чэмпіянату свету на дыстанцыі 200 м

Беларускі экіпаж мужчынскай каноэ-двойкі (Яўген Кукса, Яўген Тэнгель) заваяваў бронзу на дыстанцыі 200 м на юніёрскім чэмпіянаце свету, які прайшоў у германскім Брандэнбургу, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Гэта ўзнагарода стала адзінай для беларусаў на юніёрскім першынстве планеты па веславанні на байдарках і каноэ.

За крок ад п'едэстала канаісты Яўген Кукса і Яўген Тэнгель спыніліся і ў спаборніцтвах каноэ-двоек на дыстанцыі 500 м, заняўшы 4-е месца.

У турніры каноэ-адзіночак сярод дзяўчат блізкая да ўзнагароды была Настасся Заціпайка, якая паказала 4-ы вынік у фінальным заездзе на 200 м.

У спаборніцтвах байдарак-адзіночак Аляксандра Грышына заняла 5-е месца на дыстанцыі 1000 м і стала 6-й на 500 м.

У спаборніцтвах байдарак-двоек беларускі экіпаж дзяўчат у складзе Алены Саўчанкі і Ганны Брылёвай заняў 5-е месца на дыстанцыі 200 м.

Баскетбалісты выйгралі турнір у Кіеве

Мужчынская зборная Беларусі па баскетболе выйграла міжнародны турнір у Кіеве AeroSvit Cup-2011. Нягледзячы на тое, што наша каманда саступіла ў апошнім матчы Эстоніі (70:72), гэта не паўплывала на яе выніковае становішча. Другое месца занялі гаспадары спаборніцтваў — украінцы, Эстонія на трэцім месцы, Іарданія з трыма паражэннямі стала апошняй.

БАТЭ прымае «Экранас»

Сёння ў 19 гадзін на гарадскім стадыёне ў Барысаве пачнецца матч 3-га кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў паміж БАТЭ і літоўскім «Экранасам». Нагадаем, што першы матч гэтага раўнда наш клуб праводзіў на выездзе і згуляў унічыю 0:0. Напярэдадні галоўны трэнер барысаўчан Віктар Ганчарэнка расказаў журналістам, што разлічвае на перамогу і выхад у наступную стадыю:

— Як заўсёды, да матчаў Лігі чэмпіёнаў мы рыхтуемся ў прыўзнятым настроі. Гэта бачна па трэніроўках, дадатковых эмоцый надаў удалы выезд у Віцебск. Разлічваем перамагчы і прайсці ў наступны раўнд. Хоць гульня, без сумненняў, будзе складаная.

Алена КРАВЕЦ.

Абзац

На зернетаку КСУП «Дубовы Лог» Добрушскага раёна смяротна траўмаваны дзевяцікласнік. Паводле папярэдняй інфармацыі, падлетак 1995 г.н. быў на працы з маці. Ён падключаў электрапровад да сеткі зернеэлеватара, у выніку чаго быў траўмаваны токам. Школьніка даставілі ў бальніцу, ён памёр у рэанімацыі. Праверку ўсіх абставінаў трагедыі вядзе пракуратура.

Аўтамабіль «Фальксваген Пасат» каля вёскі Самалі ўрэзаўся ў дрэва. Тры пасажыркі, жанчыны 1976, 1977 і 1982 гадоў нараджэння, загінулі на месцы здарэння. 35-гадовы кіроўца быў дастаўлены ў рэанімацыю. Здарэнне адбылося на аўтадарозе Маладзечна — Ілья. На закругленні дарогі ўлева кіроўца, жыхар Магілёўскай вобласці, выбраў небяспечную хуткасць, аўтамабіль занесла, ён з'ехаў у левы кювет і ўрэзаўся ў дрэва. З трох загінулых жанчын дзве жыхаркі Вілейскага раёна, адна — Маладзечанскага.

Поўны абзац

Калі вы пастаянна спазняецеся «на хвілінку» і менавіта гэтай хвілінкі часам не хапае, каб паспець заскочыць у патрэбны вагон, то вам — у Галандыю. Тут на станцыі Овервехт устанавілі горку ў якасці альтэрнатывы банальным лесвіцам. Створаная дызайнерамі горка павінна стаць выратаваннем для пасажыраў, якія спазняюцца на цягнік альбо проста хочуць дадаць крыху экстрыму ў сваю паездку. Акрамя таго, па вечарах горка грае музыку Баха, і ваша «падарожжа» на пятай кропцы становіцца незабыўным.

СЁННЯ І ЗАЎТРА АДРАСНАЙ САЦЫЯЛЬНАЙ ДАПАМОГІ

ЯК ВЯДОМА, зараз у адпаведнасці з існуючым заканадаўствам сем'і грамадзян, якія на працягу апошніх 12 месяцаў ажыццявілі выязны турызм, не маюць права на прызначэнне дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі ў выглядзе штомесячнай сацыяльнай дапамогі. А як у такой сітуацыі быць з паездкамі на славуты кірмаш у Хмяльніцкі (Украіна), дзе многія шматдзетныя сем'і набываюць танныя тавары штодзённага попыту?

— Сапраўды, многія малазабяспечаныя шматдзетныя сем'і выязджаюць у Хмяльніцкі, каб набыць тавары першай неабходнасці для сябе, сваёй сям'і, сабраць дзяцей у школу, — патлумачыла **начальнік аддзела развіцця і каардынацыі сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання Мінпрацы і сацыяльнай абароны Таццяна ФЁДАРАВА**. — Мы рэкамендавалі такія кароткатэрміновыя і непрацяглыя выезды не лічыць за выязны турызм. Гэта наша пазіцыя, але, на жаль, фінансавыя органы пакуль што ўсё роўна ўспрымаюць гэта як выязны турызм. Мы ідзём насустрач грамадзянам, добра разумеючы, што яны такім чынам вырашаюць свае матэрыяльныя праблемы. Тым не менш, наспела неабходнасць карэкціроўкі заканадаўства ў плане пашырэння паняцця «выязны турызм». Мы гэта адлюстроуем у змяненнях, якія будзем уносіць ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 верасня 2009 года № 458 «Аб дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамозе». У прыватнасці, плануецца не адносіць да выязнога турызму выезд грамадзян за межы Рэспублікі Беларусь для наведвання блізкіх сваякоў, якіх яны абавязаны па законе даглядаць ці якія абавязаны даглядаць іх, выезд на пахаванне і на некаторыя іншыя важныя сямейныя мерапрыемствы, наведванне магіл блізкіх сваякоў.

Па словах спецыяліста, гэтыя змяненні павінны быць унесены ў самы бліжэйшы час.

...Адрасная сацыяльная дапамога можа выдавацца на набыццё прадуктаў харчавання, лекаў, адзення, абутку і на іншыя патрэбы, у тым ліку — на аплату (часткова ці цалкам) жыллёва-камунальных паслуг. Сёння дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога прадастаўляецца ў выглядзе штомесячнай сацыяльнай дапамогі, аднаразовай сацыяльнай дапамогі і сацыяльнай дапамогі на аплату тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі. Як патлумачыў **начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Мінпрацы Анатоль РАЖАНЕЦ**, штомесячная сацыяльная дапамога даецца сем'ям і грамадзянам, калі іх сярэднедушавы даход па аб'ектыўных прычынах не перавышае бюджэт пражытковага мінімуму, які на 1 жніўня склаў 442 тыс 360 руб.

Штомесячная сацыяльная дапамога налічваецца з месяца падачы заявы на перыяд ад аднаго да шасці месяцаў з улікам захадаў, якія сям'я (грамадзянін) робіць для паляпшэння свайго матэрыяльнага становішча. Пры гэтым перыяд яе выплаты на працягу года, пачынаючы з месяца звароту, не можа перавышаць шасці месяцаў.

Адначасова Указам № 458 вызначаны так званыя «фільтры», якія дазволяць адсеяць сем'і і грамадзян, чый нізкі памер даходаў абумоўлены суб'ектыўнымі прычынамі. Прымяненне гэтых фільтраў скіравана на зніжэнне ўтрымальніцкай нагрузкі на бюджэт і на актывізацыю ўласных магчымасцяў заяўнікаў, падкрэсліў Анатоль Ражанец.

Аднаразовая сацыяльная дапамога прадастаўляецца сям'і ці грамадзяніну, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, калі іх сярэднедушавы даход не перавышае 1,5 велічыні бюджэту пражытковага мінімуму (на 1 жніўня гэта 663 тыс. 540 руб). Пры гэтым пад «цяжкай жыццёвай сітуацыяй» разумеюцца абставіны, складаныя для самастойнага вырашэння: поўная непрацаздольнасць па прычыне інваліднасці ці дасягнення грамадзянамі 80-гадовага ўзросту, няздольнасць да самаабслугоўвання ў сувязі з хваробай, а таксама стыхійныя бедствы, катастрофы, пажары і інш.

Аднаразовая сацыяльная дапамога вызначаецца ў памеры да 5 бюджэтаў пражытковага мінімуму — у залежнасці ад складанасці канкрэтнай сітуацыі, у якой апынулася сям'я ці грамадзянін.

Анатоль Аляксеевіч звярнуў увагу на тое, што наяўнасць цяжкай жыццёвай сітуацыі, якая дае права на атрыманне аднаразовай сацыяльнай дапамогі, павінна быць пацверджана дакументальна ці ўстаноўлена спецыяльна створанай камісіяй на падставе акта абследавання матэрыяльна-бытавога становішча сям'і (грамадзяніна).

Аднаразовая сацыяльная дапамога налічваецца не больш за адзін раз на год.

Прадстаўнік Мінпрацы дадаў, што адрасная сацыяльная дапамога можа давацца як у грашовай (наяўнай ці безнаяўнай), так і ў натуральнай форме. Пры неабходнасці ўсе гэтыя формы можна сумясціць. Натуральная форма прымяняецца ў тым выпадку, калі бацькі не забяспечваюць належны догляд сваіх дзяцей, а адрасную сацыяльную дапамогу, атрыманую ў грашовай форме, выкарыстоўваюць не па прызначэнні. Пры наяўнасці запазычанасці па аплаце камунальных паслуг адрасная сацыяльная дапамога прадастаўляецца ў першачарговым парадку на аплату гэтых паслуг у безнаяўнай форме — пералічваецца на рахунак адпаведных арганізацый.

Сацыяльная дапамога на аплату тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі (ТССР) даецца незалежна ад велічыні сярэднедушавога даходу сям'і (грамадзяніна) ў памеры кошту такіх сродкаў:

- дзецям ва ўзросце да 18 гадоў, якія не прызнаныя інвалідамі, але маюць патрэбу па медыцынскіх паказаннях у ТССР;
- інвалідам III групы, апроч асоб, чыя інваліднасць наступіла ў выніку супрацьпраўных дзеянняў ці па прычыне алкагольнага, наркатычнага, таксічнага ап'янення.

Гэтая сацыяльная дапамога прызначаецца для аплаты найбольш жыццёва важных ТССР з улікам тэрмінаў іх эксплуатацыі. Яна можа выдавацца як у наяўнай, так і ў безнаяўнай грашовай форме.

За перыяд са студзеня па чэрвень 2011 года дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога была прадастаўлена 67,2 тыс. чалавек на агульную суму каля 25,6 млрд рублёў, сярэдні памер штомесячнай сацыяльнай дапамогі склаў прыкладна 58,5 тыс. рублёў у месяц на аднаго чалавека, а аднаразовай — 282 тыс. рублёў. Сацыяльная дапамога на аплату тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі прызначана амаль 9,5 тыс. чалавек на агульную суму каля 6 млрд руб.

Сёлета за першае паўгоддзе было асвоена 38,1% сродкаў ад запланаваных на выплату дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі (гэта каля 67 млрд рублёў).

Гаворачы аб практыцы прымянення Указа № 458, Анатоль Ражанец адзначыў, што змяненні заканадаўства, якія адбываліся па ходу дзейнасці ўказа, дазволілі пашырыць кола атрымальнікаў сацыяльнай падтрымкі, спрасціць працэдуру яе прадастаўлення, а таксама больш аб'ектыўна ацэньваць матэрыяльны стан тых, хто мае патрэбу, рацыянальна расходаваць фінансавыя асігнаванні, выдаткаваныя на гэтыя мэты.

— Безумоўна, у ходзе прымянення тых ці іншых нарматыўных дакументаў сустракаюцца сітуацыі, якія патрабуюць змяненняў у парадку прызначэння адраснай дапамогі, — дадаў кіраўнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі. — Напрыклад, па ініцыятыве Міністэрства працы і сацыяльнай абароны была падрыхтавана і прынята Пастанова Савета Міністраў ад 20 ліпеня г. г. аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Пастанову № 1658, у адпаведнасці з якой пры разліку сярэднедушавога даходу сем'яў, якія прэтэндуюць на адрасную сацыяльную дапамогу, не будзе ўлічвацца грашовы эквівалент атрыманых імі льгот па санаторна-курортным лячэнні і аздараўленні. Гэта дазволіць малазабяспечаным пластам насельніцтва ў сітуацыі росту кошту пуцёвак рэалізаваць сваё права на санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне, не выключаючы атрымання дзяржаўнай падтрымкі ў выглядзе адраснай дапамогі.

Апроч таго, у сістэму адраснай сацыяльнай дапамогі плануецца ўключыць бясплатнае забеспячэнне прадуктамі харчавання дзяцей першых двух гадоў жыцця, паколькі атрымальнікі бясплатных прадуктаў харчавання, як правіла, адначасова з'яўляюцца і атрымальнікамі адраснай сацыяльнай дапамогі. Прынцып прадастаўлення бясплатнага харчавання аналагічны прынцыпам прадастаўлення адраснай сацыяльнай дапамогі, таму ўключэнне такога віду сацыяльнай падтрымкі паспрыяе спрашчэнню працэдуры атрымання сям'ёй падтрымкі ў цэлым, а таксама знізіць адміністрацыйныя расходы, павысіць даступнасць і значнасць дзярждапамогі.

Інга МІНДАЛЁВА.

ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ — ДЛЯ ПРАГРАМЫ РЭАБІЛІТАЦЫІ

З 1 верасня ўступіць у сілу пастанова Міністэрства аховы здароўя № 65 аб зацвярджэнні новай формы індывідуальнай праграмы па рэабілітацыі інваліда, зацвярджэнні інструкцыі аб парадку яе запаўнення. У чым яго сутнасць, расказаў галоўны пазаштатны эксперт Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, дырэктар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра медыцынскай экспертызы і рэабілітацыі, доктар медыцынскіх навук Васіль СМЫЧОК.

У гэтым дакуменце, узгодненым з Мінпрацы і з Мінадукацыі, улічаны ўсе недапрацоўкі, якія былі ў папярэдніх праграмах рэабілітацыі. Апроч іншага, там прадугледжаны «адрыўныя талоны», якія павінны забяспечыць зваротную сувязь. Сам бланк новай формы рэабілітацыі будзе ўключаць тры раздзелы: медыцынскі, прафесійны і сацыяльнай рэабілітацыі.

— Раней у плане медыцынскай рэабілітацыі сувязь паміж медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіяй (МРЭК), якая вызначае інваліднасць, і паліклінікай была, а вось сувязь са службай занятасці і іншымі сацыяльнымі службамі была, можна сказаць, недастатковай, непаўнавартаснай. Цяпер МРЭК будуць складаць праграмы рэабілітацыі наступным чынам: асобна — у плане прафесійных аспектаў, асобна — у сацыяльных аспектах (калі чалавек мае патрэбу ў перанавучанні, працаўладкаванні, пераабсталяванні працоўнага месца ў залежнасці ад стану здароўя). Праграма будзе накіроўвацца ці ў службу занятасці, ці на працоўнае прадпрыемства, адкуль на працягу 12 месяцаў павінен прыйсці адказ. Арганізацыя абавязана выслаць адрыўны квіток, дзе мусіць указаць, якую новую спецыяльнасць атрымаў інвалід, як ён працаўладкаваны, як адаптавана яго працоўнае месца. Тое ж тычыцца і сацыяльнай рэабілітацыі: цяпер будзе не толькі запісвацца, што чалавек мае патрэбу ў тэхнічных сродках, у прыстасаванні жылля, але патрабавацца і зваротная сувязь — што чалавеку за год зроблена.

Што тычыцца людзей, чыю інваліднасць вызначылі бестэрмінова (пажыццёва), то пастановай прадугледжана, што на працягу першых 12 месяцаў праграма іх сацыяльнай рэабілітацыі павінна быць абавязкова выканана. Пры гэтым сам чалавек, якому прызначаецца такая праграма, ці яго законны прадстаўнік мае права адмовіцца ад пэўных яе аспектаў ці ад праграмы ў цэлым, а вось установы, куды накіроўваецца праграма рэабілітацыі, не могуць яе праігнараваць. Праграма рэабілітацыі абавязковая для выканання ўсімі ўстановамі і арганізацыямі, незалежна ад формы ўласнасці і гаспадарання.

Сярод прычын, якія фарміруюць сёння інваліднасць, ва ўсім свеце і ў Беларусі ў тым ліку, медык назваў наступныя: анкалогія, хваробы сардэчна-сасудзістай сістэмы і траўматызм у дарослых, прыроджаныя анамаліі, хваробы нервовай і эндакрыннай сістэм у дзяцей.

Інга МІНДАЛЁВА.

Рэверс з сецівa «Звязды»

ЧАМУ Б НЕ АРГАНІЗАВАЦЬ ПЕДСАВЕТ У ІНТЭРНЭЦЕ?

Намер адкрыць на адукацыйным інтэрнэт-партале (www.adu.by) рубрыку «Праблемы школьнага падручніка» (чытай артыкул у «Звяздзе» за 8 ліпеня «Пра праблемы школьнага падручніка: адкрыта і галосна») даўно трэба здзейсніць. Бо ніякія «круглыя сталы» і навуковыя экспертызы ў сённяшніх умовах недастатковыя з адной вельмі сумнай прычыны — настаўнікаў адвучылі крытыкаваць «начальства» ў наўпроставых стасунках. Інтэрнэт, відавочна, адкрывае ў гэтым плане шырокія магчымасці. Яскравае пацвярджэнне — тая актыўнасць настаўнікаў, што назіраецца на сайце «Звязды» з нагоды публікацыі на яе старонках артыкула «Самаадданасць настаўнікаў нельга эксплуатаваць бясконца» (нумар за 17 сакавіка 2010 года). Вось гэта рэальны педсавет, які не заменіш тым афіцыйным, дзе шмат вады і мінімум сапраўднасці. У Расіі ўжо колькі гадоў запар ладзіцца інтэрнэт-педсавет (http: pedsovet.org), машталь дыскусійнасці, кола праблем, колькасць удзельнікаў і адкрытасць якога ўражваюць. Чаму б і нам, урэшце, не распачаць рух у кірунку адкрытасці адукацыйнай сістэмы? У яе назапасілася столькі праблем, для абмеркавання якіх недастаткова дзейных архаічных пляцовак.

WWW.ZVIAZDA.BY

Іван Сяргеевіч.

Першыя футбольныя сцюарды — у глыбінцы

Падчас футбольнага матча паміж камандамі «Віцебск» і БАТЭ на галоўным футбольным стадыёне Віцебска — цэнтральным спартыўным комплексе — упершыню за парадкам на глядацкіх трыбунах сачылі сцюарды.

Як расказаў «Звяздзе» намеснік начальніка ўпраўлення аховы правапарадку УУС Віцебскага аблвыканкама, падпалкоўнік міліцыі Андрэй Іваноў, у Еўропе сцюарды — добраахвотныя памочнікі паліцыі — сочаць за парадкам ужо даўно. Дарэчы, дзейнасць сцюардаў адпавядае нормам міжнароднай футбольнай асацыяцыі. Ёсць нават і рэкамендаваная «прапорцыя» колькасці сцюардаў да гледачоў: адзін сцюард на сто балельшчыкаў. Цікава, што сцюардамі могуць быць і жанчыны. Сцюарды дапамагаюць паліцыі і ў прафілактыцы хуліганства сярод фанатаў.

Першыя віцебскія сцюарды, перад тым як працаваць на матчы, прайшлі адбор. Імі сталі самыя годныя дружыннікі. Падчас гульні працавалі ў спецыяльнай форме — яркіх камізэльках, якія адбіваюць святло. Віцебская футбольная каманда прайграла больш вопытным гасцям. Затое дзякуючы сцюардам, якіх было трыццаць, балельшчыкі адчулі сябе, як на матчы на лепшых спартыўных арэнах свету.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КВАТЭРА ЗА ГОДНУЮ СТАРАСЦЬ

Мінгарвыканкам абяцае забяспечыць неабходную сацыяльную падтрымку пенсіянерам, якія згодны будуць аддаць сваё жыллё ў дзяржаўны фонд.

Такая форма рэнты ўведзена пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у якасці эксперымента, які плануюць праводзіць на працягу 2011-2015 гг. толькі на тэрыторыі горада Мінска. Па выніках будзе зразумела, наколькі такі від сацыяльных паслуг запатрабаваны. Заключыўшы дамову, пенсіянер аддае сваё жыллё ва ўласнасць дзяржавы, а сам альбо пераязджае ў дом-інтэрнат, дзе яму забяспечваюць неабходны догляд, альбо карыстаецца паслугамі сацыяльнага работніка, які наведвае яго дома. Пра нюансы, якія датычацца новай формы рэнтных адносін, мы запыталіся ў **начальніка юрыдычнага аддзела камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Элы АКУЛА**.

— Калі чалавеку больш за 70 гадоў і ў яго няма родных, якія маглі б яго даглядаць, ён мае магчымасць сёння звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр, дзе яму прапануюць паслугі сацыяльнага работніка. Але, па-першае, у такіх цэнтрах гэты набор паслуг строга акрэслены. Па-другое, не кожны пенсіянер мае магчымасць плаціць за візіты сацыяльнага работніка. Затое шмат у каго з пажылых ёсць жыллё ва ўласнасці. Цяпер пасля заключэння дамовы, якая прадугледжвае пераход кватэры ў дзяржаўны фонд, пенсіянеры могуць карыстацца паслугамі сацыяльнага работніка, які будзе прыходзіць дадому, альбо пераехаць ў дом-інтэрнат. У дамове прапісваюць усе сацыяльныя паслугі, якія будуць аказвацца пенсіянеру.

— Чаму ўзнікла неабходнасць прапаноўваць пенсіянерам сацыяльныя паслугі ў абмен на кватэру? Магчыма, нехта сам звярнуўся з такім пытаннем?

—Так, звароты былі. Людзі ведалі, што такі вопыт ёсць у Маскве. Акрамя таго, сёння вельмі шмат пажылых людзей, у якіх няма блізкіх родзічаў, гатовых дапамагчы. Да таго ж, не ўсе гэтыя людзі забяспечаны матэрыяльна. Таму аплаціць усе патрэбныя сацыяльныя паслугі, якія патрэбны пажылому чалавеку, яны не ў стане.

— Калі пенсіянер вырашыць, заключыўшы дамову, паехаць жыць у дом-пансіянат, якія ўмовы пражывання ён атрымае?

— Перш, чым падпісваць дамову, чалавек мае права азнаёміцца з умовамі пражывання. Пенсіянер можа жыць у пакоі адзін, а можа і з кімсьці. Як пажадае. Пералік сацыяльных паслуг і паслуг, якія датычацца падтрымання яго здароўя і баўлення часу, з ім будзе абмеркаваны персанальна. Месца, куды пенсіянер пераязджае, — гарадскі дом-інтэрнат для ветэранаў вайны і працы «Світанак». Ён знаходзіцца ў Мінскім раёне.

— Што сталічныя ўлады будуць рабіць з жыллём, якое атрымаюць ва ўласнасць?

— Сёння пакуль рана пра гэта гаварыць. Дакладнага рашэння на гэты конт няма. Магчыма, кошт кватэры будзе пакрываць выдаткі, якія нясе горад, аказваючы грамадзянам сацыяльныя паслугі.

— Куды павінен звярнуцца пенсіянер, які пажадае аддаць кватэру ва ўласнасць дзяржавы ў абмен на забеспячэнне годнай старасці?

— Ён павінен прыйсці ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання па месцы жыхарства. Там яму падрабязна растлумачаць, куды трэба звярнуцца і якія дакументы для гэтага неабходныя.

— Якія могуць быць небяспечныя бакі ў рашэнні аказваць сацыяльныя паслугі ў абмен на жыллё?

— Небяспека ёсць у тым выпадку, калі пенсіянер не будзе задаволены якасцю сацыяльных паслуг ці нечым іншым. Тут жа ўсё вельмі індывідуальна.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

Пункт погляду

Валянціна ЛЯВОНЕНКА:

«МЫТНЫ САЮЗ МОЖА СТАЦЬ НОВЫМ ГЕАПАЛІТЫЧНЫМ УТВАРЭННЕМ»

Ужо 20 гадоў, як няма «вялікага і магутнага» Савецкага Саюза. Гістарычны і паліталагічны аспекты развалу гэтай дзяржавы разгледзела падчас анлайн-відэабрыфінгу член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і сувязях з СНД, кандыдат гістарычных навук Валянціна ЛЯВОНЕНКА.

Паводле яе слоў, у 1991 годзе ў свеце парушылася ўстойлівая раўнавага, свет перастаў быць біпалярным, і, па вялікім рахунку, сёння размова можа ісці аб непрадказальнасці далейшага развіцця свету. Распад Савецкага Саюза адразу ж прывёў да міжнародных канфліктаў і «перапісвання» гісторыі шматнацыянальнай, шматканфесіянальнай дзяржавы, — напрыклад, абумовіў з'яўленне новых трактовак асноўных падзей Вялікай Айчыннай вайны...

Пачаткам распаду можна лічыць 80-я. Яшчэ ў 1975-76 гадах трэба было задумацца над тым, як неабходна перабудоўваць сітуацыю ў эканоміцы. Пэўныя эканамічныя цяжкасці, звязаныя са спадам попыту на энерганосьбіты, падзеннем цэн на нафту на сусветным рынку, пацягнулі за сабой пэўныя цяжкасці і ў грамадскім развіцці. Гэтымі цяжкасцямі скарыстаўся ідэалагічны праціўнік, які «пасеяў сумненні ў розуме і сэрцах людзей адносна таго, што савецкі лад — найбольш справядлівы і прымальны для асноўнай масы грамадзян».

Нельга не ўлічваць, што з 1946 па 1991 гады працягваўся перыяд «халоднай вайны», калі Савецкі Саюз павінен быў не толькі дапамагаць сацыялістычным краінам, якія ўтварыліся на еўрапейскай прасторы ў пасляваенны перыяд, але і «цягнуць увесь воз праблем і цяжкасцяў па падтрыманні Арганізацыі Варшаўскага дагавору». Вельмі вялікія сродкі затрачваліся і на тое, каб паказаць, што камуністычная ідэалогія сапраўды правільная, яна дапамагае людзям, і савецкім людзям жывецца лепш, чым у іншых краінах. Пазней, праўда, высветлілася, што манаполія на ідэалогію здольная сыграць злы жарт з савецкім ладам. Паколькі кампартыя была адзінай і правячай партыяй, значыць, для тых, хто хацеў зрабіць кар'еру, быў толькі адзін спосаб дасягнуць мэты — прайсці праз кампартыю. Таму ў яе пранікалі і звычайныя кар'арысты, што ў сваю чаргу «ідэалагічна размывала партыю».

Адначасова людзі пераставалі верыць у «пасляваенную пасіянарнасць, якой раней былі напоўненыя нашы лідары, — яна з гадамі сыходзіла, прыходзілі новыя людзі ўжо з абсалютна новым мысленнем». У сярэдзіне 80-х да ўлады прыйшлі людзі, якія свае ўласныя перавагі і ідэалагічныя моманты пачалі прадстаўляць як нацыянальныя інтарэсы. А гэта заўсёды наносіць велізарную шкоду краіне, паколькі не мае нічога агульнага са служэннем свайму народу і сваёй краіне. Трэба сказаць, адзначае Валянціна Лявоненка, і пра ўтрыманскія пазіцыі, якія існавалі ў краіне, таму што сацыяльныя гарантыі разбэшчваюць людзей, асабліва калі яны перавышаюць узровень іх укладу ў эканоміку краіны. І таму добрасумленная праца паступова станавілася непрывабнай. Такая дробнабуржуазная псіхалогія таксама спрыяла распаду краіны.

Палітычныя эліты хацелі быць на той момант галоўнымі ў сваім «удзельным княстве». І Міхаіл Гарбачоў іх не задавальняў. Ім хацелася самім правіць баль у сваіх рэспубліках. І такі пасыл падала Расія. Барыс Ельцын тым, што захацеў РСФСР адасобіць і абвясціць суверэнітэт, паспрыяў таму, што краіна пачала распадацца. «Усё абыгрывалася праз сродкі масавай інфармацыі і праз творчую інтэлігенцыю, — і на месцах, і ў Маскве, — кажа Валянціна Лявоненка. — Паглядзіце, з чаго ўсё пачыналася ў Савецкім Саюзе ў 80-я... Гэта былі нацыянальныя франты. А нацыянальныя франты — гэта прапаганда нацыянальнай культуры, нацыянальнай ідэі, а калі сюды яшчэ дадаць экстрэмізм і радыкалізм, то атрымаем нацыяналізм. І гэты нацыяналізм прывёў шматнацыянальную дзяржаву да краху».

Эканамічна рэспублікі былі цесна спаяныя, і разрыў аказаўся для ўсіх постсавецкіх рэспублік крызісам. Ад канцэнтравання на ім людзей вялі ў бок нацыяналізму. Таму не дзіўна, што нацыяналістычныя рухі, арганізацыі, партыі, якія ўзніклі ў савецкіх рэспубліках, аказаліся на нейкі час каля руля ўлады. Яны павялі свае народы ў будучыню па ўласным уяўленні. «Пагадненні ў Віскулях былі закліканы захаваць рамкі цывілізаванасці. Але далей, у залежнасці ад таго, хто стаяў каля руля, той туды і павёў свой народ». Натуральна, для Беларусі такі разрыў быў вельмі хваравітым, і сваю будучыню Беларусь бачыла ў непарыўнай садружнасці з Расійскай Федэрацыяй, таму і была створана Саюзная дзяржава — блізкі круг постсавецкай прасторы, за якім ідуць ЕўрАзЭС, АДКБ і СНД.

— Мы бачым, што ў 1991 годзе распалася дзяржава, а ў 2011 мы ўжо гаворым пра Мытны саюз, — тлумачыць Валянціна Лявоненка. — Гэта першая спроба на постсавецкай прасторы зноў аб'яднаць рэспублікі, каб захаваць сябе як геапалітычнае ўтварэнне. СНД такую задачу ўжо не здольны вырашыць. Карціна падзей змянілася карэнным чынам... Можна прыгадаць палёт Юрыя Гагарына ў космас, — радавалася ўся краіна, усе народы Савецкага Саюза... Сёння падзеі перажываюцца толькі тымі краінамі, дзе яны адбываюцца. І псіхалагічна, і ў сэнсе падзей мы адарваныя адзін ад аднаго і з цягам часу будзем яшчэ больш аддаляцца.

Таму Мытны саюз застаецца адзіным момантам, які дае магчымасць рэспублікам, у той ці іншай ступені далучаючыся да Мытнага саюза, прыйсці да такога геапалітычнага ўтварэння. Але не трэба забываць, што Захад не жадае дапускаць ніякага новага ўтварэння на постсавецкай прасторы. Нас хочуць разарваць, што бачна па тым, як трактуюцца калапс еўра, фактычна тэхнічны дэфолт у ЗША і тое, што адбываецца ў выніку сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу ў нас.

З геапалітычнага пункту гледжання мы для Расіі — невялікая дзяржава, і мы не ўплываем на лёс свету, але сама Расія здольная аказаць уплыў на развіццё свету. Аднак яна сёння не выконвае гэтай місіі, наканаванай ёй гісторыяй...

Пасля распаду Савецкага Саюза ўтварылася некалькі цэнтраў сілы: гэта ЗША, ЕС, Расія і Кітай. І тут важна, каб Расія сябе паказала. А паказаць яна сябе можа, збіраючы вакол сябе не толькі зацікаўленых партнёраў, але і геапалітычных саюзнікаў. Атрымліваецца ж парадаксальная сітуацыя: саюзнік ёсць, але яго адштурхоўваюць. Незразумела, чаму расійскае кіраўніцтва само па сабе такім чынам не дае магчымасці ажыццявіць сваю місію. Сітуацыя патрабуе добрага асэнсавання...

Святлана БАРЫСЕНКА.

Самы дарагі ўніверсітэт — БДУ, а самы танны — Віцебскі тэхналагічны

Як паведамляе прэс-цэнтр Мінадукацыі, у БДУ першакурснікам, якія паступілі на платнае навучанне, давядзецца заплаціць ад 5 мільёнаў 385 тысяч да 7 мільёнаў 484 тысяч рублёў, у БНТУ — ад 6 мільёнаў 186 тысяч да 6 мільёнаў 428 тысяч рублёў, у БДУІР — ад 5 мільёнаў 400 тысяч да 6 мільёнаў, у БДЭУ — ад 4 мільёнаў 830 тысяч да 5 мільёнаў 27 тысяч, БДПУ імя М. Танка — ад 4 мільёнаў 301 тысячы да 5 мільёнаў 621 тысячы, Міжнародным экалагічным універсітэце імя Сахарава — ад 5 мільёнаў 748 тысяч да 6 мільёнаў 181 тысячы.

Некаторыя іншыя ВНУ ўсталявалі адзіны кошт для ўсіх факультэтаў і спецыяльнасцяў: у прыватнасці, першы курс у БДТУ будзе каштаваць 6 мільёнаў 626 тысяч, у МДЛУ — 5 мільёнаў 12 тысяч, у Магілёўскім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Куляшова — 4 мільёны 450 тысяч, у Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны — 4 мільёнаў 685 тысяч, у Беларуска-Расійскім універсітэце — 5 мільёнаў 100 тысяч, у Магілёўскім універсітэце харчавання — 4 мільёны 350 тысяч, у Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту — 4 мільёны 740 тысяч, Баранавіцкім дзяржуніверсітэце — 4 мільёны 440 тысяч, Вышэйшым радыётэхнічным каледжы — 4 мільёны 110 тысяч. Самым танным з'яўляецца навучанне на першым курсе ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце — кошты тут ад 4 мільёнаў і 3 тысяч да 4 мільёнаў 952 тысяч. Калі казаць пра іншыя рэгіянальныя ВНУ (не ўзгаданыя вышэй), то кошт адукацыі для першакурснікаў там вагаецца ў асноўным у межах 4 мільёнаў рублёў, але даходзіць і да 6: у Полацкім дзяржаўным універсітэце — ад 4 мільёнаў 450 тысяч да 4 мільёнаў 600 тысяч, у Брэсцкім тэхнічным універсітэце — ад 4 мільёнаў 660 тысяч да 4 мільёнаў 980 тысяч, у Гомельскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце імя Сухога — ад 4 мільёнаў 299 тысяч да 4 мільёнаў 698 тысяч, у Мазырскім педуніверсітэце — ад 4 мільёнаў 242 тысяч да 4 мільёнаў 320 тысяч, у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце — ад 4 мільёнаў 865 тысяч да 4 мільёнаў 900 тысяч, у Віцебскім дзяржаўным універсітэце — ад 5 мільёнаў 70 тысяч да 5 мільёнаў 750 тысяч, у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце — ад 4 мільёнаў 128 тысяч да 6 мільёнаў 269 тысяч рублёў.

Таксама адзначаецца, што аплата за 2-5 курсы ВНУ, падначаленых Мінадукацыі, павысілася не больш чым на 20%. Што тычыцца прыватных устаноў адукацыі, то яны фарміруюць цану на платнае навучанне самастойна.

У прэс-цэнтры Міністэрства адукацыі нагадалі, што ўзровень цаны ў кожнай канкрэтнай ВНУ залежыць ад фактычнай структуры выдаткаў на платнае навучанне: ад спецыяльнасці, ад стажу працы прафесарска-выкладчыцкага складу і іншых педработнікаў, ад стану матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Павел БЕРАСНЕЎ.

«ЖАЛЕЗНАЯ» ВАДА — ДЗЕЦЯМ?

Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці знайшлі нямала парушэнняў падчас праверкі рэалізацыі дзяржаўнай і адпаведнай рэгіянальнай праграмы «Чыстая вада».

У прыватнасці, было выяўлена, што ў Талачынскім раёне ў вёсках Слаўнае і Азярцы падчас выканання намечаных у рамках праграмы мерапрыемстваў не зроблены артэзіянскія свідравіны і не пракладзены водаправод. Пры гэтым неэфектыўна выкарысталі сродкі раённага бюджэту — 17,7 мільёна рублёў — на распрацоўку адпаведнай праектна-каштарыснай дакументацыі на будаўніцтва свідравіны ў аграрным гарадку «Слаўнае». І пры падпісанні акта здачы гарадка будаўніцтва свідравіны перанеслі на наступны год. Больш за тое, выяўлена, што з запланаваных да рамонту пяці свідравін у розных вёсках раёна адрамантавалі толькі адну. А астатнія не працуюць, водазабеспячэнне ажыццяўляецца з калодзежаў.

У Віцебскім раёне пры праверцы забяспечанасці насельніцтва вадой высветлілі, што нездавальняюча працуе станцыя па апрацоўцы вады на вадазборы ў гарадскім пасёлку Сураж — калісьці раённым цэнтры. Норма насычанасці жалезам вады перавышана ў два разы.

У Мёрскім раёне ў аграрным гарадку Мікалаева ў пробе водаправоднай вады ў дзіцячым садку кантралёры выявілі, што колькасць жалеза перавышае дазволеную норму ў шэсць разоў.

Па выніках маніторынгу дзве адказныя асобы былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці, як і адна арганізацыя.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Суседзі выратавалі бацьку з сынам

У вёсцы Цыганкі Сенненскага раёна падчас пажару, які адбыўся днём у кватэры двухпавярховага жылога дома, суседзі выратавалі пенсіянера і яго сына. Пенсіянер з моцнымі апёкамі шпіталізаваны. Мяркуемая прычына пажару — неасцярога пры курэнні.

А ў райцэнтры Расоны таксама пенсіянера і яго сына выратавалі пры дзённым пажары жылога дома выратавальнікі. Прычына пажару — аналагічная.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревне Шпаковщина и деревне Узбережье Усяжского сельского исполнительного комитета Смолевичского района Минской области

1	**Форма проведения аукциона**	Открытый
2	**Дата, время и место проведения аукциона**	**8 сентября 2011 года, в 15.00,** пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10 Усяжский сельисполком, кабинет председателя
3	**Продавец и его адрес**	Усяжский сельский исполнительный комитет, пос. Усяж, ул. Комсомольская, 10
4	**Земельный участок, его кадастровый номер и адрес**	Лот № 1 – земельный участок площадью 0,2500 га № 624885607101000171 в д. Шпаковщина; Лот № 2 – земельный участок площадью 0,2500 га № 624885607101000172 в д. Шпаковщина; Лот № 3 – земельный участок площадью 0,2500 га № 624885607101000173 в д. Шпаковщина; Лот № 4 - земельный участок площадью 0,1997 га № 624885606101000006 в д. Узбережье
5	**Условия продажи**	Без изменения целевого назначения
6	**Целевое назначение земельного участка**	Для строительства и обслуживания жилого дома
7	**Начальная (стартовая) цена**	Лот № 1 – 15 468 750 рублей Лот № 2 – 15 468 750 рублей Лот № 3 – 15 468 750 рублей Лот № 4 – 9 588 600 рублей
8	**Условия аукциона**	- продажа по цене не ниже начальной - участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь
9	**Наличие инженерной инфраструктуры**	Д. Шпаковщина – электроснабжение д. Узбережье – электроснабжение
10	**Условия оплаты**	Безналичный расчет в течение 5 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона
11	**Сумма задатка и реквизиты продавца**	10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, р/с 3604627110007 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок)
12	**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками**	Каждая среда в 10.00
13	**Окончательный срок приема документов**	2 сентября 2011 года в 17.00
14	**Контактные телефоны**	8 01776 67 131, 8 01776 67 2 88; 55 342

Расходы по организации и проведению аукциона (лот № 1, № 2, № 3 – по 910 667 рублей, лот № 4 – 605 254 рублей), затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

Заявление на участие в аукционе по установленной форме.

Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.

Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

Чэмпіёнка свету па плаванні Аляксандра ГЕРАСІМЕНЯ:

«Я ГЛЯДЗЕЛА НА ТАБЛО І ДУМАЛА, ШТО Я ВОСЬМАЯ»

Зчэмпіянату свету па водных відах спорту, які завяршыўся ў Шанхаі, беларуская каманда прывезла залаты медаль на бадай самай прэстыжнай дыстанцыі — стаметроўцы вольным стылем. Яго заваявала наша зорка Аляксандра Герасіменя. Апошні раз такі поспех у беларускіх плыўцоў быў у 2003-м, калі чэмпіёнкай свету станавілася Алена Попчанка, якая пасля пераехала ў Францыю. Менавіта з-за прэстыжу дыстанцыі цяперашні поспех Аляксандры параўноўваюць з перамогай на Алімпіядзе ў Афінах у бегу на дыстанцыі 100 метраў Юліі Несцярэнкі. Спартсменка вярнулася ў Мінск і паразмаўляла з журналістамі.

— Пасля таго, як я дакранулася да борціка басейна, я яшчэ доўга не магла зразумець, што адбылося. Магчыма, ад стомы ці ад нечаканасці я доўга глядзела на табло і думала, што я восьмая. Калі зразумела, што я першая, не магу сказаць, што быў вялікі ўсплёск радасці — зноў-такі, напэўна, з-за стомы, — **расказала Аляксандра пра свае першыя ўражанні пасля перамогі.** — Я дагэтуль не ўсвядоміла, што гэта залаты медаль чэмпіянату свету. Калі страсці ўлягуцца і ўсё стане спакойна, мы сядзем дзе-небудзь у кампаніі і абмяркуем вынік. Пакуль я не адчуваю нічога асаблівага.

— Вы скардзіліся на праблемы з акліматызацыяй. У Шанхаі яна праходзіць своеасабліва?

— Зараз, калі самалёт прызямліўся ў Мінску, першае, што мы зрабілі — глыбокі ўдых. І адчулі свежае паветра. Бо ў Шанхаі няма чым дыхаць. Гэта як уваісці ў лазню, у парылку — увесь час даводзілася дыхаць гэтым спякотным паветрам. Акліматызацыя праходзіла цяжка для ўсіх камандаў. Адзін дзень — уздым, на наступны — яма. Мы не маглі гэта ўгадаць, бо мы ў Кітаі толькі другі раз. Плюс да ўсяго акліматызацыя ў нас праходзіла пасля падрыхтоўкі да спаборніцтваў у гарах.

— Гэта самыя складаныя спаборніцтвы ў плане акліматызацыі, дзе вам даводзілася выступаць?

— Мы былі і раней на Усходзе — у Тайландзе, у Пекіне... Але кожны раз арганізм па-новаму адаптуецца.

— Каму прысвяцілі ваш медаль?

— Я пакуль пра гэта не думала. Але мяркую, што можна прысвяціць майму трэнеру (Алене Клімавай. — **Рэд.**). Яна шмат у гэты медаль уклала сіл, здароўя, упартасці. Яна гэтага заслугоўвае.

— Гэта самая значная ваша перамога ў кар'еры, згодны?

— Так, згодная :)

— Да многіх спартсменаў такія перамогі прыходзяць у плаванні ў больш раннім узросце. Вас ужо ледзь не спісвалі з рахункаў, не складана было працягваць?

— Калі дасягаецца нейкі рубеж, паўтараць яго ўжо нецікава. Можна, вядома, пастарацца заваяваць два, тры медалі... Я нават рада, што гэты медаль з'явіўся ў мяне ў такім свядомым узросце, ёсць да чаго імкнуцца і далей, не прападае азарт працаваць.

— Гэтым медалём вы абавязаны вопыту, больш нізкай канкурэнцыі ці чамусьці яшчэ?

— Да гэтых спаборніцтваў мы правялі зусім іншую падрыхтоўку: рызыкнулі і паехалі ў сярэднягор'е, чаго ніколі не рабілі раней. Магчыма, гэта і адыграла сваю ролю. Да таго ж, мы з трэнерам рыхтавалі менавіта стометроўку.

— Наколькі амбіцыйныя задачы вы ставіце перад сабой на Алімпійскія гульні ў Лондане пасля гэтай перамогі?

— У мяне напярэдзе іншы старт, і я пакуль не думаю пра Алімпіяду. Задачы — яны заўсёды былі і будуць самыя высокія. Але на Алімпіядзе гэта будзе надзвычай складана. Калі на такіх спаборніцтвах, як чэмпіянат свету, у лідараў бываюць асечкі, то на Алімпіядзе іх звычайна не бывае.

— У вас былі прапановы змяніць грамадзянства...

— Так, мне паступала такая прапанова з расійскага боку. Мне прапаноўвалі ўдзельнічаць у камбінаванай эстафеце за Расію.

— Чаму адмовіліся?

— Складанае пытанне. Так, мне прапаноўвалі вельмі добрыя ўмовы — і кватэру, і машыну, і зарплату, якая ў дзясяткі разоў перавышае маю цяперашнюю. Напэўна, я пакуль не гатова адказаць на пытанне, чаму адмовілася.

— А што вы сказалі расіянам? Таксама што не гатовы?

— Яны ўсё яшчэ спадзяюцца і чакаюць майго адказу :)

— Ёсць стэрэатып, што на стаметроўцы перамагаюць спартсмены рослыя і магутныя. Гэта відаць і па фотаздымках на п'едэстале, дзе на фоне суперніц вы вельмі вытанчаная...

— Гэта ўсё ж такі стэрэатып, што ўсе хуткія абавязкова павінны быць моцнымі знешне. Са мной побач была спартсменка з Вялікабрытаніі — яшчэ больш дробная, але яна таксама паказала вельмі добры вынік, а летась станавілася чэмпіёнкай Еўропы. Сіла ідзе з галавы. Работа была зроблена немалая, адсюль і вынік.

— Колькі вы займаецеся са штангай, колькі плаваеце? Як пабудаваны ваш трэніровачны працэс?

— Нагрузка залежыць ад перыядаў. На пачатковым перыядзе менш інтэнсіўная, але аб'ёмная праца, перад спаборніцтвамі — спецыфічныя практыкаванні, не аб'ёмныя, але інтэнсіўныя. Але калі я не магу штосьці рабіць, я не гвалтую арганізм. Хоць спорт сам па сабе гвалт над сабой. Калі ідзе асноўная праца, мы праплываем каля 11 кіламетраў у дзень.

— Вы падзялілі першую прыступку на п'едэстале з датчанкай Жанет Оцесен. Не крыўдна?

— Гэтае пытанне турбуе ўсіх навакольных, здаецца, значна больш, чым мяне. Не крыўдна. Першае месца і ёсць першае. Калі гэта два чалавекі, значыць, так і трэба. Раней мы з датчанкай толькі віталіся, а цяпер пасябравалі, паразмаўлялі, павіншавалі адна адну. Увесь п'едэстал быў еўрапейскім, гэта нас таксама вельмі парадавала.

— Вашай кароннай дыстанцыяй былі і 50 метраў на спіне, дзе вы занялі толькі шостае месца...

— Тут я таксама доўга не магла зразумець, што ж адбылося і чаму мяне няма ў першай тройцы :). Так, я расстроілася. Гэтая дыстанцыя была псіхалагічна закладзена, як медальная, і я чакала поспеху. Але, на жаль, не атрымалася. Тут розныя можна шукаць прычыны. Перад гэтым у мяне быў паўфінал на сто метраў, дзе я «заляцела» ў фінал. Я расстроілася пасля 50-метроўкі. Вельмі расстроілася.

— Калі вы «заляцелі» ў фінал на стаметроўцы з восьмым вынікам, як пасля гэтага перажывалі ноч перад фіналам? Пра што размаўлялі з трэнерам, пра што самі думалі?

— З трэнерам я не размаўляла, бо яна ведае, што падчас спаборніцтваў мяне не трэба чапаць. Я сама сябе настроіла. Першае, да чаго імкнулася — не думаць пра няўдачу, якая спасцігла на 50-метроўцы. Зразумела, я разлавалася.

— «На злосці» атрымліваецца плыць лепш?

— Часам, але не заўсёды.

— За восьмы вынік у паўфінале вам дасталася ў фінале восьмая дарожка. Сапраўды так нязручна па ёй плыць?

— На жаль, я не бачыла сваіх суперніц і не магла за імі сачыць. Асаблівасць у тым, што я дыхаю толькі ў адзін бок — у бок дзявятай дарожкі.

— Ваша дасягненне пачалі ставіць на другое месца пасля перамогі на Аліпміядзе Юліі Несцярэнкі. Вы ведаеце, якія прэміяльныя атрымаеце?

— Пакуль не.

— Аляксандра, што вам неабходна для таго, каб на Алімпіядзе выступіць гэтак жа, як і на чэмпіянаце свету?

— Ёсць некалькі пажаданняў. У мяне ёсць праблемы са здароўем, я нават ведаю, як яго паправіць, але гэта каштуе грошай, прычым дастаткова вялікіх. Нават прэміяльных не хопіць, каб гэта аплаціць. Ёсць адзін нямецкі доктар, які можа з дапамогай спецыяльных практыкаванняў паправіць мне спіну і ўсё астатняе. Але гэта каштуе грошай — каля паўтары тысячы еўра. У суткі. Мінімальны курс — пяць дзён, пажадана яго праходзіць пару разоў на год. Хацелася б, каб мне дапамаглі аднавіць здароўе.

У мінскіх басейнах у нас няма нармальных стартавых тумбачак, мы не можам адпрацаваць стартавы адрэзак. Было б выдатна, калі б яны ўсё ж з'явіліся ў нас.

— Аляксандра, а што вы паспяваеце, акрамя спорту? Якім кнігам, музыцы аддаяце перавагу?

— Часу пасля спорту застаецца не так і шмат. Так, з сабой на зборы мы бяром вялікую бібліятэку, каб пачытаць, калі трэба правесці час, а фізічныя дзеянні рабіць немагчыма. Кнігі я люблю, самыя розныя, галоўнае, каб мне было цікава. Паслухаць музыку — таксама святое, асабліва калі добры настрой. А хобі — гэта мая праца.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ГУЛЯЙ, «КРЫЛАТАЯ ПЯХОТА»!

2 ЖНІЎНЯ — галоўнае свята для тысяч сапраўдных мужчын Беларусі, якім давялося служыць у паветрана-дэсантных войсках. Яго адзначаюць як тыя, хто дагэтуль знаходзіцца ў страі — паказальнымі выступленнямі і ўрачыстымі мерапрыемствамі — так і тыя, хто ўжо паклаў свой блакітны берэт на паліцу ў цывільнай шафе — масавымі гуляннямі, купаннем у фантанах і сустрэчамі з былымі аднапалчанамі.

2 жніўня лічыцца днём нараджэння паветрана-дэсантных войскаў таму, што ў 1930 годзе на вучэннях паблізу Варонежа дванаццаць байцоў упершыню ў гісторыі савецкай арміі дэсантаваліся на парашутах. Гэтую падзею лічаць пачаткам службы ПДВ. У гады Вялікай Айчыннай ва Узброеных сілах служылі ўжо дзясяткі тысяч дэсантнікаў. Першай «крылатая пяхота» ўвайшла і ў Афганістан. Гэта асобная гераічная старонка ў гісторыі славутай Віцебскай 103-й паветрана-дэсантнай дывізіі.

Другі жнівеньскі дзень святкуюць і як дзень прарока Ільі.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ДЭСАНТ — УРА!

У Віцебску з размахам адсвяткавалі дзень дэсантнікаў. І невыпадкова, бо менавіта віцебскія дэсантнікі ўпісалі ў гісторыю ваеннага майстэрства свае подзвігі, без перабольшвання віцебскі дэсант ведаюць далёка за межамі краіны. Менавіта дэсантнікі Віцебшчыны першымі ўвайшлі ў Афганістан, аказвалі інтэрнацыянальную дапамогу падчас многіх іншых лакальных ваенных канфліктаў.

Падчас Дня дэсантнікаў і сіл спецыяльных аперацый дэсантнікі для ўсіх жадаючых расчынілі дзверы ў 103-й мабільнай брыгадзе. Цікава, што яшчэ да прафесійнага свята да віцебскіх ваенных прыехалі на экспрэс-стажыроўку дэсантнікі з ЗША.

Па традыцыі падчас свята дэманстравалася ваенная тэхніка. Дзятве дазвалялі залазіць на ваенныя браніраваныя машыны спецыяльнага прызначэння. Салдаты паказалі майстэрства рукапашнага бою. Адбылася дэманстрацыя імправізацыі ваеннага сутыкнення.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» сообщает об изменении с 8 августа 2011 года РАЗМЕРОВ СЛЕДУЮЩИХ ВОЗНАГРАЖДЕНИЙ, ВЗИМАЕМЫХ ПО ОПЕРАЦИЯМ С ИСПОЛЬЗОВАНИЕМ БАНКОВСКИХ ПЛАСТИКОВЫХ КАРТОЧЕК:

Наименование операции	Размер вознаграждения, бел. руб.
Обслуживание в течение срока действия банковских пластиковых карточек ОАО «АСБ Беларусбанк» Maestro, VISA Electron.	10 000
Предоставление держателям банковских пластиковых карточек ОАО «АСБ Беларусбанк» (в т.ч. международных) со счетом в белорусских рублях в банкоматах, инфокиосках банка, посредством системы Интернет-банкинг мини-выписки об операциях, совершенных с использованием карточки или ее реквизитов.	1 000

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.

УНП 100325912.

МОЛАДЗЬ ХОЧА ПРАЦАВАЦЬ У АПК



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

З чаго пачынаецца студэнцкая «кар'ера»? Вядома ж, з іспытаў і ўступнага конкурсу, які сёння крыху нагадвае гульню на біржы, калі абітурыенту трэба ўгадаць, на якую спецыяльнасць яму лепш зрабіць стаўку, каб паступіць на бюджэт. А можа, яна пачынаецца са слёз? З гэтага пытання мы і пачынаем гутарку з адказным сакратаром прыёмнай камісіі Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, дэканам аграмеханічнага факультэта, кандыдатам тэхнічных навук, дацэнтам Віктарам ЛОЎКІСАМ.

— Бываюць розныя слёзы, — расказвае Віктар Баляслававіч. — Слёзы радасці, калі чалавек даведаўся, што паступіў. Але нехта можа па-іншаму выказваць эмоцыі, напрыклад, крыкнуць «ура». Натуральна, бываюць слёзы, калі чалавек не паступіў...

— На вашу думку, па ўступнай кампаніі можна сачыць за дэмаграфічнай сітуацыяй у краіне?

— Так, сёлета меншай была колькасць людзей, якія праходзілі тэсціраванне ва ўніверсітэце, крыху меншы конкурс, што звязана менавіта з тым, што сёлета меншая колькасць выпускнікоў школ. А ў папярэднія гады конкурсы ў нас пастаянна раслі. І тым не менш, сёлета сярэдні конкурс па навучальнай установе даволі добры — больш за два чалавекі на месца. Цалкам закрыты конкурс па мэтавым накіраванні (1,5 чалавека на месца).

— А развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы ўніверсітэта спрыяе таму, што сюды імкнецца паступаць моладзь?

— Універсітэт энергічна развіваецца, за апошнія 5-8 гадоў зроблены сур'ёзны крок наперад.

Што тычыцца абнаўлення матэрыяльна-тэхнічнай базы, варта заўважыць, што мы атрымалі трактары з Мінскага трактарнага завода розных мадэляў, у тым ліку і энерганасычаных. Нядаўна атрымалі два новыя камбайны. У нас створаны вучэбна-выставачны цэнтр (ён размяшчаецца ў асобным корпусе), дзе мы выстаўляем і тэхніку розных прадпрыемстваў. Робім гэта перыядычна, выставы робім па сезонах, па відах работы, якія праводзяцца ў сельскай гаспадарцы. На базе гэтага цэнтра арганізоўваем семінары з рознымі арганізацыямі, у тым ліку з прыцягненнем спецыялістаў АПК праз Міністэрства сельскай гаспадаркі.

На жаль, мы пакуль не можам усіх забяспечыць месцамі ў інтэрнатах (засяляем 80-85 працэнтаў студэнтаў), але ўжо некалькі гадоў адназначна забяспечваем інтэрнатам усіх студэнтаў, якія будуць вучыцца на першым курсе, незалежна ад таго, на платнае ці на бюджэтнае месца яны паступілі.

— Стварэнне аграгарадкоў садзейнічае таму, што моладзь вырашае працаваць у АПК?

— Безумоўна. Да нас прыязджаюць бацькі і пачынаюць гаварыць, што яны альбо з самога аграгарадка, альбо з вёскі, што знаходзіцца недалёка ад яго. Што яны бачаць, што іх дзецям можна і трэба паступаць у ВНУ аграрнага профілю, каб у далейшым вярнуцца працаваць у сельскагаспадарчую вытворчасць. Безумоўна, моладзь не будзе з'язджаць з аграгарадкоў, дзе створаны ўмовы для камфортнага жыцця, ёсць поўны комплекс паслуг, як абавязковых (праведзеная гарачая вада, газ), так і дадатковых (напрыклад, наяўнасць клуба, кінатэатра). Тады мы будзем мець і яшчэ большы конкурс сярод абітурыентаў. Хацелася б, усё ж, каб прафесія інжынера, заатэхніка, ветэрынара, агранома была больш высокааплатнай. Зараз не кожны малады чалавек гатовы да працы ад світання. Асабліва, калі і заробак за яе ніжэй, чым у любога іншага работніка, дзе ў людзей працоўны дзень па 8 гадзін і два выхадныя. Гэта адна з прычын таго, чаму маладыя людзі не застаюцца, пасля таго, як скончыцца тэрмін адпрацоўкі пасля размеркавання.

— Але ж цяпер і ўмовы працы мяняюцца.

— Таму мы і стараемся абнаўляць матэрыяльна-тэхнічную базу, бо пакуль выпускнік трапіць на гаспадарку, там ужо будзе і тая новая тэхніка, якую ён вывучаў. Зараз ідзе энерганасычаная тэхніка з мноствам электронікі, якая знаходзіцца не толькі ў трактарах і камбайнах, але і ў сеялках і іншых агрэгатах. У сувязі з гэтым наш універсітэт адкрыў спецыялізацыю «Электронныя сістэмы і прыстасаванні сельскагаспадарчай тэхнікі», на якую будзе праводзіцца адбор студэнтаў трэцяга курса.

— Ці ставяцца абітурыенты з асцярогай да новых спецыяльнасцяў, якія адкрывае ВНУ?

— Мы адкрываем такія спецыяльнасці, якія з'яўляюцца запатрабаванымі. У асноўным на гэтыя спецыяльнасці конкурс вышэй, таму што гэта той кірунак, які патрэбны для сельскай гаспадаркі, гэта ў будучыні і запатрабаваны спецыяліст, і прэстыж для прадпрыемства, дзе ён будзе працаваць.

— Ці шмат гарадскіх абітурыентаў паступае ў сельскагаспадарчую ВНУ?

— Калі казаць пра мінчан, то іх вельмі мала, тое ж і з абітурыентамі з абласных цэнтраў. Кантынгент у нас у асноўным сельскі ці моладзь з гарадоў, дзе да 20 тысяч колькасць насельніцтва. Гараджане ў асноўным выбіраюць эканамічныя спецыяльнасці.

Але ёсць і такія гараджане, якія хочуць закончыць ВНУ, у тым ліку і на платнай аснове, і стаць інжынерамі. Яны могуць пайсці працаваць у любы аўтапарк, аўтобусны парк. У нас ёсць спецыяльнасць «Праектаванне і вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі», канструктары — дэфіцытная прафесія, на іх вялікі попыт. Гэтая спецыяльнасць дазваляе атрымаць годную высокааплатную працу, застацца ў горадзе. І за такімі спецыялістамі — будучыня. Мы павінны развіваць сваю вытворчасць, а каб мець валюту, то і прадаваць нашу тэхніку за мяжу. З гэтага вучэбнага года мы пачалі праводзіць міжнародную алімпіяду сярод студэнтаў краін СНД. Спонсарамі сёлета выступілі беларускія прадпрыемствы, якія вырабляюць тэхніку, для пераможцаў былі арганізаваны каштоўныя прызы. Усяго ў конкурсе прыняло ўдзел 8 ВНУ з Расіі, Беларусі, Украіны, і каманда нашага ўніверсітэта была на першым месцы.

— Напэўна таму на вашых студэнтаў нядрэнны попыт?

— З працаўладкаваннем нашых выпускнікоў няма праблем, і ў бліжэйшы час не павінна быць. Што тычыцца накіравання на работу, зараз многія вядучыя вытворцы сельскагаспадарчай тэхнікі просяць накіраваць да іх менавіта маладога спецыяліста.

— На якія спецыяльнасці самы вялікі конкурс?

— Як ні парадаксальна, хоць і ідзе шмат інфармацыі, што ўжо ёсць пераносычанасць у спецыялістах эканамічных спецыяльнасцяў, на такія спецыяльнасці, як «эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве» і «менеджмент», самыя высокія конкурсы, больш за 6 чалавек на месца (на астатнія спецыяльнасці — 1,5-2 чалавекі на месца).

— Уступная кампанія нагадвае гульню на біржы?

— Сапраўды, крыху нагадвае, але гэта больш тычылася ўсё тых жа эканамічных спецыяльнасцяў. Што тычыцца тэхнічных спецыяльнасцяў, у апошні дзень тут не было вялікіх змен, а на эканамічныя мы прымалі дакументы да 20.00.

— Але не факт, калі студэнт будзе вырашаць у апошнія гадзіны, куды падаваць дакументы, што ён зможа вылічыць, дзе меншы прахадны бал?

— Так. Калі на спецыяльнасці эканамічнага профілю ўсяго 30 бюджэтных месцаў, за паўгадзіны яны могуць закрыцца вышэйшымі баламі і абітурыент можа не паступіць. Я пажадаў бы абітурыентам, што будуць паступаць у далейшым, не чакаць апошняга часу і паступаць менавіта на тую спецыяльнасць, на якую хочацца, а не туды, дзе магчыма, конкурс меншы.

— Як вы лічыце, магчымасць забраць дакументы пасля таго, як ты падаў — гэта мінус уступнай кампаніі?

— Гэта ўскладняе працу прыёмнай камісіі. Можа, не трэба абмежаванні рабіць 15-й гадзінай, а няхай такім будзе цэлы апошні дзень. У абітурыентаў было дастаткова часу, каб вызначыцца з тым, што ім трэба. Думаю, не павінна быць так, каб абітурыент выбіраў спецыяльнасць толькі кіруючыся тым, дзе конкурс меншы. Яшчэ дапушчальна мяняць кірунак спецыяльнасці, але толькі з-за конкурсу мяняць спецыяльнасць не трэба. Што тычыцца прыёму на платнае навучанне, у нашым універсітэце ён праводзіцца да 4 жніўня ўключна.

— На вашу думку, правільна што ЦТ замяніла экзамены?

— Маё меркаванне — пры правядзенні цэнтралізаванага тэсціравання ёсць аб'ектыўная інфармацыя, усё абсалютна празрыста. Але яно не ўлічвае чалавечы фактар. Калі раней былі ўступныя выпрабаванні (асабліва, калі яны праводзіліся ў вуснай форме), усё ж чалавечы фактар іграў немалую ролю. Напрыклад, гэта тычыцца творчых прафесій (я кажу не пра мастацкія спецыяльнасці — інжынер, канструктар таксама творца ў сваім кірунку). У тэсце складана ўбачыць здольнасці чалавека. Магчыма, павінен быць і такі варыянт, што адзін з профільных экзаменаў праводзіцца ў ВНУ. Тэсціраванне паказвае здольнасць абітурыента правільна рашаць пастаўленыя задачы. Але тут не ўлічваюцца чыста фармальныя памылкі, напрыклад, калі чалавек правёў рашэнне правільна, але ў апошнім дзеянні зрабіў памылку выпадковую. Можа, спяшаўся ці дрэнна сябе адчуваў. Мы бачым у яго працы, што ўсё рабілася правільна і можам гэта адзначыць пры ацэнцы працы.

— Што пажадаеце студэнтам?

— Працаваць і працаваць. Нельга спакойна спачываць ад сесіі да сесіі. Калі студэнт першыя семестры будзе працаваць, выконваць усе патрабаванні выкладчыкаў, будзе вынік. Ад гэтага залежыць, на якую ён пасля трапіць працу. Размеркаванне ў нас ідзе па рэйтынгу, лепшых студэнтаў можам накіроўваць і на працу ў Мінску. Акрамя таго, ад рэйтынгу залежыць, ці атрымаеце вы інтэрнат.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

КАСМАДРОМ «БЕ-LA-РУСІ»

Ужо не першы год праводзіцца міжнародны моладзевы форум «Бе-LA-Русь», натхняльнікамі і арганізатарамі якога з'яўляюцца моладзевыя арганізацыі трох краін: Беларусі, Латвіі і Расіі. Мэтай правядзення гэтага лагера з'яўляецца развіццё пачуцця патрыятызму, умацаванне кантактаў і супрацоўніцтва моладзевых арганізацый. Сёлета форум юбілейны — дваццаты па ліку.

Яшчэ ў далёкім 1959 годзе ў вёсцы Прошкі Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці, на мяжы трох рэспублік, быў насыпаны Курган Дружбы. Там і вырашана было праводзіць моладзевы форум.

Юбілейная сустрэча моладзі Беларусі, Латвіі і Расіі ў гэты раз была прысвечаная году касманаўтыкі, 50-годдзю палёту ў космас Юрыя Гагарына. Таму галоўная паляна, дзе праходзілі агульныя зборы ўдзельнікаў лагера, называлася міжнароднай касмічнай станцыяй (МКС), а палатачныя масівы былі зорнымі гарадкамі. Быў складзены нават спецыяльны слоўнік лагера. Напрыклад, футбольнае поле — гэта «стыковачны модуль», выхад за тэрыторыю паляны — «сустрэча з НЛА», ад'езд з лагера — «адстыкоўка са шлюзавым адсекам МКС». Наогул, усе чатыры дні былі вельмі насычаны разнастайнай і цікавай праграмай. У лагеры прайшлі шматлікія спартыўныя спаборніцтвы — па футболе і валейболе, перацягванні каната і іншыя. Быў запланаваны нават конкурс асілкаў па мяшочных баях, прычым у склад кожнай каманды нараўне з юнакамі абавязкова была ўключана дзяўчына. Традыцыйна прайшоў фотакрос, бітва дыджэяў, конкурс «Бе-La-Рускія світанкі», была абраная лепшая пара лагера. Гэтак жа ўдзельнікі выявілі сябе ў класічным трэнінгу камандаўтварэння «Вяровачны курс», сюжэтна-ролевой гульні-квесце «Наш космас». Самыя спартыўныя і таленавітыя «касманаўты» былі занесеныя ў «Кнігу рэкордаў лагера-2011». Інтэлект таксама не застаўся без увагі — праходзілі конкурсы і прэзентацыі, у тым ліку на лепшае тэматычнае афармленне свайго палатачнага гарадка. Нарэшце, можна было і проста павесяліцца, выбіраючы самага рослага і, наадварот, самага нізенькага ўдзельніка сустрэчы, дзяўчыну з самай доўгай касой. А па вечарах, вядома ж, былі канцэрты, песні ля вогнішча...

Лагер з'яўляецца выдатнай магчымасцю пазнаёміцца адзін з адным, абмяняцца ўражаннямі і досведам, лепш праэумець культуру розных народаў. Нягледзячы на ўсе рэаліі сённяшняга жыцця, правядзенне падобных мерапрыемстваў спрыяе яднанню моладзі розных краін, фарміраванню і развіццю ў маладых людзей талерантнасці, выхаванню іх у духу міра, сяброўства і паразумення.

Такім чынам, чатыры дні і тры ночы над водамі памежнай ракі Зілупе раздаваліся смех і песні моладзі, музыка. Увогуле, каля 650-ці ўдзельнікаў — актыўная, творчая, спартыўная моладзь, а таксама ветэраны моладзевага руху ўшанавалі дваццацігадовы юбілей «Бе-La-Русі», атрымаўшы ўзамен велізарны зарад станоўчых эмоцый.

Ганна БУРАК, студэнтка факультэта журналістыкі Інстытута журналістыкі БДУ.

АБАВЯЗАК І ПАМЯЦЬ

Валанцёрская акцыя «Абавязак і памяць» па навядзенні парадку ў месцах вайсковых пахаванняў праходзіць на гэтым тыдні ў Гродзенскім раёне.

У Астравецкім раёне воіны-памежнікі добраўпарадкавалі брацкія магілы ў вёсках Гудагай і Кемелішкі, а школьнікі — вайсковыя пахаванні Першай і Другой сусветных войнаў у вёсках Кавалёўка, Тартак, Варона і Варняны. Моладзь Іўеўскага раёна прывяла ў парадак тэрыторыю мемарыяльнага комплексу ва ўрочышчы Станевічы. А ў справе добраўпарадкавання тэрыторыі помніка воінам, якія загінулі ў гады Другой сусветнай вайны ў Скідалі, аб'ядналіся працоўныя калектывы горада.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ЮНЫ ФІЗІК З ДУШОЙ ЛІРЫКА

Віцебскі гімназіст Канстанцін Мартынаў, выпускнік гімназіі № 7, стаў пераможцам міжнароднай алімпіяды па фізіцы, якая адбылася ў Бангкоку. Беларусь на гэтай алімпіядзе прадстаўлялі пяць школьнікаў. Чацвёра — з Мінскай вобласці, і толькі адзін з Віцебска. Між іншым, гэтая віцебская гімназія, якую прадстаўляў цяперашні залаты прызёр, знаходзіцца на ўскраіне абласнога цэнтра.

— Усяго ў гэтай алімпіядзе бралі ўдзел, калі не памыляюся, каля чатырохсот чалавек з больш чым васьмідзесяці краін свету. Прыехалі адусюль, акрамя Антарктыды, — расказвае нам Канстанцін Мартынаў. — Раней я не ўдзельнічаў у міжнародных алімпіядах. Безумоўна, прадстаўляць Беларусь, родную Віцебшчыну, для мяне было вялікім гонарам і адказнасцю.

— Заданні для ўдзельнікаў былі складаныя?

— Нельга сказаць, што простыя. Тры тэарэтычныя і два практычныя. У прыватнасці, пры дапамозе маятніка трэба было вызначыць паскарэнне сходнага падзення. Алімпіяда праводзілася ў два туры, кожны з якіх доўжыўся па пяць гадзін.

— А ці быў час пазнаёміцца з гэтым горадам? З Тайландам?

— Так, шмат было экскурсій, шмат прыемных уражанняў. Нам паказалі і храмы, і старую частку горада... Сустрэлі і прымалі вельмі гасцінна. Стараліся, каб мы змаглі, акрамя ўсяго, цікава правесці вольны час.

— Фізікай вы захапіліся, напэўна, з таго часу, як пачалі яе вывучаць?

— Не зусім так. Толькі ў дзявятым класе, калі ў нашу гімназію прыйшла працаваць выкладчык фізікі Алена Аляксандраўна Марудзька. Я ёй вельмі ўдзячны за тое, што яна прывіла любоў да гэтага цікавага прадмета. Яна вельмі добры педагог, шчыра любіць свой прадмет і выкладае яго вельмі цікава. А раней мне больш падабалася матэматыка.

— Вы паступілі ў ВНУ?

— Так. У Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт — на фізічны факультэт.

— Ці ёсць у вас схільнасць да лірыкі? Можа, вершы пішаце?

— Іграю на гітары. Год вучыўся пад кіраўніцтвам вопытнага майстра. Вершы? Не пішу.

— Можа, было ўжо ў вашым жыцці першае каханне?

— Пакуль што не.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

На фота Канстанцін — у цэнтры.

САМ САБЕ РЭЖЫСЁР

Любое свята можна зрабіць небанальным. Трэба толькі не баяцца, што не атрымаецца, што некаму будзе здавацца смешным альбо што ў вас не хопіць ні сіл, ні часу. І не важна, што вы задумалі — сабрацца з сябрамі, наладзіць дзень нараджэння дзіцяці альбо правесці незабыўнае спатканне. Крыху фантазіі, пэўны час на падрыхтоўку — і ўсё атрымаецца... А, каб вам ведаць, з чаго пачынаць, «Чырвонка» падзеліцца некаторымі сакрэтамі...

Калі дзеці становяцца пісьменнымі

— Мама, я запрасіў на свой дзень нараджэння сяброў. Увесь клас! — увёў мяне ў курс спраў мой амаль сямігадовы сынок. Высветлілася, што ён на альбомным лісце напісаў «Запрашаю», пасля дадаў свой хатні адрас і, калі дзяцей прыходзілі забіраць са школы бацькі, проста перагароджваў ім дарогу з гэтым лістом. Ну, што ты зробіш, калі дзіця ўжо стала пісьменным! Тым больш, што запрашэнне ўжо цэлы дзень пакрасавалася на школьнай дошцы, а на ўроку малявання ўвесь клас рабіў віншаванкі для майго імяніннка. Рыхтуемся для прыходу гасцей.

Найперш нам трэба было высветліць, колькі ўсё ж чалавек прыйдзе. Разам з сынам запаўнялі запрашэнні на кожнага малога, дзе пакідалі інфармацыю для бацькоў (наш адрас, тэлефоны і просьбу паведаміць, ці будзе іх дзіця на святе).

Але колькі ўсё ж прыйдзе гасцей, мы даведаліся толькі... за 5 хвілін да прызначанага часу: да нас паступіла яшчэ сем пацвярджэнняў ад бацькоў.

Думаеце, нерэальна патрымацца з 17 першакласнікамі? Ха! У нас і лямпа цэлая, і нават ніводная цацка не паламана! І гэта пры тым, што дзень нараджэння мы наогул ладзілі не з дарослымі сваякамі, а менавіта з дзецьмі ўпершыню! І мы не замаўлялі дадому клоўна, а забаўлялі дзяцей самі.

Уявіце, што ў ваш дом з галёканнем увальваецца натоўп дзяцей і рассыпаецца па кватэры. І яны зусім не збіраюцца сядзець за салодкім сталом — ля яго бываюць толькі набегамі. Напачатку падаецца, што ўсё пойдзе зусім не так, як вы планавалі, і вы будзеце лічыць кожную хвіліну да канца свята. Але калі ў мяне сёння спытаюцца, ці рэальна ў такім вэрхале патрымацца хоць бы... гадзіны 4, адкажу: «Лёгка!». І мяне ўжо не напужаюць спачуванні настаўніцы: «Ну, трымайцеся!» ці папярэджанні бацькоў: «Вы ж там сачыце за нашай Кацяй, яна можа што-небудзь утварыць — напрыклад, учора разбіла нос сваёй сяброўцы»...

Я ведаю, як нейтралізаваць «небяспечныя элементы». Патрэбны ўсяго толькі чароўная скрыначка з білецікамі (на якіх напісаны прызы, што пераможцы конкурсаў выцягваюць як латарэю) ды розная драбяза (алоўкі, сшыткі, шарыкі, размалёўкі, а можа, і якая цацка сярод прызоў, каб стымул быў яе выйграць) — і вы, а не дзеці, кіруеце працэсам.

Напярэдадні свята начамі сядзелі з мужам у інтэрнэце: праглядалі сцэнарыі дзён нараджэння, шукалі конкурсы. Тут можна знайсці ўсё — напрыклад, цалкам распісаную праграму пірацкай вечарынкі. Але ў нас не было часу ні на тое, каб стылізаваць кватэру, ні на тое, каб купіць неабходныя рэквізіты. Таму чаравалі з тым, што ёсць. Прыдумлялі конкурсы, у якіх можна выкарыстаць цацкі, якія ёсць у доме. Нават, здавалася, элементарныя конкурсы ў дзятвы выклікалі захапленне. На хуткасць знайсці ў кучы літары і скласці з іх слова, зрабіць малюнак з завязанымі вачыма, забіць тэніснай ракеткай шарык у кальцо... А вось заданне, якое дапаможа вам хвілін на 20 заняць адразу ўсіх: загадзя па доме расклейце некалькі дзясяткаў наклеек, і няхай дзеці іх адшукаюць. Таму, хто знойдзе больш за астатніх — вядома, прыз. Калі ў вас ёсць набор цацак, што надзяваюцца на руку, можна нават паставіць з дзецьмі спектакль. А пакінутыя на бачным месцы маскі падштурхнуць дзяцей зрабіць цэлую «цыркавую праграму» з выступленнямі дрэсіраваных тыграў і сабачак. Не абысціся без дыскаў з «дзяжурнымі» мультфільмамі. Прычым нашы госці самі падалі ідэю ператварыць пакой у кіназалу — зашторыць вокны, выключыць святло ды ўзяць са стала шкляначкі з папкорнам...

Здавалася, б дробязь — паветраныя шарыкі. Калі іх шмат, то яны могуць добра выручыць вас. Цудоўная рэч — шарыкі, напоўненыя гелем (адна штука каштуе 4-5 тысяч). Вядома, дорага, але, паверце, рэч таго вартая. Дзецям эмоцыі — а вам, пакуль дзеці з імі займаюцца, процьма выйгранага часу. У канцы свята шары можна раздаць кожнаму госцю на памяць альбо напісаць на іх пажаданні і адпусціць у паветра...

Як варыянт — можна запусціць нябесны ліхтарык (нагадвае паветраны шар у дыяметры 60-80 см, каштуе каля 30 тысяч).

Разам з малымі можаце гатаваць пачастунак (конкурс на лепшы бутэрброд і самую цікавую назву), малюйце карты — можна рабіць на вуліцы). Там жа можна правесці конкурс малюнка на асфальце альбо ўспомніць пра гульні свайго дзяцінства — «выбівалы», «гарачую бульбу», «кольца». І галоўнае «не парыцца», што натоўп дзяцей разнясе ваш дом, а разам са сваім дзіцем атрымліваць ад свята задавальненне.

Рамантычнае спатканне

Што падарыць любімаму чалавеку? Як адсвяткаваць дату вяселля (альбо дзень нараджэння)? Альбо як зрабіць прапанову каханай?

З уласнага «вопыту» рамантычных спатканняў магу толькі прывесці начныя прагулкі па Нясвіжы ў пошуках прывіду Чорнай Пані, скачок з парашутам у тандэме. Альбо ўзгадаць, як у час гарадской прагулкі хлопец залез на дрэва і з вышыні на ўвесь горад крыкнуў, што кахае мяне. Альбо як на святкаванне года з нашага вяселля я вышывала сабе і мужу нацыянальныя ўзоры на беларускіх строях. А пасля мы вырашылі ў іх выбрацца ў Лошыцкі парк да заручальнага дуба (на жаль, зараз ад яго застаўся толькі пень, але кажуць, што і ён выконвае жаданне). Прычым калі вы яшчэ ведаеце легенды Лошыцы — рамантычнае мініпадарожжа забяспечана.

Якімі яшчэ могуць быць спатканні, пытаюся ў людзей. З варыянтаў, што прапаноўвалі мінакі, адкінем тыя, што ў час валютнага дэфіцыту і шалёнага росту цэн падаюцца фантастычнымі — купіць пуцёўкі ў экзатычныя краіны, круіз вакол свету, пад'ём на горную вышыню ці гатоўнасць моцнай паловы пусціць увесь свой месячны заробак цалкам на абноўкі ў яе гардэробе (з сучаснымі цэнамі падобны шопінг наўрад ці прынясе даме задавальненне).

Сярод бюджэтных прапаноў для спаткання паступілі наступныя: шпацыр па Батанічным садзе (8 тысяч квіток на чалавека), сеанс у планетарыі альбо веласіпедная прагулка. Больш дарагія варыянты — катанне на конях (45 хвілін занятку па навучанні коннай яздзе з інструктарам — 40 тысяч), скачок з парашутам ці палёт на паветраным шары, водныя падарожжы (яхт-клуб на Мінскім моры, цеплаход у Прыпяцкім нацпарку ці сплаў на байдарках і плытах). Былі і прапановы вывезці дзяўчыну на паляванне (хоць мне здаецца, што больш прыдатным для дам было б наведванне сафары ў Прыпяцкім нацпарку альбо экскурсіі, якія могуць арганізаваць у Бярэзінскім запаведніку, калі з засады назіраеш за дзікімі жывёламі).

Паступіла прапанова і выбрацца ў сядзібу альбо зняць домік у вёсцы (арэнда ў суткі 50-300 долараў). Здавалася б, ну што ў тым рамантычнага? А вось, напрыклад, Вольга Кулікова з захапленнем распавяла пра тое, як ёй хлопец рабіў прапанову на Браслаўскіх азёрах. Маладыя людзі спыніліся ў вясковай хаце, і ім было дазволена пакатацца на гаспадарскай лодцы. «Уявіце, старая драўляная лодачка, якая цячэ і з яе пастаянна трэба вычэрпваць ваду, і вы пасярод незвычайнага возера, з празрыстай вадой (можна разгледзець цэлыя «падводныя лясы» — з дна цягнуцца доўгія, больш за метр расліны)», — дзеліцца Вольга.

Ігар Міхалюк са сваёй дзяўчынай любяць падарожнічаць аўтаспынам: «Рамантыкі хоць адбаўляй. І эканомія відавочная. Дарога нам цалкам бясплатная, і ў дадатак такім чынам можна нават падарожнічаць хутчэй, чым на цягніку. Мы не раз «абганялі» цягнік, што з Мінска ідзе на Сімферопаль. Можам выправіцца ў наблізкі свет наогул без грошай — дзе заробім, спяваючы пад гітару, на вёсцы па гаспадарцы старым часам паможам — нас і пакормяць, і ежы з сабой дадуць».

Вераніка Міронава з Масквы, якая зараз гасцюе ў сваякоў у Беларусі, распавяла, якое незвычайнае спатканне падарыў ёй яе малады чалавек — пачалося ўсё з эсэмэскі на мабільнік, дзе ён папярэджваў аб часе і месцы сустрэчы. Хлопца ў прызначаным месцы яна не сустрэла, але затое было некалькі гадзін прыгод, дзе ёй трэба было разгадваць пэўныя загадкі, ісці па стрэлках. Не абышлося і без букетаў з запіскамі, якія ёй дарылі незнаёмыя людзі, і падарожжа па парку. Абапал сцяжынкі, якая яе нарэшце прывяла да каханага, былі свечкі. Як пазней высветлілася, усё гэта хлопец прыдумаў не сам, а заказаў у спецыяльным агенцтве, якое займаецца арганізацыяй розных рамантычных прыгод і жывых квэстаў (гульня, калі ўсім раздаюцца ролі, і тады «рэальныя» ўдзельнікі — напрыклад, дэтэктыва — павінны разгадваць розныя лагічныя задачкі, плесці інтрыгі, шукаць доказы і гэтак далей).

Нават калі падобныя «рамантычныя спатканні» і пачнуць прадаваць у Беларусі, каштаваць яны будуць не адну сотню «ўмоўных». А што калі паспрабаваць нешта падобнае зрабіць самастойна?

Марына НОВІКАВА.

КАЛІ ПЯСОК АЖЫВАЕ...

Пабачыць гэты незвычайны цуд — «жывыя» малюнкі з пяску — упершыню мне давялося ў тэлеперадачы «Хвіліна славы». Тады я не зусім зразумела, як гэта на экране за долю секунды карцінкі змяняюць адна другую. Прайшоў нейкі час, і вось на адным мерапрыемстве я зноў сустрэла гэты пясочны цуд. Даведацца пра тое, што ж такое на самай справе «пескаграфія» (а менавіта так называецца гэты самы цуд) мне дапамагла Аляксандра Канафальская — майстар гэтай справы. Яна якраз і з'яўляецца адным з тых чараўнікоў, якія са звычайнага робяць незвычайнае.

— Аляксандра, дык усё ж такі, што такое «пескаграфія»?

— Гэта такі новы від мастацтва, які ўзнік недзе каля пяці гадоў таму, сэнсам яго з'яўляецца маляванне пяском па шклу. Кожны мастак называе яго па-рознаму. За мяжой — гэта «сэнтшоу» ці «сэнтарт». А ў нас з'явіўся тэрмін «пескаграфія».

— Раскажыце, як гэтае мастацтва прыйшло ў ваша жыццё?

— Ну, гэта доўгая гісторыя. Усё пачалося яшчэ ў дзяцінстве. Спачатку я марыла стаць балерынай. Але аднойчы зусім выпадкова заехала ў госці да сяброўкі ў мастацкую школу. Пакуль чакала яе, узяла лісток і пачала маляваць. Дырэктар школы ўбачыла і ўжо не адпусціла мяне. Сказала — талент! Але ж увогуле малюю я ўсё сваё жыццё, колькі сама сябе памятаю. Пасля школы паступіла і скончыла педагагічны ўніверсітэт — я настаўнік малявання і чарчэння. Ва ўніверсітэце і ўзнікла наша каманда: Георгій Зельскі, наш рэжысёр (яму і прыйшла гэтая ідэя), Мікалай Пучок, фатограф, і я — выканаўца. Гоша прапанаваў мне паспрабаваць нешта новае. «А чаму не?» — адказала я.

— Можна трошкі больш даведацца пра першае выступленне?

— Дэбют быў прысвечаны Новаму году і выступала я адразу на сцэне Палаца Рэспублікі. На падрыхтоўку нумара ў нас быў толькі тыдзень. Безумоўна, перш за ўсё паўстала пытанне, як жа тэхнічна рэалізаваць наша шоу? Для нумара неабходны спецыяльны стол і штатыў, на якім знаходзіцца камера, каб усё, што я малюю, можно было пабачыць на вялікім экране, а таксама сам рабочы матэрыял — пясок. Тады мы 2008-ы сустракалі. Неяк, шляхам спроб і памылак, мы ўсё ж такі зрабілі канцэртную праграмму. Усё прайшло вельмі прыгожа і добра, нам было вельмі прыемна, незвычайна... Адразу пачалі падыходзіць незнаёмыя людзі, прапаноўваць супрацоўніцтва. А потым усё закруцілася...

— Вось вы казалі, што для выступлення вам неабходны спецыяльны стол, спецыяльны пясок, штатыў. Дзе можна купіць такія рэчы?

— Цікавае пытанне. Не паверыце — мы ўсё зрабілі самі. Цяжкасцю было тое, што на пачатак нашай працы не было ніякай тэорыі пескаграфіі. Таму давялося мысліць лагічна і ствараць.

— А пясок? Я чытала, што для пескаграфіі неабходны нейкі асаблівы пясок, прывезены здалёк...

— Гэта ўсё хлусня, не верце! Пясок самы што ні на ёсць звычайны, наш, беларускі. Бяру яго заўсёды ў адным месцы, потым прасушваю. Праўда, не зусім любы падыходзіць для малявання: трэба, каб ён быў дробны, без каменьчыкаў.

— Яшчэ я чула, што некаторыя майстры выкарыстоўваюць падфарбаваны пясок?

— Бывае. Але я лічу, што калі малюнак сапраўды прыгожы, то і дадаваць да яго нічога не трэба. Гэта як чорна-белы фотаздымак, разумееце? Ён хавае ў сабе нейкую таямніцу. Ды і карціны тады зусім не пясчаныя атрымліваюцца. Некаторыя мастакі яшчэ і лямпачкі рознакаляровыя пад стол прыкручваюць. Навошта — не разумею.

— А пясок можна чым-небудзь замяняць?

— Калі вельмі захацець, можна. У мяне быў такі вопыт. Я малявала з дапамогай кавы, мукі і нават алюмініевай стружкі. Але пясок усё роўна не заменіць ніякі іншы матэрыял.

— Дзе можна пабачыць вашы выступленні?

— Часцей за ўсё мне даводзіцца выступаць на вяселлях, розных карпаратывах. Неяк праз мяне дзяўчыне рабілі прапанову рукі і сэрца. Толькі ўявіце: дзяўчыну запрашаюць у рэстаран. Там быццам зусім выпадкова я забаўляю публіку. Потым пачынаю маляваць гісторыю кахання пары і дзяўчына пачынае разумець, што каханы зрабіў для яе такі незвычайны сюрпрыз і просіць выйсці за яго замуж. Як пасля такога можна адмовіць?

— Вы працуеце толькі ў Беларусі?

— Даволі часта мы бываем у Польшчы. Для мяне было вялікім гонарам выступіць на адкрыцці канцэрта вядомага кампазітара Эніа Марыконе ў Варшаве. Кітай — гэта яшчэ адна краіна, дзе нечакана для самой сябе мне давялося працаваць. Там здымалася рэклама новага аўтамабіля кампаніі «Аўдзі». Па задумцы рэжысёра, машына павінна была ехаць па маёй карціне. Было даволі цяжка, таму што праца патрабавала вялікай акуратнасці. Не менш экзатычнай краінай аказалася Марока. Там здымалі фільм, паводле сцэнара якога галоўная гераіня цікавілася пескаграфіяй. Такім чынам, я яшчэ пабыла і дублёркай. Самае чароўнае ў нашых вандроўках — гэта тое, што заказчыкі знайшлі нас проста праз інтэрнэт. Там паглядзелі мае работы і пажадалі бачыць толькі мяне. Безумоўна, мне прыемна і адначасова гэта вельмі адказна. Але ж я спадзяюся, што гэта яшчэ не апошнія паездкі нашага калектыву, і ўсё самае цудоўнае ў нас яшчэ наперадзе...

Надзея БУЖАН, фота аўтара.

Ногі мужчыны дапамогуць раскрыць яго галоўны сэксуальны сакрэт

Амерыканскія вучоныя заяўляюць, што распаўсюджанае сярод мужчын парушэнне — сіндром неспакойных ног — можа быць важнай прыкметай парушэння эрэкцыі.

Даследаванні праводзіліся 6 гадоў. За гэты час спецыялісты вывучалі 11 тыс. добраахвотнікаў. На момант пачатку маніторынгу ні ў аднаго з іх не было праблем з сэксам. Апроч гэтай групы, навукоўцы назіралі яшчэ прыкладна за 2 тыс. мужчын з парушэннямі эрэкцыі.

Высветлілася, што пры сіндроме неспакойных ног рызыка ўзнікнення эрэктыльнай дысфункцыі павышаецца на 50%. Пры гэтым да ўвагі не бяруцца іншыя фактары рызыкі — храп, алкагольная залежнасць, гіпертанія, атлусценне і дыябет.

Сіндром неспакойных ног заключаецца ў рэзкіх міжвольных рухах ніжнімі канечнасцямі. Асабліва часта гэта праяўляецца падчас сну, калі кантроль за нагамі аслаблены.

У якім узросце жанчынам неабходна піць піва?

Нямецкія спецыялісты раяць жанчынам ва ўзросце пасля 45 гадоў выпіваць па адным літры добрага светлага піва на тыдзень. Гэта дапаможа прадухіліць рэзкае зніжэнне жаночага гармону ў арганізме ў сувязі з узроставымі зменамі.

А вось мужчынам пасля 45 лепш істотна скараціць ужыванне піва (па тых жа прычынах). У мужчын з узростам зніжаецца ўзровень утрымання мужчынскага палавога гармону, а ў піве, як вядома, ёсць фітаэстрагены, якія ў мужчын правакуюць зніжэнне патэнцыі і ўтварэнне «піўнога» жывоціка.

Апроч таго, вучоныя нагадваюць аб верагоднасці развіцця піўнога алкагалізму. Мужчынам нельга выпіваць больш за адзін літр піва ў дзень, піша health.mail.ru, а жанчынам — 0,5 літра. Такая розніца звязана з горшай здольнасцю жаночага арганізма расшчапляць алкаголь.

Небяспечная вада

Брытанскія вучоныя перакананыя, што папулярныя рэкамендацыі па спажыванні не менш за 2 літры вады ў дзень пры прафілактыцы хвароб нырак і для зніжэння вагі — гэта небяспечны міф. Выпіваць трэба не больш за 1,2 літра. Усё, што звыш гэтай нормы, можа выклікаць разлад у арганізме і прывесці да сур'ёзных хвароб, піша inopressa.ru.

На думку Маргарэт Макартні — урача з Глазга, карысная якасць вады моцна перабольшаны і зроблена гэта было па камерцыйным заказе вытворцаў бутыляванай вады. Даследаванне паказала: калі чалавек п'е ваду, не адчуваючы пры гэтым смагі, гэта адмоўна ўплывае на яго здольнасць разважаць. Калі перапіць вады, асабліва на ноч, то гэта выклікае павышаную нагрузку на ныркі.

Ад празмернага піцця можа развіцца рэдкае расстройства — гіпанатрыемія, зніжэнне ўзроўню солі ў арганізме, якое можа выклікаць ацёк мозгу. Апроч таго, цалкам абвергнутая тэорыя аб тым, што, спажываючы ваду ў вялікай колькасці, можна пахудзець. На самай справе ўсё якраз наадварот, заяўляюць навукоўцы.

Гараджане імкліва дурнеюць. Чаму?

Вучоныя прыйшлі да высновы, што жыхары гарадоў губляюць інтэлект і што галоўная прычына дэградацыі — паветра мегаполісаў.

Як сцвярджае utro.ru, даследчыкі не двухсэнсоўна патлумачылі: забруджанае паветра прыводзіць да фатальных змяненняў у мозгу. Пры доўгачасовым уздзеянні атрутнага гарадскога паветра ў людзей значна падае здольнасць да навучання і пагаршаецца памяць.

Апроч таго, узровень забруджвання ўплывае і на псіхалагічныя праблемы. Нездарма ў гарадах значна больш людзей, якія пакутуюць ад дэпрэсіі. Прычына — у якасці паветра, якім дыхаюць гараджане.

Падрыхтавала Іна АРЭХАВА.

ЧАС У ДАСПЕХАХ

Каб трапіць на некалькі стагоддзяў назад, трэба толькі хвілін 15-20. Роўна столькі ў вас зойме дарога ад Мінска да вёскі Астрашыцкі гарадок, дзе размяшчаецца гісторыка-культурны цэнтр «Рыцарскі замак». Атмасфера часоў адважных рыцараў і прыгожых дам аднаўляецца ў былым пансіянаце «Тэатральны». Пакуль будынак выглядае як пашарпанае часам будынак, але гэта толькі звонку, а вы зайдзіце ўсярэдзіну — трапіце ў сапраўдны замак з калонамі, вінтавымі лесвіцамі, вітражамі, ляпнінай, скульптурамі. І гэта толькі пачатак, пэўныя работы па пераўтварэнні будынка ў замак будуць працягвацца да 2015 года. Пад даўніну перарабляюцца інтэр'еры, навакольная тэрыторыя таксама будзе сапраўдным уладаннем рыцараў. Ужо зроблена рысталішча. Плануецца , што ў хуткім часе з'явіцца стрэльбішча, парк асаднай тэхнікі. Тут жа будзе дзейнічаць уласная стайня. У сярэднявечным прыстанку аматары рамантыкі змогуць паназіраць за коннымі паядынкамі рыцараў альбо пакатацца на конях ці ў сярэднявечнай павозцы. І звонку будынак таксама зменіцца, з'явяцца вежы. Плануецца, што будзе і падсветка.

На вуліцы гандлёвых гільдый будуць размяшчацца майстры, гандляры стануць прапаноўваць упрыгожанні, посуд, зброю, даспехі, вопратку. Турніры па стрэлах з лука, ролевыя гульні, фаер-шоу і феерверкі, гістарычныя фестывалі, тэматычныя вечарынкі — такім насычаным будзе жыццё замка. Ды тут ужо шмат чаго робіцца. Гісторыка-культурны цэнтр "Рыцарскі замак" — сумесны праект Міжнароднага грамадскага аб'яднання "Рыцары Утрамера" і Саюза тэатральных дзеячаў, прычым ідэйна натхняецца Аляксеем Дударавым.

Пагрузіцца ў сярэднявечны побыт, святы і забавы, ужо сёння можа любы ахвотны. Тут дзейнічае гасцініца (нумары якой з цягам часу таксама набудуць сярэднявечны інтэр'ер), кухары замка частуюць гасцей стравамі і напоямі, зробленымі ў тым ліку і па старажытных рэцэптах, арганізоўваюцца спецыяльныя праграмы, ладзяцца святы.

— Калі толькі пачыналі займацца рыцарствам, мы не дзялілі людзей на аўтэнтычных і неаўтэнтычных, — заўважае **дырэктар ААТ "Рыцарскі замак" Дзмітрый НЯСЦЮК (магістр Ордэна Паўночнага Храма Гадфруа дэ Манмірайль).** — Зараз назіраюцца тэндэнцыя ў рыцарскім руху Беларусі, якая, на мой погляд, шкодзіць яму. Многія прынялі канцэпцыю сыходу ад сучаснасці, яны хочуць, каб на фестывалях не было гледачоў, каб усё, што тут робіцца, было звязана толькі з сярэднявечнай культурай. Мы лічым, што гэта шлях у нікуды. Калі група, няхай нават добрых рэканструктараў нікому не паказвае свае працы, папулярызацыі ўсяго гэтага не адбываецца. А ўсё што робіцца, ствараецца не толькі для сябе, а і для людзей. Мы ствараем гістарычнае асяроддзе, заснаванае на традыцыях сярэднявечча. Мы хочам, каб гэта арганічна было ўпісана ў нашу беларускую культуру, стараемся як мага болей прыцягваць людзей з розных напрамкаў. Фестываль ладзіцца з прыцэлам на спалучэнне розных культур. У нас заўсёды выступала шмат розных калектываў, і многія з іх не былі звязаны з сярэднявеччам, але арганічна ўпісваліся ў праграму. Напрыклад, людзі з задавальненнем слухаюць песні Аляксандры і Канстанціна. Як можна «адсячы» такія цудоўныя рэчы? Сам замак задумваўся як мультыфестываль, і тут могуць сябе паказаць рэканструктары розных эпох. У Маскве адчыняецца байк-аддзяленне Ордэна Паўночнага Храма. А ў жніўні мы плануем, што ў рыцарскім замку пройдзе першы ў Беларусі сінтэз-фестываль, дзе збяруцца конныя рыцары і байкеры на матацыклах.

Гэта аб'яднанне дзвюх культур: рыцараў двароў і рыцараў сярэднявечча. Байкеры рыхтуюць праграму, яны будуць змагацца з мячамі і коп'ямі ў сярэднявечных даспехах.

Мы не зацыкліваемся толькі на сярэднявечных фестывалях, кожныя 2 тыдні ў нашым замку адбываюцца цікавыя мерапрыемствы, касцюміраваныя вечарынкі, традыцыйныя канцэрты, кінаклуб. Касцюміраваныя мерапрыемствы прываблівающь і рэканструктараў, і ралевікоў, і людзей, якія захапляюцца музыкай. У нас праходзіць шмат мерапрыемстваў, у тым ліку вяселлі і карпаратывы. Рыцарскі замак прыцягвае людзей розных напрамкаў, некаторыя прыходзяць у наш рух. Гэта і ёсць папулярызацыя.

— Атрымліваецца, што пераход рыцарства на камерцыйныя асновы спрыяе яго развіццю?

— Я бы не казаў, што рыцарства пераходзіць на камерцыйную аснову. Пакуль мы не камерсанты, а энтузіясты, бо ўсе тыя сродкі, што зарабляем, укладаем у развіццё. І пакуль гэта больш выдаткі, чым заробкі.

— Рыцарства можна назваць прафесіяй?

— Пакуль наўрад ці. Гэта лад жыцця. А прафесіяй стане тады, калі з'явіцца шмат падобных цэнтраў і людзі пачнуць працаваць у іх на пастаяннай аснове. Але мы, напэўна, першыя, хто спрабуе рыцарства зрабіць прафесіяй. Мы першыя плацім людзям заробак за тое, што яны працуюць у нашым цэнтры.

— Калі не было замка, з якімі праблемамі сутыкаліся рыцарскія клубы?

— З адсутнасцю нармальных пляцовак. Мала памяшканняў, дзе мы маглі б адчуваць сябе спакойна: заўсёды прыходзяць людзі, якія пачынаюць дыктаваць свае ўмовы. Напрыклад, складана працаваць маладым людзям, якія займаюцца рэканструкцыяй, — у Мінску ўсе майстэрні падвальнага тыпу. Майстэрня добра развіваецца, а пасля можа прыйсці адміністрацыя і зачыніць яе, таму што шум некаму перашкаджае. Многія клубы пераходзяць з памяшкання ў памяшканне, іх выганяюць не таму, што яны дрэнныя, а таму, што робяць справу, якая не ўпісваецца ў структуру мегаполіса. Тут нам не трэба азірацца, што нехта прыйдзе і скажа, што шумна тое, што вы робіце, або «выключце электрадрылі і перайдзіце на малаткі і напільнікі» (такое таксама было).

Гэта першая спроба выйсці за межы Мінска. Я лічу, усе традыцыйныя рамёствы сярэднявечча павінны адбывацца больш на прыродзе, чым у горадзе. Тут будуць майстэрні розных кірункаў, ад кузні — да вырабу касцюмаў, даспехаў. Музычныя гурты рэгулярна прыязджаюць сюды, жывуць тут, рэпетуюць.

Пакуль у нас такога няма, як у Еўропе, дзе людзям аддаюць цэнтры, будынкі прама ў горадзе.

— А калі прыязджаюць замежнікі, то ім і паказаць асабліва няма чаго...

— Для таго і ствараем цэнтр. Галоўнае —тут ёсць свабода для творчасці, шмат усяго сабрана ў адным месцы. Гістарычны цэнтр будзе садзейнічаць у тым ліку і папулярызацыі нашай краіны. У Еўропе рыцарскі рух развіваецца з 30-х гадоў, у нас з 90-х.

У нас зараз перыяд станаўлення. Мы ўсе павыраслі. Калі мы толькі пачыналі, нам было па 20-25 гадоў, а зараз па 30-40, многім па 50. Мы пасталелі, шмат што ведаем і ўмеем, разумеем, як трэба рабіць.

— Сёння ў Беларусі прапагандуюцца розныя віды турызму: агра, эка, лясны турызм. А ці можа развівацца і рыцарскі?

— Ён развіваецца. Думаю, у нас з'явяцца і паслядоўнікі. Беларусы шмат чаго ўмеюць і ведаюць, але не могуць правільна прадаць свой прадукт. У нас шмат майстроў, якія робяць шыкоўныя рэчы, сувеніры, касцюмы. Шмат цікавых мясцін і добрая кухня. Але мы не можам гэта падаць. Саромеемся павучыцца ў Еўропе, як гэта робіцца, увесь час шукаем свае спосабы, прыдумляем тое, што ўжо прыдумана. Замест таго, каб выдумляць веласіпед, трэба проста ўзяць яго і паехаць на ім. Таму мы і вырашылі ісці шляхам пракладзеным. Паглядзелі, як у Еўропе адбываецца, бо там напрацаваны багаты вопыт.

— Але ж трэба нечым і адрознівацца?

— Мы і адрозніваемся. Мы арганічна ўбіраем усе дасягненні другіх культур. Беларусы ўспрымальныя, але яны ствараюць шмат свайго, паляпшаюць тое, што ёсць. Хіба гэта не нацыянальная асаблівасць? Можна ўзяць для прыкладу нашы музычныя інструменты.

Не трэба адмаўляць еўрапейскі вопыт. Мы частка вялікай еўрапейскай культуры і не варта адлучаць сябе ад некага, быць у вакууме. Тое ж самае: мы, хто робіць рыцарскі рух, — частка соцыума. Рыцары XXI стагоддзя не павінны адмаўляць нейкія элементы сучаснасці, як і адмаўляць традыцыі. Мы стараемся знайсці нейкі баланс, зрабіць так, каб і традыцыі захаваць, і карыстацца сучаснымі элементамі іх рэканструкцыі.

— Рыцарства мяняецца з цягам часу?

— Па першае, мяняюцца людзі. Па другое, рыцарства, як і любы соцыум, схільнае да ўплыву нейкіх культур і моды. Адзін час модна было рэканструяваць больш маральныя і духоўныя прынцыпы. Цяпер упор робіцца на касцюмы і даспехі. Лічым, што гэта няправільна, трэба ва ўсім прытрымлівацца балансу. Моладзі зараз хацелася баёў. Яны прыдумалі спорт. Не лічу, што гэта добра ці дрэнна. Усё павінна мець сваё месца. Мы займаемся традыцыйнымі рыцарскімі турнірамі. Няхай будзе і спорт, калі гэта камусьці трэба. Галоўнае, каб людзі адзін аднаго не калечылі, усё прыносіла радасць. Мы ўсяляк імкнёмся з нашых радоў выключаць моманты нянавісці і непрыязнасці, мы заўсёды культывавалі братэрскую любоў.

— Як ставіцеся да таго, што сёння турыстычныя кампаніі выкарыстоўваюць рыцараў у сваіх праграмах?

— Нармальна, папулярызацыя гісторыі — асноўная наша мэта. Чым больш усюды будуць запрашаць рыцараў, тым лепш. Я не лічу, што дрэнна, што мы ствараем нейкі міф аб нашай культуры. Можа, тое, што многімі робіцца, да гісторыі не мае дачынення, але для папулярызацыі турызму гэта добра.

— Ці варта весці ў рыцарскія клубы дзяцей?

— Проста неабходна. Гэта толькі ўзбагаціць кругагляд, зробіць чалавека больш выхаваным. У хлопчыкаў развіваюцца мужчынскія якасці, у дзяўчат — жаноцкасць.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

ЗВЕЗДА ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года
выдадзена
Міністэрствам інфармацыі
Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»;
грамадскае аб'яднанне
«Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар
Уладзімір Браніслававіч НАРКЕВІЧ.
Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара
Анатоль СЛАНЕЎСКІ.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон:
292 44 12. e-mail: posts@tut.by;
info@zvyazda.minsk.by.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным
прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД № 02330/0494179
ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 33.380.
Нумар падпісаны ў 19.30 2.08.2011 г.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «ДСТ № 2, Г. ГОМЕЛЬ»

№ лота	Наименование объекта	Адрес объектов продажи	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	Пилорама Р63-4П (инв.№ 21)	г. Речица, ул. Энергетиков, 1	32 233 140	1 611 657
2	Здание растворного узла		28 860 300	1 443 015
3	Аспирационная установка (инв. №23)		6 972 480	348 624
4	Аспирационная установка (инв. №29)		6 972 480	348 624
5	Аспирационная установка (инв. №33)		6 972 480	348 624

Продавец имущества: Управляющий в деле о банкротстве СП «Брювинг Индустри Суплайс-БИС» ООО. Цена указана без НДС. Условия продажи: без условий. Шаг аукционных торгов –5% .
Более подробную информацию об условиях и перечне документов для участия в аукционе можно узнать у организатора торгов ГОУ филиала «Центр «Белтехинвентаризация» по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46 и по тел. 8(0232) 75 06 61, 75 06 63 (факс), WWW. @ BTI.by

Срок подачи заявления, внесения задатка	До 17-00 1 сентября 2011г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46
Дата, время, место проведения аукциона	2 сентября 2011 г. в 11-00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012000511012 в ЗАО «Цептер Банк», ЦБУ 5, г. Минск, ул. Платонова 1б, БИК 153001820, УНП 807000214
Условие продажи	Без условий.
Условие пользования	Объекты продаются в собственность.

Дополнительная информация по тел. (0232) 75 06 61, 75 06 63 (факс)

Генеральны дырэктар
ААТ «Рагачоўскі малочнакансервавы камбінат» Мікалай ЦЕПЛЯКОЎ:

«НАШ КАЛЕКТЫЎ АДКРЫВАЕ НОВЫЯ ГАРЫЗОНТЫ»

ЗНАЁМІМ З СУРАЗМОЎЦАМ

Ураджэнец горада Магілёва, дзе вучыўся ў школе, а затым у тэхналагічным інстытуце, які скончыў у 1987 годзе.

Але так склалася, што ўвесь апошні час (24 гады) працоўная біяграфія Мікалая Ягоравіча звязана з іншым рэгіёнам рэспублікі — Гомельшчынай. Па дзяржаўным размеркаванні малады інжынер трапіў на малочны камбінат абласнога цэнтра, дзе працаваў пэўны час, праяўляючы ініцыятыву і творчае стаўленне да даручанай справы. Што, вядома, было заўважана.

Таму і пачаўся яго ўпэўнены ўзыход па службовай лесвіцы — галоўны інжынер Акцябрскага завода сухога абястлушчанага малака, галоўны інжынер і дырэктар Светлагорскага малочнага завода, генеральны дырэктар абласнога вытворчага малочнага аб'яднання, намеснік старшыні абласнога камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні, генеральны дырэктар абласнога мяса-малочнага аб'яднання. Генеральным дырэктарам Рагачоўскага малочнакансервавага камбіната Мікалай Цеплякоў быў прызначаны летась у маі.

Як бачым, яго працоўная біяграфія звязана пераважна з сельскай гаспадаркай і перапрацоўкай яе прадукцыі. У калектывах, дзе спадар Мікалай займаў адказныя кіруючыя пасады, ён шмат што рабіў і робіць, каб вывесці прадпрыемствы на больш высокі ўзровень. І цалкам заканамернай стала наступная ўзнагарода: дзейнасць Цеплякова нядаўна была дастойна ацэнена. Ва ўрачыстых абставінах у Палацы Рэспублікі ён быў ушанаваны як пераможца конкурсу «Чалавек Справы - 2011» у намінацыі «За актыўнае садзейнічанне развіццю аграрнага сектара Беларусі». Яму была ўручана скульптурная кампазіцыя С. Гумілеўскага «На кані», якая заслужыла рэпутацыю «Оскара» беларускага бізнэсу.

— Мікалай Ягоравіч, мы далучаемся да шматлікіх віншаванняў у сувязі з гэтай адметнай для вас працоўнай перамогай і жадаем, каб і ў далейшым вам спадарожнічаў поспех ва ўсіх справах.

— Дзякую. Хачу ў першую чаргу сказаць, што названаму поспеху садзейнічалі многія фактары, сярод якіх адзначу творчы падыход да сваіх абавязкаў, старанне, ініцыятыву, энтузіязм кожнага члена нашага калектыву.

Без перабольшвання канстатую, што на камбінаце захаваўся кадравы патэнцыял высокакваліфікаваных работнікаў. Мне лёгка працаваць з імі, бо ёсць як прафесійнае, так і чалавечае паразуменне. Як гаворыцца, мы ўсе размаўляем на адной мове.

— А з іншага боку, Мікалай Ягоравіч, існуе такая жыццёвая версія: калі на прадпрыемства прыходзіць новы кіраўнік, дык работнікі яго насцярожваюцца. Маўляў, новая «мятла» па-новаму мяце... Якую пазіцыю вы займаеце ў гэтым пытанні?

— Абсалютна зразумелую. Вышэйстаячыя арганізацыі паставілі перад калектывам канкрэтную задачу: правядзенне далейшай мадэрнізацыі вытворчасці, заняцце лідзіруючых пазіцый у галіне. Я — прыхільнік планавай работы з кадрамі, прыхільнік арганізацыі такой працы, каб кожны чалавек праявіў усе свае здольнасці.

Асобна хачу падкрэсліць наступнае. Сваю першую прадукцыю камбінат вырабіў у 1938 годзе. Гэта сведчыць аб тым, што ён — адзін са старэйшых прадпрыемстваў у галіне са сваімі традыцыямі, якія складаліся дзесяцігоддзямі. Доўгі час яго кіраўнікамі былі Леанід Архіпавіч Канавалаў і Барыс Мяфодзьевіч Рэва — людзі вялікага жыццёвага вопыту, якія многае зрабілі для развіцця вытворчасці. Не падумайце, што хвалюся, калі скажу, што я прыйшоў у калектыў, каб працягваць традыцыі, якія былі закладзены раней. Спадзяюся, што мой вопыт працы на іншых прадпрыемствах мне ў гэтым дапаможа.

— У сувязі са сказаным нельга не нагадаць наступныя факты, якія нам запомніліся, калі мы ў мінулыя гады расказвалі аб працы вашага калектыву. Маем на ўвазе выпадкі падробак вашай прадукцыі некаторымі расійскімі прадпрыемствамі і пісьмы-падзякі жыхароў расійскіх рэгіёнаў, якія купляюць малочныя тавары Рагачоўскага камбіната.

— Зразумеў вас. З падробкамі нашай згушчонкі, якія працягваюцца і зараз, мы сутыкнуліся чатыры гады таму, і тыя падробкі сведчаць аб папулярнасці нашай прадукцыі. У адрозненне ад іншых вытворцаў, яна вырабляецца пад строгім кантролем дзяржавы, па ДАСТах былога Савецкага Саюза, з выключным выкарыстаннем натуральнай, экалагічна чыстай сыравіны. Таму попыт на нашу прадукцыю не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі стабільна высокі.

Звыш 70 працэнтаў яе мы экспартуем у Расію, Казахстан, Азербайджан, Туркменістан, Малдову, Грузію і г.д. Летась адкрылі для сябе рынак Украіны. Ёсць задумка папрацаваць з краінамі Блізкага Усходу. Доследную партыю малочных тавараў адправілі ў Манголію, робім «разведку» ў такіх краінах, як Кітай, Ізраіль і іншыя.

— Усё гэта выдатна, Мікалай Ягоравіч. Але згадзіцеся, што тыя падробкі могуць адмоўна адбіцца на іміджы вашага прадпрыемства...

— А мы ўжо навучыліся змагацца з тымі фальсіфікатарамі. Адных строга папярэджваем, іншых прыцягваем да судовай адказнасці. Апрача таго, дапамагае метад ціснення: на донцы нашых бляшаных слоікаў вы можаце ўбачыць словы «Беларусь, Рагачоў», — а гэта складана зрабіць у невытворчых умовах. Тое самае і з нумарамі слоікаў. Прымаем і іншыя захады супраць нядобрасумленных канкурэнтаў.

— Вось зараз многія прадпрыемствы рэспублікі адчуваюць цяжкасці з валютай. А як у вас?

— Мы — адно з валютаёмістых прадпрыемстваў сваёй галіны, уваходзім у пяцёрку экспарцёраў, бо калектыў заўсёды (і ў гэтым яго адна з традыцый) стараўся ісці на крок наперадзе іншых. Таму праводзілі і праводзім вялізную работу па тэхнічнай мадэрнізацыі вытворчасці. За апошнія гады, напрыклад, на кожным участку, у кожным цэху абнавілі абсталяванне з такім разлікам, каб павялічыць выхад прадукцыі з адной тоны перапрацаванай сыравіны, палепшыць яе якасць.

«Оскар» беларускага бізнэсу — скульптурная кампазіцыя С. Гумілеўскага «На кані»

Апошняму пытанню — асаблівы клопат. Сёння на прадпрыемстве пашыраецца ўкараненне сістэмы менеджменту якасці вытворчасці малочных кансерваў на адпаведнасць міжнародным патрабаванням СТБ ISO 9001 і сістэмы HACCP. Калі раней апошняя дзейнічала пры вытворчасці дзіцячага харчавання, то зараз яна распаўсюджваецца і на сухое малако і кансервы. А гэта значыць, што мы пашыраем вобласць сертыфікацыі.

— Мы ведаем, што вы і надалей мяркуеце павялічваць вытворчыя магутнасці, вырабляць больш прадукцыі...

— Не мяркуем, а ўжо рэалізоўваем гэтыя планы. У Буда-Кашалёва ёсць наш філіял — сырзавод магутнасцю 6 тон у суткі. Ведаючы сітуацыю з гэтым відам прадукцыі на сусветным рынку (стабільную яго даходнасць), мы ў Рагачове пачалі будаўніцтва цэха па вытворчасці цвёрдых сыроў (20 тон у суткі). Першая прадукцыя павінна выйсці ў снежні 2012 года. Абсталяванне будзе набыта ў адной вядомай у Еўропе аўстрыйскай фірме, і адначасова будуць выкарыстаны новыя будаўнічыя матэрыялы.

Планы далейшага развіцця вялікія. Мы сур'ёзна працуем з нашай сыравіннай базай. У вышэйназваным філіяле арганізавалі вытворчасць заменнікаў цэльнага малака для сельгаспрадпрыемстваў Чачэрскага, Кармянскага, Буда-Кашалёўскага, Рагачоўскага і часткова Жлобінскага раёнаў. А ў Карме створана сумеснае прадпрыемства (з Расіяй) па вырабе кампанентаў для заменнікаў цэльнага малака. Адным словам, адкрываем для сябе новыя гарызонты.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

УНН 400046241

ААТ «Рагачоўскі МКК»
Гомельскай вобласці
г. Рагачоў, вул. Кірава, 31
Тэл. (+375 2339) 2-54-24
www.rmkk.by

Суседзі

МОВАЙ МАСТАЦТВА

Тое, што не заўсёды ўдаецца дзяржаўным дзеячам, ажыццяўляецца мовай мастацтва. Гэта пацвердзіў чарговы, XVIII фестываль польскай і беларускай песні «Беласток—Гродна».

Больш за 300 артыстаў аматарскіх калектываў прыехалі на свята ў Беластоку, аб арганізацыі якога паклапаціліся Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў Польшчы, пасольства і Культурны цэнтр Беларусі ў суседняй краіне, а таксама ўпраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама. Згодна з канцэпцыяй фестывалю, Гродзеншчыну прадстаўлялі польскія калектывы (з Лідчыны, Шчучына, Слоніма, Гродзенскага і Бераставіцкага раёнаў), а Падляскае ваяводства — беларускія. Прычым у фестывальным канцэрце ўдзельнічалі і дзіцячыя ансамблі.

Дарэчы, памежнае свята не абмежавалася спевамі і танцамі. Былі наладжаны выставы твораў майстроў народных рамёстваў, а таксама кніг беларускіх пісьменнікаў і паэтаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Сёлета ў сталіцы амаль 10 тыс. кватэр затапілі суседзі зверху

За першае паўгоддзе ў жыллёвыя службы сталіцы паступіла 9 879 заявак у сувязі з затапленнем з вышэйразмешчаных кватэр. Больш за ўсё — у Першамайскім і Маскоўскім раёнах, паведамілі ў ГА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» (МГЖГ). За гэты ж перыяд зарэгістраваны 2352 затапленні з даху і 1014 — праз стыкі сценавых панэляў. У МГЖГ адзначылі, што ў любым выпадку працечка павінна быць ліквідавана ў дзень паступлення заяўкі ў жыллёвую службу.

Аляксандр ФІЛІПОВІЧ,
«Мінск—Навіны».

Срэбныя вершнікі

На міжнародным конным турніры, што адбыўся ў Ратамцы ў мінулыя выхадныя, зборная Беларусі ў Кубку нацый па канкуры заняла другое месца. 16-гадовая мінчанка Валерыя Вяроўка заваявала два залатыя і адзін сярэбраны медалі.

За перамогу ў Кубку нацый змагаліся спартыўныя пары (вершнік + конь) пяці краін: Беларусі, Латвіі, Літвы, Расіі і Эстоніі. Расіяне прыехалі наймацнейшым складам — золата заваявалі яны. За срэбра нашым вершнікам давялося добра папрацаваць. У першым гіце наш лідар Васіль Іваноў на Алексе і астатнія беларускія спартсмены зарабілі 24 штрафныя. А на другім — толькі чатыры. У выніку наш беларускі квартэт Васіль Іваноў, Ібрагім Васькоў, Ягор Мароцкі і Максім Крына атрымалі срэбра ў Кубку нацый па канкуры (пераадольванні перашкод), саступіўшы першае месца зборнай Расіі.

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ, фота аўтара.



ЗУБЫ НА ЭКСПАРТ

У сувязі з тым, што ў Латвіі і Літве не хапае стаматолагаў і паслугі на лячэнне і пратэзаванне вельмі дарагія, у прыгранічных з Еўрасаюзам раёнах Віцебшчыны актывізуецца экспарт стаматалагічных паслуг.

— Іншаземцам вельмі выгадна прыязджаць да нас. Мы прааналізавалі кошт паслуг. Дык вось, у Літве цэны ў тры разы большыя, чым у нашых платных кабінетах, — расказвае «Звяздзе» Васіль Варганаў, галоўны ўрач Віцебскай абласной стаматалагічнай паліклінікі. — І нам вельмі выгадна, каб грамадзяне гэтых краін прыязджалі на лячэнне ў Паставы, Браслаў ці Глыбокае. Тым жа літоўцам выгадна прыехаць на лячэнне ды яшчэ і адпачыць заадно. Іншаземцы аплачваюць лячэнне па цане прыкладна ў два разы большай, чым грамадзяне Беларусі. За кошт экспарту паслуг набываецца новае абсталяванне, паляпшаецца матэрыяльна-тэхнічная база беларускіх стаматалагічных клінік.

Як расказаў галоўны ўрач паліклінікі, сёлета на экспарце стаматалагічных паслуг ужо зарабілі каля 17 мільёнаў рублёў.

— Шмат грамадзян Расіі прыязджаюць у Прыдзвінскі край, каб трапіць на прыём да нашых спецыялістаў, — працягвае галоўны ўрач. — У той жа Маскве вельмі дарагія візіты да стаматолагаў. Таму жыхарам гэтага мегаполіса таксама вельмі выгадна лячыць і пратэзаваць у нас зубы.

Віцебшчына, дарэчы, першай пачынала ў краіне аказваць платныя стаматалагічныя паслугі — яшчэ ў 1996-м годзе. Летась платных паслуг аказана на агульную суму прыкладна 13,5 мільярда рублёў. І штогод гэтая сума павялічваецца — прыкладна на два мільярды рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Дэфіцыт — цыбуля, зубная паста?

Камітэтам дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці арганізавана «гарачая лінія», патэлефанаваўшы на якую можна паведаміць аб фактах адсутнасці ў продажы тавараў, праінфармаваць аб тым, ці дастаткова тавараў і прадуктаў у крамах. Неабходнасць работы «гарачай лініі» пацвярджаецца тым, што, аказваецца, дэфіцытнымі неўзабаве могуць стаць цыбуля, часнок, зубная паста і іншае.

Нядаўна падчас правядзення маніторынгу супрацоўнікі камітэта ўстанавілі, што нярэдка ў крамах і гэтак далей не прадаюць тыя тавары, якія абавязкова павінны быць у продажы. Вось у глыбінцы, у вёсцы ля райцэнтра Шуміліна, у краме раённага спажывецкага таварыства на момант праверкі адсутнічалі тавары, прадугледжаныя асартыментам: цыбуля, часнок, яблыкі, зубная паста, сшыткі для малявання і іншыя.

А ў вёсцы Пірагі Дубровенскага раёна немагчыма было купіць мармелад, зефір, рыбу... Дарэчы, у вышэйназваным раёне кантралёры выявілі парушэнні правілаў ажыццяўлення гандлю ва ўсіх крамах, дзе пабывалі. У пяці з шасці праверaных аб'ектаў гандлю рэалізоўваліся тавары, дапушчальны тэрмін годнасці некаторых з іх скончыўся больш за дзесяць месяцаў таму.

Па выніках маніторынгу 12 парушальнікаў былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КАНДЫТАРСКАЯ ГАЛІНА АБНАЎЛЯЕЦЦА

У перыяд ажыятажнага попыту на пэўны асартымент тавараў прадпрыемствы канцэрна «Белдзяржхарчпрам» забяспечылі бесперабойную пастаўку прадукцыі. Так, за паўгода на ўнутраны рынак было пастаўлена 228 тыс. т цукру (121 працэнт да аналагічнага перыяду мінулага года), кандытарскіх вырабаў — 37 тыс. т (105 працэнтаў), солі — 43 тыс. т (130 працэнтаў), алею — 10,4 тыс. т, гарэлкі і лікёрагарэлачнай прадукцыі — 6090,2 тыс. дал (110 працэнтаў). Вырас выраб дзіцячага харчавання з плодаагародніны, сухіх малочных сумесяў для дзіцячага харчавання, а таксама тытунёвых вырабаў, гаспадарчага і туалетнага мыла.

Як паведамляюць у канцэрне, сёлета за пяць месяцаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года знізіўся імпарт кандытарскіх вырабаў, маргарыну, маянэзу, туалетнага і гаспадарчага мыла. Дэвальвацыя найбольш моцна паўплывала на вынікі фінансава-гаспадарчай дзейнасці арганізацый цукровай галіны. У першым паўгоддзі яна не забяспечыла неабходнага экспарту прадукцыі і сальда знешняга гандлю. 440 тыс. т цукру плануецца рэалізаваць сёлета на ўнутраным рынку і прыкладна столькі ж адправіць на экспарт.

Не забяспечыла належнага экспарту тавараў і кандытарская галіна. Аднак у бліжэйшы час прадпрыемствы кандытарскай галіны павінны нарасціць магутнасці па мяккіх цукерках, пячэнні, зефіры і мармеладзе.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» нарошчвае экспарт

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне, згодна з якім за высокія дасягненні ў выкананні асноўных прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі калектыву работнікаў ААТ «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман» аб'яўлена Падзяка Прэзідэнта.

Сваё 150-годдзе прадпрыемства сустракае ў ліку дзесяці буйнейшых падаткаплацельшчыкаў краіны, што дасягаецца працай не толькі на айчынным, але і на замежных рынках. Зацікаўленасць у прадукцыі, якая вырабляецца на самым сучасным абсталяванні, узрастае і ў блізкім, і ў далёкім замежжы. І гэта пацвярджаецца канкрэтным вынікам: экспарт гродзенскіх тытунёвых вырабаў за першае паўгоддзе ў параўнанні з леташнім паказчыкам павялічаны ў 5,2 раза.

Валюты на экспартных пастаўках зарабляецца ўсё больш, аднак для набыцця імпартнай сыравіны ў цяперашніх умовах яе не хапае. Таму падтрымку фабрыцы, з дазволу кіраўніка дзяржавы, аказвае ААТ «Гродна Азот»: галоўны экспарцёр вобласці прадае па курсу Нацыянальнага банка зароблену на экспарце валюту галоўнаму падаткаплацельшчыку Прынямоння.

З разуменнем ставяцца да сённяшніх беларускіх рэалій і замежныя партнёры тытунёвай фабрыкі «Нёман». Некаторыя з іх, ставячы доўгатэрміновыя мэты вышэй за імгненную кан'юнктуру, згаджаюцца працаваць без папярэдняй аплаты, прадастаўляюць адтэрміноўку плацяжоў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА «МНОГОКВАРТИРНЫЕ ЖИЛЫЕ ДОМА №№ 40А, 40Б (ПО ГЕНПЛАНУ) В МИКРОРАЙОНЕ КАМЕННАЯ ГОРКА-5 СО ВСТРОЕННО-ПРИСТРОЕННЫМИ ПОМЕЩЕНИЯМИ ПО УЛ. ПРОЕКТИРУЕМОЙ № 3»

Информация о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «ИНТЕХНОСТРОЙ», зарегистрированное решением Минского горисполкомом от 17 июля 2003 г. № 1183 (регистрационный номер № 100980743), расположенное по адресу: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Сторожевская, дом 8, помещение 9; принимавшее участие в строительстве крупнопанельного пятисекционного 9-этажного многоквартирного жилого дома № 8 (по генплану) по ул. Матусевича (микрорайон «Масюковщина-5») в городе Минске (режим работы: понедельник—пятница с 9.00 до 17.30, обеденный перерыв с 13.00 до 13.30).

Информация о проекте строительства:

1. Цели проекта: строительство жилых домов.

2. Этапы строительства: отсутствуют.

3. Сроки реализации строительства: июль 2011 года – сентябрь 2012 года.

4. Сведения о прохождении государственной экспертизы: заключение ДРУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» № 371-60/11 от 29.04.2011.

5. Сведения о месте нахождения строящегося дома и его характеристики: строящиеся жилые дома будут располагаться в микрорайоне Каменная горка-5 по ул. Проектируемой № 3 и иметь следующие характеристики:

Дом 40А (по генплану):

• серия дома: М 111-90;

• количество квартир: 108, в том числе 22 однокомнатных, 32 двухкомнатных, 35 трехкомнатных и 19 четырехкомнатных;

• количество подъездов: 3;

• количество этажей: 9;

• остекление лоджий: да;

• технический этаж – да;

• лифты – да;

• помещения для стоянки и хранения автомобилей и мотоциклов - нет;

• погреба – да (во всех квартирах первого этажа);

• кладовые – нет;

• помещения для размещения штатных работников товарищества собственников – нет;

• магазины, другие помещения – нет;

• объекты недвижимости, связанные с многоквартирным жилым домом, относящиеся к нему в соответствии с проектной документацией на данный дом и расположенные на одном земельном участке, предоставленном для его строительства, включая элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, в том числе стоянка, иные отдельно стоящие объекты для целевого использования многоквартирного жилого дома, стоимость или частичная стоимость строительства которых включена в цену договора создания объекта долевого строительства: внутриквартальные инженерные сети электро-, тепло-, водоснабжения, канализации, связи, телефикации, радиофикации; объекты благоустройства и озеленения территории.

Дом 40Б (по генплану):

• серия дома: М 464-9-У1;

• количество квартир: 217, в том числе 50 однокомнатных, 69 двухкомнатных, 98 трехкомнатных;

• количество подъездов: 6;

• количество этажей: 9;

• остекление лоджий: да;

• технический этаж – да;

• лифты – да;

• помещения для стоянки и хранения автомобилей и мотоциклов – нет;

• погреба – да (во всех квартирах первого этажа);

• кладовые – да (в трехкомнатных квартирах);

• помещения для размещения штатных работников товарищества собственников – да;

• магазины, другие помещения – 8 встроенно-пристроенных административных помещений (первый этаж, 3-6 подъезды);

• объекты недвижимости, связанные с многоквартирным жилым домом, относящиеся к нему в соответствии с проектной документацией на данный дом и расположенные на одном земельном участке, предоставленном для его строительства, включая элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, в том числе стоянка, иные отдельно стоящие объекты для целевого использования многоквартирного жилого дома, стоимость или частичная стоимость строительства которых включена в цену договора создания объекта долевого строительства: внутриквартальные инженерные сети электро-, тепло-, водоснабжения, канализации, связи, телефикации, радиофикации; объекты благоустройства и озеленения территории.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства в данном многоквартирном жилом доме предлагается 50 квартир по цене одного квадратного метра общей площади **6 500 000 белорусских рублей (однокомнатные и двухкомнатные квартиры) и 6 200 000 белорусских рублей (трехкомнатные и четырехкомнатные квартиры)**.

Уплата цены договора производится дольщиком поэтапно в установленный договором период по графику платежей. Дольщику в индивидуальном порядке может предоставляться скидка от общей стоимости объекта долевого строительства.

Соглашением сторон может быть предусмотрена единовременная уплата цены договора дольщиком не позднее 5 (Пяти) календарных дней с даты его подписания с одновременным предоставлением дольщику скидки, устанавливающей уменьшение цены одного квадратного метра общей площади объекта долевого строительства до **5 500 000 белорусских рублей (для квартир всех типов).**

6. Данные о правах застройщика на земельные участки и их площади: составленные РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков от 09.07.2011 №№ 500/907-4005 (участок площадью 1,9628 га с кадастровым номером 500000000006006185 на период строительства объекта), 500/907-4006 (участок площадью 0,3512 га с кадастровым номером 500000000006006186 для строительства и обслуживания жилого дома № 40Б), 500/907-4007 (участок площадью 0,1900 га с кадастровым номером 500000000006006187 для строительства и обслуживания жилого дома № 40А). Право собственности: правообладатель Республика Беларусь, право пользования: правообладатель ООО «ИНТЕХНОСТРОЙ».

Границы земельных участков: ограничены с севера – ул. Казимировской; с юга – сопредельным участком для строительства детских яслей-сада на 230 мест с бассейном, с запада – сопредельным участком для строительства общеобразовательной школы на 1020 учащихся; с востока – сопредельным участком для строительства многоквартирных жилых домов № 16, 17 (по генплану).

Благоустройство: две автомобильные стоянки по 50 машино-мест, плиточное покрытие, детская площадка, озеленение территории с установкой малых архитектурных форм.

7. Количество самостоятельных частей в жилом доме, передаваемых Застройщиком Дольщикам после утверждения акта приемки в эксплуатацию жилого дома: 50 квартир.

8. Нежилые помещения, не входящие в состав общего имущества: 8 встроенно-пристроенных административных помещений (первый этаж, 3-6 подъезды) в доме № 40Б (по генплану).

9. Состав общего имущества: лифтовые, мусоропроводные камеры, электросчетовые, общие коридоры, лестницы и межлестничные площадки, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся внутри жилых или нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, благоустройства и озеленения.

10. Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию: сентябрь 2012 года.

11. Сведения о договоре строительного подряда: договор от 12.07.2011 № 61/05-11, заключенный ООО «Интехнострой» (Заказчиком) с ОАО «МАПИД» (Генподрядчиком).

Условия ознакомления дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: по согласованию с Застройщиком, в установленное им время и в присутствии его ответственного представителя, с соблюдением требований техники безопасности. Также с объектом долевого строительства можно ознакомиться в офисе уполномоченного представителя Застройщика: ЧРУП «Вива Консалт» (торговая марка ViVa Invest), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Б. Хмельницкого, д. 7, офис 302 (тел. 8-017-2-900-901, 8-029-1-907-901) или на сайте vivainvest.by.

Директор В.В. Расолько

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА «СТРОИТЕЛЬСТВО МНОГОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА ПО УЛ. АУЭЗОВА, 8»

Информация о застройщике:

Общество с ограниченной ответственностью «ИНТЕХНОСТРОЙ», зарегистрированное решением Минского горисполкомом от 17 июля 2003 г. № 1183 (регистрационный номер № 100980743), расположенное по адресу: 220002, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Сторожевская, дом 8, помещение 9; принимавшее участие в строительстве крупнопанельного пятисекционного 9-этажного многоквартирного жилого дома № 8 (по генплану) по ул. Матусевича (микрорайон «Масюковщина-5») в городе Минске (режим работы: понедельник—пятница с 9.00 до 17.30, обеденный перерыв с 13.00 до 13.30).

Информация о проекте строительства:

1. Цели проекта: строительство жилого дома.

2. Этапы строительства: отсутствуют.

3. Сроки реализации строительства: август 2011 года – июнь 2012 года.

4. Сведения о прохождении государственной экспертизы: заключения ДРУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» от 20.04.2011 № 326-60/11 и от 14.05.2011 № 331-60/11.

5. Сведения о месте нахождения строящегося дома и его характеристики: строящийся жилой дом будет располагаться в микрорайоне Чижовка по ул. Ауэзова и иметь следующие характеристики:

• серия дома: М 111-90;

• количество квартир: 132, в том числе 57 однокомнатных, 57 двухкомнатных, 18 трехкомнатных.

• количество подъездов: 1;

• количество этажей: 19;

• остекление лоджий: да;

• технический этаж – да;

• лифт – да;

• помещения для стоянки и хранения автомобилей и мотоциклов – нет;

• погреба – да (во всех квартирах первого этажа);

• кладовые – да (в трехкомнатных квартирах);

• помещения для размещения штатных работников товарищества собственников – да;

• магазины, другие помещения – нет;

• объекты недвижимости, связанные с многоквартирным жилым домом, относящиеся к нему в соответствии с проектной документацией на данный дом и расположенные на одном земельном участке, предоставленном для его строительства, включая элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, в том числе стоянка, иные отдельно стоящие объекты для целевого использования многоквартирного жилого дома, стоимость или частичная стоимость строительства которых включена в цену договора создания объекта долевого строительства: внутриквартальные инженерные сети электро-, тепло-, водоснабжения, канализации, связи, телефикации, радиофикации; объекты благоустройства и озеленения территории, повысительная насосная станция.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства в данном многоквартирном жилом доме предлагается 25 квартир по цене одного квадратного метра общей площади **6 200 000 белорусских рублей (однокомнатные двухкомнатные и трехкомнатные квартиры)**.

Уплата цены договора производится дольщиком поэтапно в установленный договором период по графику платежей. Дольщику в индивидуальном порядке может предоставляться скидка от общей стоимости объекта долевого строительства.

Соглашением сторон может быть предусмотрена единовременная уплата цены договора дольщиком не позднее 5 (Пяти) календарных дней с даты его подписания с одновременным предоставлением дольщику скидки, устанавливающей уменьшение цены одного квадратного метра общей площади объекта долевого строительства до **5 300 000 белорусских рублей (для квартир всех типов)**.

6. Данные о правах застройщика на земельные участки и их площади: составленные РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков от 25.06.2011 №№ 500/907-3900 (участок площадью 0,0945 га с кадастровым номером 500000000002007561 для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома), 500/907-3901 (участок площадью 0,0061 га с кадастровым номером 500000000002007562 для строительства и обслуживания ПНС), 500/907-3902 (участок площадью 0,0505 га с кадастровым номером 500000000002007563 на период строительства многоквартирного жилого дома), 500/907-3903 (участок площадью 0,7513 га с кадастровым номером 500000000002007564 на период строительства многоквартирного жилого дома). Право собственности: правообладатель Республика Беларусь, право пользования: правообладатель ООО «ИНТЕХНОСТРОЙ».

Границы земельных участков: ограничены с севера – зданием административно-бытового назначения; с юга – детским садом, с запада – многоквартирным жилом домом переменной этажности; с востока – общеобразовательной средней школой № 131.

Благоустройство: автомобильная парковка на 37 машино-мест, а также увеличение парковок близлежащих территорий на 58 машино-мест; плиточное покрытие, детские площадки, озеленение территории с установкой малых архитектурных форм.

7. Количество самостоятельных частей в жилом доме, передаваемых Застройщиком Дольщикам после утверждения акта приемки в эксплуатацию жилого дома: 25 квартир.

8. Нежилые помещения, не входящие в состав общего имущества: нет.

9. Состав общего имущества: лифтовые, мусоропроводная камера, электросчетовая, общие коридоры, лестницы и межлестничные площадки, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся внутри жилых или нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, благоустройства и озеленения.

10. Предполагаемый срок ввода объекта в эксплуатацию: июнь 2012 года.

11. Сведения о договоре строительного подряда: договор от 12.07.2011 № 59/05-11, заключенный ООО «Интехнострой» (Заказчиком) с ОАО «МАПИД» (Генподрядчиком).

Условия ознакомления дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: по согласованию с Застройщиком, в установленное им время и в присутствии его ответственного представителя, с соблюдением требований техники безопасности. Также с объектом долевого строительства можно ознакомиться в офисе уполномоченного представителя Застройщика: ЧРУП «Вива Консалт» (торговая марка ViVa Invest), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Б. Хмельницкого, д. 7, офис 302 (тел. 8-017-2-900-901, 8-029-1-907-901) или на сайте vivainvest.by.

Директор В.В. Расолько

АКАЗВАЕЦЦА, ТАННА ...

Усваёй суботняй праграме тэлежурналіст Аляксей Міхальчанка сярод іншых тэм закрануў і пытанне, якое не можа не хваляваць літаральна кожнага аўтаўладальніка — кошт паліва. У працяг тэмы — меркаванне аднаго з кіроўцаў, журналіста «Звязды».

У праграме было зазначана, што «пры такіх сціплых рэсурсах вуглевадародаў кошт паліва нават пасля нядаўняга малюсенькага падаражання» (маецца на ўвазе, пэўна, падаражанне таго ж АІ — 92 з 4200 да 4330 рублёў. — **Аўт.**) на беларускіх запраўках па-ранейшаму ніжэй, чым на расійскіх, а гэта ў сучасным свеце без усялякіх жартаў называецца эканамічным цудам. І далей паведамляецца, што супраць гэтага цуду, аказваецца, выступіла Беларуская партыя «Зялёныя». Заклапочаныя праблемамі захавання прыроды і здароўя будучых пакаленняў, чаму пагражаюць усё большыя аб'ёмы спажывання паліва, «зялёныя» заклікалі ўрад рашуча падымаць цэны на аўтамабільнае паліва.

Аўтар тэлеперадачы, мусіць, таксама без усялякіх жартаў сказаў: «Я згодны з «зялёнымі». Больш свежага паветра, менш аварый на дарогах».

Перш чым разгледзець аргументы партыйнай заявы «зялёных», варта задумацца аб вышэйзгаданым цудзе. Ці не занадта гучна? Няўжо не памятаем, як пасля дэвальвацыі беларускай валюты і рэзкага павялічэння кошту на аўтамабільнае паліва рашэннем кіраўніка дзяржавы цэны знізіліся? Да таго ж, айчыннаму аўтааматару, мабыць, не надта сагрэеш душу супастаўленнем нашых цэн на гаручае з расійскімі. Так, у сувязі з дэвальвацыяй беларускіх грошай кошт паліва, калі суадносіць з курсам долара ці еўра, на нашых АЗС можа быць крыху меншым. Аднак калі ўлічыць, што літаральна за некалькі месяцаў літр бензіну падаражэў прыкладна на тысячу рублёў, а зарплата ў беларускіх рублях засталася на ранейшым узроўні, то для кашалька зусім не танна. Такія яны, нашы рэаліі. Менавіта рэаліі, у якіх жывём, а не нейкі цуд.

Праўда, з такой спажывецкай псіхалогіяй не згодна Беларуская партыя «Зялёныя». Шчыра кажучы, раней чуў толькі пра акцыі замежных «зялёных», а вось нейкіх ініцыятыў з боку айчынных прыхільнікаў гэтага руху, прынамсі ў Гродне, аўтарам гэтых радкоў заўважана не было. Але тут, як той казаў, зачапіла. Пасля тэлеперадачы зайшоў на інтэрнэт-сайт партыі і азнаёміўся з яе заявай наконт кошту аўтамабільнага паліва. Чым жа заклапочаны беларускія «зялёныя»?

Іх хвалюе, што «захаванне старых цэн на паліва, безумоўна, прывядзе да павышэння аб'ёмаў яго спажывання». Ва ўмовах пагрозы змянення клімату (адным з фактараў якога з'яўляецца прыватны транспарт) такое неразуменне глабальных выклікаў з'яўляецца, лічаць «зялёныя», абуральнай дэманстрацыяй безадказнага спажывання ва ўрон захавання прыроды і здароўя будучых пакаленняў. А паколькі кошт вуглевадародаў звязаны з ужо агляднымі гарызонтамі знікнення іх запасаў, то выйсцем з цэнавага крызісу на аўтамабільнае паліва не можа быць адміністрацыйнае замарожванне цэн. Значыць, перакананы «зялёныя», альтэрнатыва не ў тым, каб настальгіраваць па старых цэнах, чапляцца за рудзіменты мінулага стагоддзя, калі бензіну было — хоць заліся. Неабходна канстатаваць бесперспектыўнасць аўтамабільнага сектара, які працуе на вуглевадародным паліве. І чым хутчэй, заяўляюць «зялёныя» партыйцы, аўтамабільная супольнасць Беларусі ўсвядоміць гэтую ісціну, тым хутчэй яна зможа адаптавацца да выклікаў сучаснасці. Пачне, па магчымасці, адмаўляцца ад лішняй эксплуатацыі машын, аддаючы прыярытэт веласіпедам і грамадскаму транспарту, патрабаваць ільгот для карыстальнікаў электрамабіляў і г.д.

Слушна, аднак гэтыя разважанні аб глабальных выкліках сучаснасці не падмацоўваюцца ні аналізам аснашчэння нашых населеных пунктаў веладарожкамі, ні ацэнкай перспектыў з'яўлення ў Беларусі электрамабіляў, для карыстальнікаў якіх ужо сёння прапануецца патрабаваць ільготы. Затое ёсць пажаданне беларускаму ўраду: ён, на думку «зялёных», «павінен не заставацца пабочным назіральнікам, а рашуча садзейнічаць ломцы архаічнай свядомасці аўтааматараў шляхам неадкладнага павышэння цаны на бензін. Як мінімум у два разы».

Звернем увагу менавіта на прапанову «неадкладнага павышэння» і паспрабуем ацаніць наступствы падобнай «ломкі архаічнай свядомасці аўтааматараў». Дапусцім, цэны на гаручае і сапраўды падскочылі ўдвая. Аднак хіба ж толькі на асабістыя «колы»? Зразумела, падобнае немагчыма, а значыць, падаражэюць паслугі не толькі грамадскага транспарту, але і павялічыцца транспартная складовая літаральна ўсёй эканомікі, у кошце ледзь не ўсіх тавараў. Вось дзе ломка будзе ...

Што ж тычыцца свежага паветра, то акцыі накшталт «Дзень без аўтамабіля» аўтааматарам, вядома, трэба падтрымліваць. А адпаведным органам строга кантраляваць, каб шкодныя выкіды ў атмасферу з транспартных сродкаў не перавышалі дапушчальных нормаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

«БЕЛАРУСКАЯ КРЭДЫТНАЯ КААПЕРАЦЫЯ, НА ЖАЛЬ, ТОПЧАЦЦА НА МЕСЦЫ...»

ПРАДСТАЎНІКІ Нацыянальнага банка Беларусі, крэдытных саюзаў Польшчы, Беларусі і Расіі, грамадскіх аб'яднанняў пагутарылі на тэму «Крэдытныя саюзы — дзяржаўнае рэгуляванне ці самарэгуляванне? Перавагі, рызыкі, міжнародны вопыт».

Па словах **Сяргея ЛУГАЎЦОВА, начальніка ўпраўлення навукі, інавацый і фінансавага праектавання Нацыянальнага банка,** «беларуская крэдытная кааперацыя, калі нават параўноўваць з найбліжэйшымі нашымі суседзямі, на жаль, топчацца на месцы». Чаму так атрымліваецца? Па шэрагу прычын: нізкая інфармаванасць аб мікрафінансавых паслугах і адсутнасць даверу насельніцтва, недастатковая крэдытная культура насельніцтва, недастатковая заканадаўчая база.

Вопытам арганізацыі крэдытных кааператываў з Беларуссю падзяліліся Польшча і Расія. **Павел ГЖЭЖЫК, кіраўнік варшаўскага офіса Нацыянальнай Асацыяцыі Крэдытных Саюзаў Польшчы**, расказаў пра сістэму крэдытных саюзаў у яго краіне: «Зараз у нас 59 крэдытных саюзаў, якія аб'ядноўваюць 2,2 млн удзельнікаў. Усе гэтыя саюзы ўваходзяць у Нацыянальную касу, якая з'яўляецца кааператывам юрыдычных асоб. Вы спытаеце: добра ці дрэнна гэта?» Павел Гжэжык растлумачыў, што, калі толькі пачыналі з'яўляцца асобныя саюзы, не было ніякага маніторынгу ні з боку Нацыянальнага банка, ні з боку нейкіх дзяржаўных інстытуцый, паколькі гэтыя аб'яднанні былі занадта малыя. Аднак Міністэрству фінансаў і Нацыянальнаму банку прасцей мець стасункі з нейкім адным партнёрам, які будзе гаварыць ад імя цэлага руху крэдытных саюзаў. «Дзяржава хоча мець партнёра, які будзе забяспечваць ліквіднасць асобных аб'яднанняў, а гэта з'яўляецца адной з асноўных функцый Нацыянальнай касы, — працягвае прадстаўнік Нацыянальнай Асацыяцыі Крэдытных Саюзаў Польшчы. — Доказам эфектыўнасці такой сістэмы можа быць тое, што ніводная такая арганізацыя не спыніла свайго існавання. Кожны саюз мае права вызначаць цэнавую палітыку сваіх паслуг і дэпазітаў. Але ж калі паслугі будуць занадта дарагія, то саюз проста не зможа функцыянаваць. Тым больш за кааператывамі ўвесь час сочаць».

Генеральны дырэктар Расійскай Лігі Крэдытных саюзаў Аляксандр САЛОМКІН таксама лічыць, што нейкая арганізацыя, якая аб'ядноўвае крэдытныя кааператывы, абавязкова павінна быць у краіне. На яго думку, гэта дазваляе вызначаць стандарты працы, фарміраваць адзіны брэнд, выпрацоўваць адзіныя спосабы падтрымання іміджу. Праз гэта расце давер з боку насельніцтва: «Гэта дапаможа змагацца з «аднадзённымі» кааператывамі, якія займаюцца махлярствам», — упэўнены А. Саломкін.

Уладзімір КАРАГІН, старшыня грамадскага аб'яднання «Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў», лічыць крэдытныя кааператывы надзвычай важнымі для стратэгіі развіцця нашай краіны, нашай эканомікі. «Вопыт Польшчы, вопыт Расійскай Федэрацыі, сусветны вопыт падказвае, што мы на правільным шляху. За адносна кароткі тэрмін у нас таксама ўтварыўся слой кааператываў, хоць і невялікі», — адзначае У. Карагін. — У апошніх двух пасланнях Прэзідэнта парламенту адзначана неабходнасць самарэгулявання і стварэння дзяржаўнага прыватнага партнёрства. У цяперашні момант падрыхтаваны праекты законаў аб дзяржаўным прыватным партнёрстве і аб арганізацыях, якія самарэгулююцца».

Таксама старшыня МССПіП нагадаў пра Дырэктыву №4, якая, на яго думку, з'яўляецца стратэгічным дакументам і можа быць дадатковым стымулам для развіцця крэдытных саюзаў.

Старшыня праўлення спажывецкага кааператыва «Саюз Крэдыт», які дзейнічае на Брэстчыне, Ігар НАЙМУШЫН лічыць, што капітал, які фарміруецца ў крэдытных саюзах, вельмі карысны для краіны: «Ідэя, што гэта народны капітал, які павінен захоўвацца і абараняцца дзяржавай, для нас пакуль што чужародная. Аднак ва ўмовах экспансіі замежнага капіталу мець свой «родны» капітал проста неабходна». Дарэчы, гэты кааператыў супрацоўнічае з польскімі крэдытнымі саюзамі, пераймае іх вопыт.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ДАВЕДКА:

Рух спажывецкіх кааператываў фінансавай узаемадапамогі распачаўся ў Беларусі ў лістападзе 1997 года пры падтрымцы сумеснага праекта Праграмы развіцця ААН і шведскага ўрада ў Беларусі «Садзейнічанне стварэнню інстытута крэдытных саюзаў у Рэспубліцы Беларусь». А 21 снежня 1999 года была прынята Пастанова Савета Міністраў №1972 «Аб таварыствах узаемнага крэдытавання суб'ектаў малога прадпрымальніцтва».

Першы крэдытны саюз з'явіўся ў 2002 годзе.

У 2008 годзе арганізавана Рэспубліканская Асацыяцыя спажывецкіх кааператываў фінансавай узаемадапамогі. Зараз у гэтую асацыяцыю ўваходзяць дзесяць спажывецкіх кааператываў.

Існуюць у нашай краіне спажывецкія кааператывы для фізічных асоб, юрыдычных асоб і змешаныя.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ЗАСТРОЙЩИКА от 14.12.2009 г.

Сведения о застройщике:
Белорусско-английское Совместное закрытое акционерное общество «ЛадаГарант» (СЗАО «ЛадаГарант»). СЗАО «ЛадаГарант» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС – Холдинг» ЗАО).

Местонахождение: г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 4Н.

Режим работы: рабочие дни с понедельника по субботу, рабочие часы – с 8 ч.30 мин. по 19 ч.00 мин., без обеда, выходные дни – воскресенье.

Данные о государственной регистрации: зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100934617.

Сведения о проектах жилых домов, введенных в эксплуатацию за последние 5 лет:

1. 9-этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом № 91 по ул. Грушевская в г. Минске.
2. 15-17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом № 15 по ул. Маяковского в г. Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки.
3. 7-этажный 5-секционный 135-квартирный жилой дом № 3 по ул. Щорса.
4. 15-этажный односекционный 89-квартирный жилой дом № 8 по ул. Щорса 3-я.
5. 9-этажный 4-секционный 135-квартирный жилой дом № 1 по ул. Щорса.

Лицензия на право осуществления деятельности "Проектирование и строительство зданий и сооружений I, II уровней ответственности и проведения инженерных изысканий для этих целей" №02250/0005789 со сроком действия по 29.11.2014 г., выданное Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь.

Цель проекта – строительство объекта «Многоэтажные жилые дома с объектами административно-общественного назначения в квартале застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса, II этап –

жилые дома, не относящиеся к домам повышенной комфортности. включающие в себя:

жилой дом № 3 по генплану – 10-этажный, 7-секционный, 261-квартирный;

жилой дом № 2 по генплану – 9-этажный, 4-секционный, 135-квартирный;

административное здание № 2а по генплану – 8-этажное, 1-секционное, с привлечением денежных средств граждан и юридических лиц, путем заключения договоров создания объектов долевого строительства.

Сведения о сроках реализации
Начало строительства – июль 2009 г.
Ввод объекта в эксплуатацию – первый квартал 2012 г.

У Застройщика имеются:
- решения Мингорисполкома от 24.11.2005 г. № 2080 о представлении земельного участка;
- проектно-сметной документации, прошедшей в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» (заключения от 12.03.2008 г. № 637-5/08, от 12.03.2008 г. № 636-5/08, от 14.03.2008 № 648-5/08, от 10.06.2008 г. №1388-5/08, от 10.06.2008 г. № 1390-5/08, от 10.06.2008 г. №1391-5/08, от 10.06.2008 №1392-5/08, от 04.08.2010 г. № 873-15/10), государственную экологическую экспертизу (заключение № 391 от 17.12.2007 г.);
- решения Мингорисполкома о разрешении на строительство № 2378 (I) от 09.10.2008 г., №966 от 29.04.2010 г.
- разрешение на производство строительно-монтажных работ от 16 июля 2009 г. №2-203Ж-036/09

Местонахождение строящегося объекта: г. Минск, пересечение ул. Щорса – Железнодорожная в квартале застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса.

Количество предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства:

По жилому дому № 3 по г.п.:
1-комнатная - 3 шт.,
2-комнатная – 4 шт.,
3-комнатные – 2 шт.

Цена одного квадратного метра общей площади жилых помещений (без отделки) составляет – **6 500 000** белорусских рублей (для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий).

Цена одного машино-места 75 000 000 белорусских рублей.

Данные о правах Застройщика на земельный участок: земельный участок предоставлен Застройщику решением Мингорисполкома от 09.10.2008 г. № 2378 (I) площадью 3,5784 га, граничит с земельными участками г. Минска, УП "Минское отделение Белорусской железной дороги".

Элементы благоустройства: создаются площадки для отдыха, занятия спортом, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому – двухслойный асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок – спецсмесь и плитка.

Общее имущество дольщиков – межквартирные лестничные клетки, лестницы, коридоры, крыша, техподполье, крышная котельная, несущие, ограждающие конструкции, оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы благоустройства и озеленения.

Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию – 1-е полугодие 2012 г.

Сведения о договорах строительного подряда:
Договор подряда с ООО «Буд-М» № 1-09 от 20.05.2009 г.

Условия ознакомления с информацией по проекту:
по тел. 8 017 219 78 22, VELCOM 8 029 679 34 24; МТС 8 033 6372565 на сайте **http://www. lada.by**/ либо по адресу: ул. Грушевская, 91, пом. 4Н, каб. 5.

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ЗАСТРОЙЩИКА от 15.11.2010 г.

Сведения о застройщике:
Белорусско-английское Совместное закрытое акционерное общество «ЛадаГарант» (СЗАО «ЛадаГарант»). СЗАО «ЛадаГарант» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС – Холдинг» ЗАО).

Местонахождение: г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 4Н.

Режим работы: рабочие дни с понедельника по пятницу, рабочие часы – с 8 ч.30 мин. по 19 ч.00 мин., суббота рабочие часы – с 9 ч.00 мин. по 15 ч.00 мин., без обеда, выходной день – воскресенье.

Данные о государственной регистрации: зарегистрировано Министерством иностранных дел Республики Беларусь в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100934617.

Сведения о проектах жилых домов, введенных в эксплуатацию за последние 5 лет:

1. 9-этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом № 91 по ул. Грушевская в г. Минске.
2. 15-17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом № 15 по ул. Маяковского в г. Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки.
3. 7-этажный 5-секционный 135-квартирный жилой дом № 3 по ул. Щорса.
4. 15-этажный односекционный 89-квартирный жилой дом № 8 по ул. Щорса 3-я.
5. 9-этажный 4-секционный 135-квартирный жилой дом № 1 по ул. Щорса.

Цель проекта – строительство объекта «Многоэтажный жилой дом не повышенной комфортности с объектами соцкультбыта и многоуровневая стоянка для автомобилей со встроенно-пристроенными помещениями автоцентра в квартале застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса в г. Минске, 1-й этап (первый пусковой комплекс)"

с привлечением денежных средств граждан и юридических лиц, путем заключения договоров создания объектов долевого строительства.

Сведения о сроках реализации
Начало строительства – первое полугодие 2010 г.
Ввод объекта в эксплуатацию – второе полугодие 2012 г.

У Застройщика имеются:
- решения Мингорисполкома о разрешении на строительство №2565 от 30.10.2008 г.;
- проектно-сметной документации, прошедшей в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» (заключения от 04.12.2007 г. №2685-5/07, от 14.01.2008 г. №113-5/08, от 04.08.2010 №859-15/10)
государственную экологическую экспертизу (заключение № 239 от 30.08.2007 г., №72 от 20.07.2010 г.);
- разрешение на производство строительно-монтажных работ от 10 ноября 2010 г. №2-203Ж-005/10 (I).

Местонахождение строящегося объекта: г. Минск, пересечение пр. Дзержинского – пр. Жукова, в квартале застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса.

Количество предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства:

По жилому дому:
1-комнатные - 4 шт.,
2-комнатные – 7 шт.,
3-комнатные – 9шт.

Цена одного квадратного метра в 1-комнатных квартирах общей площади жилых помещений (без отделки) составляет – **6 500 000** белорусских рублей.

Цена одного квадратного метра в 2-комнатных квартирах общей площади жилых помещений (без отделки) составляет – **6 150 000** белорусских рублей.

Цена одного квадратного метра в 3-комнатных квартирах общей площади жилых помещений (без отделки) составляет – **5 995 000** белорусских рублей.

Данные о правах Застройщика на земельный участок: земельный участок предоставлен Застройщику решением Мингорисполкома от 30.10.2008 г. № 2565 (I) площадью 3,7474 га.

Элементы благоустройства: создаются площадки для отдыха, занятия спортом, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому – двухслойный асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок – спецсмесь и плитка.

Общее имущество дольщиков – межквартирные лестничные клетки, лестницы, коридоры, крыша, техподполье, крышная котельная, несущие, ограждающие конструкции, оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы благоустройства и озеленения.

Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию (1-го пускового комплекса) – 2-е полугодие 2012 г.

Сведения о договорах строительного подряда:
Договор подряда с ЗАО «Инсервисстрой» № 2-09 от 28.12.2009 г.

Условия ознакомления с информацией по проекту:
по тел. 8 017 219 78 22, VELCOM 8 029 679 34 24; на сайте **http:// www. lada.by**/ либо по адресу: ул. Грушевская, 91, пом. 4Н, каб. 5.

Краіна здароўя

Выпуск
№ 42 (278)

Дзіцячая тэма

НАВОШТА МАЛЫМ ПАКАЗВАЮЦЬ ПАЧВАР?

ГАЛОЎНЫЯ героі сучасных анімацыйных фільмаў — бясполыя монстры зялёнага колеру з вялізнымі галовамі, кароткімі рукамі і нагамі або выродлівыя Сімпсаны — могуць негатыўна паўплываюць на дзіцячую псіхіку: некаторыя малыя баяцца такіх «добрых малайцоў».

Як зазначаюць псіхолагі, тое, што ў мультфільмах прысутнічаюць персанажы з жахлівай знешнасцю, — гэта паўбяды. «Монстры» былі і ў народных казках, але Баба-Яга і Змей Гарыныч, калі памятаеце, жылі за трыдзевяць зямель, і дабрацца да іх было не так і проста. А сучасныя пачвары папросту «разгульваюць па вуліцах гарадоў і прыходзяць у госці без запрашэння».

Спецыфіка ж дзіцячага ўспрымання ў тым, што малыя не бачаць выразнай мяжы паміж рэальнасцю і тым, што адбываецца на экране. Таму кола дзіцячых страхаў пастаянна пашыраецца. Спецыялістам даводзіцца сутыкацца з дзецьмі, якія адмаўляюцца выйсці на вуліцу: яны баяцца ў пясочніцы сутыкнуцца з чарапашкамі ніндзя або іншымі пачварамі.

Другая праблема ў тым, што дзеці заўсёды асацыююць сябе з героямі кніг або мультфільмаў і ў далейшым стараюцца пераймаць іх паводзіны. А калі галоўны герой — пачвара Сімпсан або монстр, які разбурае ўсё вакол? Спачатку малы, убачыўшы такое другое «я», бянтэжыцца, але потым нярэдка пачынае капіраваць яго дзеянні.

Сучасныя «страшылкі» дзецям лепш не паказваць. Прасунутым бацькам, якія хочуць далучыць сваё дзіця да сучаснай анімацыі, трэба абавязкова сачыць за рэакцыяй малога. Як толькі ён пачынае нямець перад экранам — неадкладна выключайце тэлевізар. Калі вы, вядома ж, хочаце, каб ён спаў спакойна.

АДЗІН ДОМА

Зякога ўзросту, з пункту гледжання псіхалогіі і бяспекі, можна пакідаць дзіця дома адно? Гэта залежыць ад многіх абставін, але асноўныя з іх такія: узрост вашага дзіцяці, яго самастойнасць і наколькі вы яму давяраеце. Таму і вырашэнне гэтага пытання будзе індывідуальным. Аднак можна даць адну агульную параду: вы павінны паступова прывучаць дзіця заставацца ў адзіноце.

Большасць сучасных псіхолагаў сыходзіцца ў думцы, што пакідаць дзіця дома адно можна гадоў з шасці—сямі, калі яно ўжо дастаткова пасталее для гэтага. У такім узросце яно ўжо разумее шматлікія «нельга» і здагадваецца, што ніякіх «бабаяў» дома няма. Некаторыя спецыялісты сцвярджаюць, што пакідаць 6-гадовае дзіця адно ў кватэры нават неабходна: гэта дасць яму магчымасць адчуць сябе «вялікім», дапаможа выхаваць у ім самастойнасць і пачуццё адказнасці.

Пачынаць варта з невялікіх адлучак, і лепш папярэдзіць малога загадзя. Скажыце, напрыклад, што заўтра мама з татам павінны будуць на паўгадзіны схадзіць у краму, а ён можа ў гэты час пасядзець дома. Калі дзіця пратэстуе і просіцца з вамі, перанясіце эксперымент на наступны раз, якімі б сумнымі і стамляльнымі для дзіцяці ні былі паходы па крамах і якія б карысныя і цікавыя заняткі ні чакалі яго дома. Таму што застаўшыся адзін без згоды і праз сілу, ён адчуе сябе не дарослым, а маленькім і спалоханым. А калі яшчэ і кожны раз настойваць, што «ты ўжо вялікі і можаш пабыць без дарослых», то могуць развіцца страхі, ад якіх доўга давядзецца пазбаўляцца.

Першы раз лепш пакінуць дзіця адно не больш чым на 15—20 хвілін — гэтага часу вам якраз хопіць схадзіць у краму. Паступова вашы адлучкі могуць станавіцца больш доўгімі, але ўсё ж старайцеся гадоў да дзесяці не пакідаць дзяцей без нагляду дарослых больш чым на 3—4 гадзіны.

Калі дзіця застаецца дома адно:

- Пакіньце яму нумары тэлефонаў, па якіх яно можа папрасіць дапамогі (міліцыя, пажарная, хуткая дапамога, суседзі, сябры, ваша праца).
- Вывучыце з малым, як яго завуць і як завуць яго бацькоў, а таксама хатні адрас, тэлефон.
- Схавайце далей лекі і прадметы, якімі можна параніцца. Зачыніце вокны, уваходныя дзверы.
- Папярэдзьце, што дзіця не павінна само карыстацца электрапрыборамі, уключаць газ, адкрываць краны, лезці на крэсла, каб дастаць нешта з паліцы, высоўвацца ў акно, браць запалкі.
- Сыходзячы ў вячэрні час, не забудзьце ўключыць святло ў пакоях — гэта адпужвае зламыснікаў, а вашаму дзіцяці будзе не так страшна аднаму.
- Калі вы жывяце на першых паверхах, зашторце вокны.
- Пасля вашага адыходу дзіця павінна зачыніць дзверы на ланцужок і адчыніць іх толькі пасля таго, як вы цалкам назавяце сябе.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Актуальна

АДПАЧЫНАК... БЕЗ НАСТУПСТВАЎ

ЛЕТА павольна, але ўсё ж такі рухаецца да заканчэння, і тым не менш, час водпускаў яшчэ не закончыўся, больш за тое, ён у самым разгары. А гэта азначае, што ў многіх з нас «чамаданны» настрой. Мы плануем свой водпуск загадзя, старанна прадумваем маршрут, разлічваем неабходныя выдаткі, узгадняем дэталі з роднымі і блізкімі, улічваем, як нам здаецца, усё! Застаецца толькі спакаваць багаж... І вось тут медыкі заклікаюць нас яшчэ раз падумаць: ці ацанілі мы аб'ектыўна свае фізіялагічныя магчымасці, асаблівасці ўласнага арганізма, нашы хранічныя захворванні і, нарэшце, свой узрост. Варта ведаць: адпачынак у далёкіх экзатычных краінах і нават у краінах не такіх аддаленых, еўрапейскіх — гэта не толькі новыя ўражанні, але і пэўная нагрузка для любога арганізма, роўная наймацнейшаму стрэсу.

Адна з праблем, з якой вам давядзецца сутыкнуцца, — акліматызацыя на новым месцы

Кожнаму чалавеку ўласцівы свой біялагічны рытм: сутачны, месячны, гадавы.

Самы складаны з іх — сутачны, і звязана гэта з тым, што менавіта ён вызначае функцыянальныя магчымасці чалавека. Так, дзённы перыяд высокіх функцыянальных магчымасцяў супадае з неабходнасцю актыўнай дзейнасці; у той жа час уначы для аднаўленчых працэсаў патрабуецца нізкі ўзровень функцыянальнай актыўнасці. Гэта значыць наш біялагічны гадзіннік працуе ў пэўным рэжыме і сінхранізаваны з прыроднымі сутачнымі рытмамі таго геаграфічнага рэгіёна, у якім мы пражываем. Пры пералёце ў шыротным кірунку адбываецца разрыў у часе працягласцю ў некалькі гадзін. Адразу ж пасля палёту часавы дыскамфорт адчуваецца не так востра: новыя эмацыйныя ўражанні, актыўныя дзеянні пасля прылёту дазваляюць дэмабілізавацца. Але ўжо на наступны дзень магчымая сітуацыя, калі вы будзеце проста «валіцца з ног». Да вашага арганізма, вобразна кажучы, з некаторым спазненнем дахадзіць, што пакуль вы тут весяліцеся, дома ж усе даўно спяць! У выніку — бяссоніца, стомленасць, дрэннае самаадчуванне; у жанчын магчымыя парушэнні менструальнага цыклу.

Падобны збой біялагічнага гадзінніка спецыялісты называюць дэсінхранозам. Большасць здаровых людзей, безумоўна, параўнальна лёгка і хутка прыстасоўваюцца да новага месца і часу; некаторыя ж адаптуюцца з цяжкасцю, прычым з узростам здольнасць да адаптацыі зніжаецца.

Які ж інтэрвал паміж геаграфічным часам і рытмамі арганізма можа выклікаць дэсінхраноз? Яшчэ нядаўна лічылася, што гэта зрух у часе на 4—5 гадзін; апошнія навуковыя даследаванні біярытмолагаў сведчаць пра тое, што нават дзвюх гадзін дастаткова для з'яўлення пэўных адхіленняў у функцыянальным стане арганізма. Дадайце сюды яшчэ і змену кліматычных умоў.

Што ж можна зрабіць?

Па-першае, ацаніце рэальна свой стан і магчымасці арганізма, папярэдне параіўшыся з доктарам. Можа, больш мэтазгодна выбраць іншы, бліжэйшы, але не менш цікавы маршрут для свайго летняга адпачынку.

Па-другое, калі вы ўсё ж запланавалі пералёт у краіны з вялікай часавай розніцай і іншым кліматам, плануйце яго так, каб прыляцець на месца адпачынку познім вечарам або ўначы. Добры сон пасля доўгага пералёту дазволіць вам хутчэй «упісацца» ў мясцовы час.

Па-трэцяе, паспрабуйце правільна правесці першы дзень адпачынку: больш спіце, ешце (у разумных колькасцях), трохі пагуляйце (выключыўшы дыскатэкі і іншыя актыўныя мерапрыемствы, якія забіраюць шмат энергіі).

Па-чацвёртае, паспрабуйце ў гэты дзень, а таксама і ў далейшым, не злоўжываць спіртнымі напоямі, бо ў новых кліматычных умовах пры нестабільным функцыянальным стане арганізма дзеянне алкаголю значна ўзмацняецца, а яго вывядзенне запавольваецца.

Рыхтуйцеся да вяртання дадому

Варта падумаць загадзя і пра выхад з «адпускнога піке», бо рэакліматызацыя (гэта значыць, зваротная адаптацыя арганізма пры вяртанні дадому) у большасці людзей працякае складаней, чым акліматызацыя.

Рэч у тым, што ў водпуску арганізм ледзь паспявае прыстасавацца да новых умоў; яму задаецца новая праграма і ён «стараецца» яе выконваць, надыходзіць частковая адаптацыя. Пасля вяртання дадому ўзнікае неабходнасць у новай функцыянальнай перабудове, бо арганізм па-ранейшаму працуе ў «адпускным» рэжыме. Адбываецца рэгулятарная дэзарыентацыя ў часе і прасторы, што праяўляецца ў выглядзе псіхафізіялагічнага стрэсу.

Акрамя таго, даказана: чым камфортней адчувалі вы сябе на адпачынку, тым цяжэй працякае рэакліматызацыя — дзейнічае так званы «эфект кантрасту». Справа можа дайсці нават да дэпрэсіі.

Плануйце вяртанне з водпуску так, каб у запасе перад выхадам на працу ў вас заставаліся яшчэ два-тры дні. Правядзіце іх у спакойным, размераным рэжыме.

Дапамажыце свайму арганізму выйсці з «адпускнога піке» з дапамогай прыродных прэпаратаў: настойкі валяр'яну або сардэчніку (у вячэрні час); лімонніку, элеўтэракоку, жэньшэню (у ранішнія гадзіны — для актывізацыі). Добрыя таксама і агульнаўмацавальныя працэдуры: кантрасны душ, водаратэрапія, лёгкія фізічныя практыкаванні, прагулкі на свежым паветры.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

Нёманскі прычал

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Турбаза «Высокі бераг» Стаўбцоўскага раёна.

Інфарм-укол

«ТОРЦІК» У БУТЭЛЬЦЫ

Вада, чорная кава і чай без цукру не ўяўляюць пагрозы для фігуры, чаго не скажаш пра ліманады, колу і іншыя салодкія напоі. Урачы-дыетолагі празвалі апошнія «торцікам у бутэльцы». І не дзіўна: 0,2 л прывабнага напою можа змяшчаць 8-10 лыжак цукру. Фактычна, кажа **валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алена ГАРНІЦКАЯ**, пара шкляначак кока-колы адпавядае па каларыйнасці булачцы. Амерыканцы, якія, як вядома, сур'ёзна захапляюцца той жа колай, «дзякуючы» гэтай звычцы, прыбаўляюць у вазе каля 2 кг за год.

ПАБОЛЕЙ СВЕЖЫХ АНТЫАКСІДАНТАЎ

Для захавання маладосці і падтрымкі імунітэту медыкі і касметолагі даюць пяць няхітрых рэкамендацый:

1. Піце зялёны чай, ягадныя морсы і свежаадціснутыя сокі.
2. Ужывайце парасткі зерня пшаніцы.
3. Ешце свежыя садавіну і гародніну.
4. Замяняйце фастфуд, кансерваваную і вэнджаную ежу на дары мора.
5. Перыядычна з'ядайце па некалькі любых арэшкаў.

Сярод ягад чэмпіёнамі па колькасці антыаксідантаў з'яўляюцца журавіны, парэчка, чарніцы, звычайная і чарнаплодная рабіна. Сярод напояў лідзіруюць зялёны чай, какава і чырвонае віно. «Пасткамі» для свабодных радыкалаў з'яўляюцца таксама тлустыя гатункі рыбы і аліўкавы алей.

СЕЛЬДЭРЭЙ І ЎМАЦУЕ, І ЗАСПАКОІЦЬ

Зелень сельдэрэю можа спрыяць зняццю стомленасці. Яшчэ старажытныя грэкі, якія ўпрыгожвалі сельдэрэем сваё жыллё і храмы, заўважылі, што яго водар заспакойвае, паляпшае сон, разумовую і фізічную працаздольнасць.

Паводле сучасных даследаванняў, сельдэрэй умацоўвае імунную сістэму, паколькі змяшчае шэраг карысных рэчываў, у тым ліку вітамін С і кальцый, выводзіць з арганізма таксіны, нейтралізуе канцэрагены, якія змяшчаюцца ў тытунёвым дыме, валодае мачагоннай уласцівасцю, а з-за нізкай колькасці вугляводаў падыходзіць для дыетычнага харчавання.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Сузор'е беларусаў свету

МУРАШКА ЛЕАНІД (ЛЯВОН, ЛЕАНІДАС) АДАМАВІЧ

[27.8.1924, в. Сіняўка Нясвіжскага пав. Навагрудскага ваяв., цяпер Клецкі р-н Мінскай вобл. — 09.03.2009]

Оперны спявак, лаўрэат Маскоўскага конкурсу вакалістаў (1956). Заслужаны артыст Літвы (1974), заслужаны дзеяч мастацтва Літвы (1984).

Бацька Л. Мурашкі кіраваў царкоўным хорам, што спрыяла зацікаўленасці хлопчыка спевамі. У 1936 г. разам з сям'ёй перасяліўся ў Вільню, дзе на яго выццё аказаў уплыў Р. Шырма. Па яго парадзе паступіў у Беларускую гімназію, але вымушаны быў вучыцца ў Рускай гімназіі імя А. Пушкіна, якую скончыў у 1943 г. На светапогляд і лёс юнака ў гады вучобы паўплывалі такія вядомыя дзеячы беларускай культуры, як кампазітар К. Галкоўскі, кс. А. Станкевіч, знакамітыя артысты-вакалісты — Пракапеня і Беноні. З 1944 да 1946 г. — у Беларускім ансамблі песні і танца пад кіраўніцтвам Р. Шырмы. Музыказнаўца І. Нісневі ч падкрэсліў, што Р. Шырма даў Л. Мурашку пуцёўку ў вялікае мастацтва. У 1946 г. Леанід быў залічаны салістам у Літоўскую філармонію і адначасова паступіў у кансерваторыю, дзе вучыўся пад кіраўніцтвам выдатнага майстра вакалу К. Пятраўскаса, прафесара К. Галкоўскага. У 1950 г. прадстаўляў Літоўскую кансерваторыю на конкурсным праглядзе вакальных факультэтаў у Маскве. Студэнтам 5-га курса кансерваторыі быў прыняты ў Дзяржаўны тэатр оперы і балета Літвы, дзе працаваў да 1988 г. Выканаў больш за 60 музычных партый (Герман з оперы «Яўген Анегін», Качубей з оперы «Мазепа» і інш.). З поспехам прайшлі яго канцэртныя паездкі ў Іспанію, Італію, Югаславію, Венгрыю, Румынію, Польшчу, Чэхаславакію, Германію. Больш за 20 гадоў Леанід Адамавіч працаваў у Вільнюскай дзяржаўнай кансерваторыі выкладчыкам класа сольных спеваў. З 1988 г. — на пенсіі, але працягваў працаваць рэгентам царкоўнага хору ў Свята-Духаўскім саборы. Л. Мурашка быў адным з актыўных стваральнікаў, а потым і прэзідэнтам Згуртавання беларускіх грамадскіх арганізацый у Літве.

Вядучыя рубрыкі Святлана КАРПУЧОК і Яраслаў МАЛЬДЗІС.

Ёсць нагода? Ёсць пытанне

«ШЧАСЛІВЫЯ» І «НЕШЧАСЛІВЫЯ» НУМАРЫ КВАТЭР

БРЫТАНСКАЯ газета Daily Mail паведамляе, што адна з вядучых еўрапейскіх страхавых кампаній «Акса» правяла незвычайны эксперымент і вызначыла заканамернасць, згодна з якой нумарацыя кватэр звязана з частатой узнікнення ў ёй розных праблем.

Спецыялісты вылічылі «асабліва небяспечныя» і «самую шчаслівую» камбінацыю лічбаў. Аказалася, што самымі «нешчаслівымі» з'яўляюцца кватэры пад нумарам 33, бо менавіта тут адбываецца найвялікшая колькасць пажараў, рабаванняў і паводак. А вось нумар 76 прызнаны самым бяспечным у параўнанні з астатнімі: там штосьці здараецца вельмі рэдка.

Жыхарам кватэр з нумарамі 31-40 гістарычна не шанцуе, а нумары 71-80, наадварот, прыносяць удачу. Акрамя таго, кожны восьмы з апытаных баіцца жыць у кватэры з нумарам 13. А ахвотных жыць пад нумарам 7 — больш, чым трэба. Нумары з найбольшай рызыкай абрабавання: 84, 34, 88, 94, 62, 53, 55, 82 і 23. Жыхары кватэр з нумарамі 33, 34, 68, 22, 55, 92, 96, 36, 69 і 83 павінны быць асцярожнымі з агнём. Самы шчаслівы нумар — 91. Тым, хто жыве ў кватэры з такім нумарам, няма аб чым непакоіцца: з імі нічога не здарыцца.

А ў вас ёсць нейкія забабоны наконт нумара кватэры?

Вольга Багушыньска, псіхолаг:

— Вядома, лічба 13 даверу не выклікае. У мяне знаёмыя ёсць, якія жылі ў кватэрах з такім нумарам. Іх і абрабавалі, і пажар нават, здаецца, быў. Але мне гэтая лічба, наадварот, толькі спрыяе: напрыклад, трынаццатыя нумаркі вельмі часта трапляюцца.

Дзмітрый Тарайкоўскі, старшы дзяржінспектар Мінаблінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь:

— Не, я ў такое не веру. З пункту гледжання здаровага сэнсу, гэта толькі супадзенні. Тэорыю верагоднасці ніхто не адмяняў. Такіх супадзенняў можа быць вельмі шмат — тысячы, мільёны.

Дар'я Барысевіч, студэнтка МДЛУ:

— Не. Для мяне нумар кватэры не мае ніякага значэння. Можа, калі гэта будзе нумар 666, — тады яшчэ задумаюся (*засмяялася*. — **Аўт.**)

Варвара Марозава, журналіст Полацкага радыё:

— Такая статыстыка, вядома, «прыкольная». Але ў мяне забабонаў няма на гэты конт. Можа, калі казаць аб даце нараджэння, то ў гэта я яшчэ паверыла б, але не ў нумары кватэр.

Дар'я Радчанка, студэнтка філфака БДУ:

— Не, я ў гэта абсалютна не веру. Але калі такая статыстыка ёсць, то, можа быць, гэта невыпадкова.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Гараскоп стрыжак на жнівень

3 жніўня. Стрыжка валасоў прывядзе да павелічэння дабрабыту, вы станеце крыху багацейшымі.

4 жніўня. Стрыгчы валасы непажадана.

5 жніўня. Стрыжка ў гэты дзень можа прыцягнуць канфлікты.

6 жніўня. Стрыжка забяспечыць даўгалецце, добрае здароўе і зробіць ваша жыццё годным у вачах навакольных (калі не адразу, то ў бліжэйшыя месяцы).

7 жніўня. Стрыжка валасоў у гэты дзень прыцягвае хваробы.

8 жніўня. Рэкамендуецца ўстрымацца ад стрыжкі.

9 жніўня. Спрыяльны дзень для стрыжкі валасоў.

10 жніўня. Стрыгчы валасы нельга.

11 жніўня. Спрыяльны дзень. Разам з астрыжанымі кончыкамі вы знішчыце ўвесь негатыў. Стрыжка дапаможа пазбавіцца ад праблем.

12 жніўня. Стрыжка ў гэты дзень спрыяльная.

13 жніўня. Поўня. Гэта самы спрыяльны час для стрыжкі валасоў.

14 жніўня. Лепш ад стрыжкі ўстрымацца.

15 жніўня. Стрыжку валасоў лепш адкласці на больш спрыяльны дзень.

16 жніўня. Неспрыяльны дзень для стрыжкі.

17 жніўня. Можаце смела звярнуцца да цырульніка, бо стрыжка ў гэты дзень падаўжае жыццё.

18 жніўня. Стрыгчы валасы непажадана.

19 жніўня. Спрыяльны дзень для стрыжкі валасоў.

20 жніўня. Удалы дзень для наведвання цырульні.

21 жніўня. Стрыжка палепшыць ваш дабрабыт.

22 жніўня. Ад стрыжкі лепш устрымацца.

23 жніўня. Паказанні ў гэтага дня такія ж, як і напярэдадні.

24 жніўня. Няўдалы дзень для стрыжкі валасоў.

25 жніўня. У выніку стрыжкі валасоў ці стварэння прычоскі вы прыцягнеце да сябе радасць і шчасце.

26 жніўня. Спрыяльны дзень для стрыжкі валасоў.

27 жніўня. Стрыжка надасць вам чароўнасці, вы будзеце падабацца людзям яшчэ больш.

28 жніўня. У выніку стрыжкі валасоў губляецца ваша энергія, як кажуць у народзе, «можна розум састрыгчы».

29 жніўня. Маладзік. Стрыжка валасоў забараненая.

30 жніўня. Стрыгчы валасы не рэкамендуецца, паколькі гэта можа прыцягнуць спрэчкі з блізкімі людзьмі.

31 жніўня. Наведваць цырульню не рэкамендуецца, паколькі гэта можа пацягнуць сур'ёзныя растраты ў блізкай будучыні.

Падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 07 сентября 2011 г. ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БЕЛПОЧТА»

№ лота	Наименование, местоположение и краткая характеристика имущества	Начальная цена продажи, руб.	Сумма задатка, руб.	Общая площадь	Коэф. от 0,5 до 3,0	Цель использования
ЛОТ №1	Здание специализированное связи» Брестская обл., г. Брест, ул. Луцкая, 46, помещения на 1-м этаже (инв. №100/С-40877)	490 000	49 000	56,00	3,00	Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, производства (кроме вредных производств)
Предмет аукциона	**Право заключения договора аренды**					
Наименование арендодателя	**РУП «Белпочта»**					
Срок договора аренды	**5 лет**					
Условия	1. С победителем аукционных торгов в течение 5 рабочих дней будут заключены договора аренды нежилых помещений. 2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка. 3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.					
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012000511012 руб. РБ в ЗАО «Цептер Банк» ЦБУ 5, г. Минск, ул. Платонова, 1 б, код 153001820, УНП 807000214					

Аукцион состоится 07 сентября 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».

2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.

3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица.

4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).

6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.
Последний день приема заявлений – 06 сентября 2011 г. до 17.00.
Контактные тел.: 8 (0162) - 23-92-59, 21-88-81.

ОАО «Жлобинская экспериментальная швейная фабрика» ИЗВЕЩАЕТ: О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже доли в уставном фонде СООО «Швейная фабрика Нью Лайн», принадлежащей ОАО «Жлобинская экспериментальная швейная фабрика»

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве директор ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Шилова, 2, комн. 2, тел./факс (80232) 60-51-31, моб. (8029) 621-22-36.
Продавец доли: ОАО «Жлобинская экспериментальная швейная фабрика», г. Жлобин, ул. Красный проезд, 1.
Аукцион состоится 23.08.2011 г. в 12 ч.00 мин. по адресу: г. Гомель, ул. Шилова, д. 2, комн. 2.

Полное и сокращенное наименование хозяйственного общества	Место нахождение хозяйственного общества	Размер уставного фонда хозяйственного общества (дол. США)	Доля государства в УФ общества, %	Размер продаваемой доли, % к УФ	Номинальная стоимость доли в уставном фонде, дол. США	Начальная цена продажи доли, без НДС, руб.	Задаток 5%, без НДС, руб.
Совместное общество с ограниченной ответственностью «Швейная фабрика Нью Лайн» (СООО «Швейная фабрика Нью Лайн»)	247210, Гомельская область, г. Жлобин, ул. Красный проезд, д.1	524 230,61	0	49	256 873	343 080 000	17 154 000

Ранее было опубликовано извещение о проведении аукционных торгов в газете «Звязда» №28 (26892) от 12.02.2011 г., №56 (26920) от 26.03.2011 г., №86 (26950) от 12.05.2011 г., №114 (26978) от 21.06.2011 г.
Заявления и прилагаемые к нему документы принимаются с момента опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Шилова, д. 2, комн. 2 с 9.00 до 17.00 в рабочие дни. **Прием документов заканчивается 19 августа 2011 г. в 17.00.**
Задаток перечисляется до **19.08.2011 года** (включительно) на р/сч 3012115443015 в отделении ЦБУ №320 ОАО «БПС-Банк», МФО 151501369, УНП 400397521.
Условия продажи – без условий.
Шаг аукциона в размере 10% от начальной цены.
Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность.
Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них.
В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа доли этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.
Победитель аукциона (претендент на покупку доли) обязан: - подписать протокол о результатах торгов, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, в течение 3-х рабочих дней со дня проведения торгов; - подписать договор купли-продажи доли не позднее 20 дней с даты подписания протокола о результатах аукциона; - оплатить стоимость доли в течение 30 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи.

По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8 029) 621-22-36 или (80232) 60-51-31, адрес сайта: www.disponent.by

ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ

Фамилия, имя, отчество покупателя (полное наименование для юридического лица)	**Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж»**
Место жительства (местонахождение для юридического лица)	**220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Наименование и местонахождение эмитента	**Открытое акционерное общество «Центроэнергомонтаж» 220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7**
Количество приобретаемых простых именных акций (штук)	**25000**
Цена приобретения (белорусские рубли)	**40000**
Сроки, форма и порядок расчета	Оплата производится денежными средствами в наличной (безналичной) форме, определенной договорами купли-продажи акций, в течение 30 календарных дней со дня заключения договоров купли-продажи акций
Адрес, по которому направляются предложения акционеров на продажу акций и будут заключаться договоры купли-продажи акций	220033, г. Минск, Велосипедный переулок, 7
Даты начала и окончания представления предложений акционеров на продажу акций	С 4 августа 2011 года по 18 сентября 2011 года
Даты начала и окончания покупки акций	С 22 сентября 2011 года по 30 сентября 2011 года

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.

Даведнік па розных галінах ведаў

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Даведнік з тэрмінамі, змешчанымі ў пэўным парадку

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клеткі, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

			2			8		
3	1	9	8				6	
	2		3		5	1		4
			9			3		
	5							
					3			7
	3		4		7	9		8
8	9	2		3				6
					8			5

АДКАЗЫ

На сканворд + судоку

Па гарызанталі: Пальа. Бамарш. Рана. Збан. Фае. Сафа. Ясак. Есаул. Фен. Спірт. Ўат. Астан. Карта. Кале. Эму. Арка. Анад. Ле-жа. Вонкі. Багарыя. Кара-кал. Слоўнік. **Па вертыка-лі:** Фужэр. Кулас. Адаса. Фунікулёр. Драфа. Сурам. Дзея. Патрэба. Спітак. Ано-ва. Танор. Алаяні. Знішык-ланцюжкі. **Судоку:** адказы гл. у табліцы.

4	7	1	6	9	8	2	3	5
8	9	2	5	3	1	7	4	6
6	3	5	4	2	7	9	1	8
9	8	6	1	5	3	4	2	7
1	5	3	7	4	2	6	8	9
2	4	7	9	8	6	3	5	1
7	2	8	3	6	5	1	9	4
3	1	9	8	7	4	5	6	2
5	6	4	2	1	9	8	7	3

ГРЫБЫ

Розныя народы да грыбоў ставіліся па-рознаму. Грыбы часцей за ўсё лічылі раслінамі, а ў некаторых выпадках надзялялі рысамі жывёл, надавалі дэманічныя якасці, звязвалі з «тым» светам. Некаторыя старажытныя народы лічылі, што калі Ілля Грамавержац раз'юшаны, то ён карае сваіх дзяцей і скідае іх з нябёсаў у падземнае — грыбное — царства. Ці не таму і зараз, калі ідуць па грыбы ў лес, не моляцца і не хрысцяцца? У шмат якіх народаў грыбы лічацца сімвалам шчасця.

- Сярод беларусаў калісьці жыло паданне пра тое, што грыбы з'явіліся з кавалачкаў хлеба або аладак, якія еў святы Пётр, хаваючыся ад Хрыста. Менавіта з 12 ліпеня — дня святых апосталаў Пятра і Паўла — дазвалялася збіраць грыбы.
- Гурманы лічаць, што ў час ужывання грыбоў чалавек набывае вечную маладосць.
- Згодна з уяўленнямі ўсходніх славян, усё, што расце ў лесе, належыць гаспадару лесу, таму ягады і грыбы трэба збіраць асцярожна, каб не ўгнявіць ляснога гаспадара.
- Народ быў перакананы, што грыбы хаваюцца ад «нявыхаваных» грыбнікоў. Таму ў час збірання грыбоў забаранялася спяваць, моцна крычаць, ламаць галіны дрэў, збіваць грыбы нагамі — адным словам, парушаць спакой лесу.
- Не кожны можа прыйсці з лесу з грыбамі: «Без шчасця і ў грыбы не хадзі».

Каб забяспечыць сабе грыбны поспех, народныя знахары раілі выконваць пэўныя рытуальныя дзеянні: напрыклад, цалаваць першы знойдзены грыб; тры першыя знойдзеныя грыбы пакласці ў дупло ў дрэве; пакласці ў кішэню тры розныя травінкі ці тры галінкі ад розных дрэў; чытаць адметныя, так званыя «грыбныя», замовы, напрыклад: «Як у лесе Божым поўна кустоў, так у маім кошыку будзе поўна грыбоў. Амін».

- Лічылася, што той, хто першым паглядзіць на лес раніцай на Раство, летам будзе мець найвялікшы поспех у збіранні грыбоў.
- Лічылася: калі спаць у дзень Дабравешчання — праспіш летнія і восеньскія грыбы.
- Старыя людзі раілі: збіраць грыбы лепей на маладзік, а «калі месяц убывае, сядзі ў хаце».
- Прыглядайся: калі ўдзень шмат мошак, значыць, і грыбоў у лесе будзе шмат.
- Калі на сцяне хаты вырасталі грыбы, гэта прадказвала багацце і дабрабыт у сям'і.
- Пад страхам смерці забаранялі збіраць грыбы цяжарным жанчынам і хадзіць у лес басанож.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.26	21.05	15.39
Віцебск —	5.10	21.00	15.50
Магілёў —	5.16	20.55	15.39
Гомель —	5.19	20.45	15.26
Гродна —	5.42	21.19	15.37
Брэст —	5.49	21.13	15.24

Месяц

Першая квадра 6 жніўня. Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Анісіма, Ануфрыя, Івана, Пятра, Сямёна.*

К. *Лідзіі, Аўгуста, Нікадзіма, Сцяпана.*

НАДВОР'Е на заўтра

3 жніўня

1926 год — на плошчы Пікадзілі (Лондан) устаноўлены першыя ў свеце святлафоры.

1492 год — Хрыстафор Калумб адплыў з горада Палас-дэ-ла-Франтэра на трох суднах — «Нінья», «Пінта» і «Санта Марыя» — у пошуках Індыі. Так пачалося першае падарожжа Калумба ў Новы Свет.

«Вельмі нямногія людзі, і пры тым самыя выдатныя, здольныя проста і шчыра сказаць: «не ведаю».

Дзмітрый Пісараў (1840—1868), рускі публіцыст і літаратурны крытык.

Усміхнемся!

Калі вы высокі, мускулісты, блакітнавокі бландзін — не прыходзьце на пляж. Дайце шанц іншым!

☺

— Чым адрозніваецца вясёлы байкер ад сумнага?

— У вясёлага байкера зубы ў мошках!

☺

Офісныя гісторыі.

Новы шэф выклікаў усіх да сябе з клавіятурамі.

У каго літары на клавіятуры сцерліся, тых пакінуў, а ў каго стрэлачкі сцерліся — звольніў...

☺

Двое сяброў.

— Ты выпадкова не ведаеш, хто збіраецца прадаваць машыну?

— Ведаю аднаго, праз тыдзень-другі ён будзе абавязкова прадаваць.

— Ты што, празорца?

— Не. Проста я надта добра ведаю сваю машыну, якую я прадаў яму пазаўчора.

☺

Як высветлілася, «Камасутра» першапачаткова была дапаможнікам па грэка-рымскай барацьбе, а потым хтосьці штосьці падмаляваў, і панеслася, закруцілася...

☺

Калі ўначы выйсці ў двор, легчы на зямлю і доўга глядзець на зорнае неба праз друшляк, то можна ўбачыць твар урача хуткай дапамогі.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 292 22 03.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 3692.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 жніўня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12